Захаваліся звесткі, што ў 1855 г. сяляне з в. Полаў былога Дзісненскага павета, якія лічыліся моцнымі чараўнікамі, хавалі ад духавенства нейкага ідала, вакол якога ў пэўныя дні ладзіліся скокі, пры гэтым апантана паўтараючы: *«Гаўры, гаўры — гам!»*[30]. Паводле паданняў, Гаўры — імя сабакі першапродка беларусаў Белаполя і яго бацькі князя Бая, які пасля смерці любімых сабак загадаў ушаноўваць іх і прызначыў для гэтага памінальныя дні[31].

Некалькі каменных і бронзавых ідалаў захоўваліся ў музеі Полацкага кадэцкага корпуса[32]. Бронзавы ідал у выглядзе жанчыны, якая стаіць на п'едэстале, знойдзены ў Камароўцы ў Мінску[33]. Невялікія ідалы з металу ў XIX ст. былі вядомы з Піншчыны і в. Багданава на Ашмяншчыне. Ідал з Багданава ўяўляў жанчыну ў вайсковым строі, а ідал з Піншчыны — мужчыну-ваяра і насіўся на шыі альбо на грудзі. Міфолагі XIX ст. беспадстаўна лічылі іх выявамі літоўскіх боствам: багіні цнатлівасці Праўрымы і бога вайны Каваса[34].

У 1887 г. у лесе блізу в. Пярэспа Ульянавіцкай воласці на Сенненшчыне адкапаны ідал у выглядзе чатырохграннага слупа з высечанай галавой наверсе, які быў потым усталяваны на мясцовых могілках[35]. Каменны стод у выглядзе слупа з высечаным наверсе тварам быў вядомы ў Ігуменскім павеце (цяперашні Чэрвеньскі р-н). У народзе ідал называўся «Цар Давыд»[36]. Прыкладна ў кіламетры ад яго ля в. Гудавічы на ўзгорку «Святая горка» знаходзілася паганскае свяцілішча. Між тым, экспедыцыя Цэнтра этнакасмалогіі «Kryŭja» ў гэтыя мясціны паказала, што мясцовае насельніцтва нічога не памятае пра гэты стод, але ў іх добра захавалася памяць пра культавы «Давыдаў камень». Застаецца нявырашанай праблема, гэта адзін і той жа аб'ект, ці розныя?[37]

Побач з в. Чаплі на Пружаншчыне знаходзіўся пагорак, які называўся «магільнік». Пагорак быў акруглы, дыяметр каля 85 м, а вышыня каля 1,5 м. На вяршыні пагорка стаяў вертыкальны камень са слядамі апрацоўкі ў выглядзе чалавечага корпуса[38].

Паводле падання, на гарадзішчы блізу в. Войстам стаяў ідал і каля яго клалі ахвяры: *«Koło Wojstomia znajduje się gora formy prawidłowej (ucięty stożek), na ktorej, podług podania miejscowego, był kiedyś, za czasow Litwy pogańskiej bożek, ktoremu składano ofiary i wskntek tego ziemia tam i teraz czarna»*[39].

[27] Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье. Санкт-Петербург—Москва, 1882. С. 243–244.

[28] Там же. С. 244.

[29] Сементовский А. М. Белорусские древности. Санкт-Петербург, 1890. С. 74.

[30] Живописная Россия: Отечество наше... С. 42.

[31] Легенды і паданні. Мінск, 1983. С. 78–79, 236.

[32] Викентьев В. Полоцкий кадетский корпус. Полоцк, 1910. С. 27.

[33] Указатель выставки пры третьем Археологическом съезде: коллекция бронзовых идолов. Киев, 1874. С. 67.

[34] Там же. С. 67.

[35] Аникиевич К. Т. Сенненский уезд Могилевской губернии. Могилёв, 1907. С. 13.

[36] Татур Г. Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и её археологическое значение. Минск, 1892. С. 34.

[37] Скварчэўскі Зм. У пошуках «Цара Давыда» // http://kryuja.org/dziejnasc/ekspiedycyji/skvarczeuski_u_poszukach_cara_davyda.html

[38] Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии. Вильна, 1895. С. 83.

[39] Rouba N. Przewodnik po Litwie i Białejrusi. Wilno, 1908. S. 205.

[40] Даленга-Хадакоўскі З. Выбранае. Мінск, 2007. С. 289.

[41] Мялешка М. Камень у вераньнях і паданьнях беларуса. Менск, 1929. С. 32. Запісана з апавядання М. Рудака, жыхара г. Дзісна.

[42] Ластоўскі В. Ю. Выбраныя творы. Мінск, 1997. С. 52.

Вядомы даследчык XIX ст. Зарыян Даленга-Хадакоўскі ў лісце да Караля Чарноцкага ад 9 кастрычніка 1822 г. пісаў, што на гары ля в. Мыслабожа ёсць камень, падобны да ідала[40].

На выспе возера Богіна на Браслаўшчыне стаяла каменная антрапаморфная фігура з шэрага граніту памерам з палову чалавечага росту са складзенымі на грудзях рукамі і адбітай галавой. У народзе фігуру называлі «Стод»[41]. В. Ластоўскі перадае паданне, паводле якога на гэтай выспе трымаўся высокі капец, у сярэдзіне якога была старой веры бажніца з адзіным аконцам, праз якое прамень сонца ўнутр трапляў толькі роўна апоўдні[42]. Пры абследаванні выспы на в. Богіна археолагам Э. М. Зайкоўскім было выяўлена гарадзішча жалезнага веку, заселенае ў мінулым балтамі[43]. Варта зацеміць, што і цяпер тамтэйшае насельніцтва захоўвае памяць пра ідалаў на выспе. У 1983 г. у час археалагічнага абследавання берагоў возера ад адной бабулі даследчыкам удалося пачуць, што яшчэ на яе памяці на выспе стаялі «літоўскія богі»[44].

Пэўным перажыткам шанавання стодаў з'яўляецца традыцыя ўсталявання вялікіх драўляных слупоў з выразанымі выявамі хрысціянскіх святых. Напрыклад, такія слупы з выявамі Багародзіцы, Хрыста і Яна Прадцечы можна было пабачыць пры ўездзе ў Нясвіж[45]. У в. Вялікае Стахава Барысаўскага р-на на могілках з сярэднявечнымі курганамі раней была капліца, перад уваходам якой стаялі драўляныя «балваны»: *«Небальшая такая капліца была... І такія я баялася, малая была, ды баялася, там былі такія дзерэвянныя называліся балваны — людзі такія самые настаяшчые, сделаны з дзерава... Не ў капліцы, а сразу как пры ўхода. Пры ўхода стаялі. Ну я очэнь баялася, такія абыкнавеныя з дзерава сделаны былі... Ізабражон быў мужчына і жанчына...»*[46].

На Палессі дагэтуль захоўваецца традыцыя шанавання драўляных антрапаморфных крыжоў, якія называюць «хвігуры». Адрозніваюць мужчынскія і жаночыя выявы. Мужчынскія выявы маюць імя Герман, ён быў абвешаны ручнікамі і вырабляўся дзеля выклікання дажджу[47]. Жаночыя «хвігуры» уяўлялі драўляныя крыжы, абвешаныя палатном і ручнікамі так, што паўтараліся абрысы жанчыны і адрозніваліся дэталі жаночага строя. Таксама звяртае на сябе ўвагу і культ «каменнай дзевачкі» — шанаваных каменных крыжоў, якія упрыгожваюць палатном, фартушкамі, пацеркамі[48]. Усё гэта даследчыкі лічаць рэшткамі традыцыі шанавання паганскіх ідалаў.

Народныя паданні захавалі звесткі пра пакланенне стодам. Згадваецца пра маленне звычайным калодам, а таксама выразанаму з калоды богу: *«Адзін раз наш сусед Цімох узяў бальшое палена і выразаў бога. Патом абгарадзіў адно месца, каб туды не хадзіў скот, і паставіў свайго бога. Сам хадзіў маліцца да гэтага бога штораніцу...»*[49]. З апісанымі ў паданнях пакланеннямі калодзе добра стасуецца інфармацыя аб ушанаванні ў 1920-х гадах у Мір-Гары на Бабруйшчыне нейкага «Божага пянька», які знаходзіўся ў царкве і да якога хадзілі маліцца 1 кастрычніка[50]. Шанаванне пнёў культавых дрэў таксама добра вядомае на тэрыторыі Беларусі.

ЗНАХОДКІ ПАГАНСКІХ ІДАЛАЎ У XX ст.

Вялікая колькасць паганскіх ідалаў не захавалася да нашых дзён, асабліва гэта датычыцца драўляных стодаў. Аднак сляды іх знаходзяць археолагі падчас раскопак. Так, сляды ад драўлянага слупа-ідала выяўлены ў цэнтры пляцоўкі Ходасавіцкага капішча. Гэта было паглыбленне дыяметрам 1 м і глыбінёй 0,15 м[51]. Драўляныя слупы-ідалы знаходзіліся на меркаваным Тураўскім капішчы[52]. Яма для ідала таксама была выяўлена падчас раскопак Верхаўлянскага свяцілішча ў Бераставіцкім р-не[53]. На гарадзішчы мілаградскай археалагічнай культуры Гарошкава ў адной з культавых пабудоў у цэнтры была выяўлена невялікія колцавая канаўка, якая магла з'яўляцца асновай для ахвярніка альбо стаяўшага тут стода[54].

Да найбольш старажытных знаходак культавых скульптур даследчыкі адносяць невялікія выявы, знойдзеныя на паселішчы Асавец-2 у Бешанковіцкім р-не, якія адносяцца да позняга неаліту/ранняга бронзавага веку[55]. Гэтыя фігуркі пакінула насельніцтва паўночнабеларускай археалагічнай культуры. Адна статуэтка была выразана з цвёрдага

[43] Зайкоўскі Э. Першабытныя помнікі Паўночнай Беларусі. Мінск, 1990. С. 38. Бубенько Т. С., Зайковский Э. М., Поздняков В. С. Исследования Белорусской экспедиции // Археологические открытия 1986. Москва, 1988. С. 356.

[44] Дучыц Л., Ракіцкі В. Ідалы — багі, істуканы, куміры, ёлупы... // http://www. svaboda. org/content/ transcript/776543. html

[45] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Минск, 2004. С. 65.

[46] Зап. Скварчэўскі Дз. ад Мядзель Г. А. 1914 г. н. у в. Вялікае Стахава Барысаўскага р-на ў 2008 г.

[47] Прохараў А. Герман // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік. С. 119.

[48] Лобачевская О. А. Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі. Мінск, 2008. С. 94–100, 103–106.

[49] Легенды і паданні. Мінск, 1983. С. 112. № 131. Таксама гл. с. 111, 113. № 129, 130, 133.

[50] Дучыц Л. Некаторыя дадзеныя пра культавыя дрэвы на Беларусі // Kryŭja: Crivica. Baltica. Indogermanica. 1994. № 1. С. 74.

[51] Дучыц Л. У. Макушнікаў А. А. Ходасавіцкае свяцілішча // Энцыклапедыя археалогіі і нумізматыкі Беларусі. Мінск, 1993. С. 634.

[52] Лысенко П. Ф. Языческое святилище древнего Турова // Славяне и их соседи: Археология, нумизматика, этнология. Минск, 1998. С. 51–57.

[53] Зайкоўскі Э. Даследаванне свяцілішча каля в. Верхаўляны // Матэрыялы па археалогіі Беларусі № 5. Мінск, 2002. С. 33.

[54] Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. Москва, 1967. С. 150.

[55] Дучыц Л. У., Зайкоўскі Э. М. Ідалы. С. 380.

лісцёвага дрэва і мае цёмна-шэры колер, што выклікана, магчыма, нацiраннем адпаведным фарбавальнікам. Выява ўяўляе галаву мужчыны з выразнымі і рэзка акрэсленымі рысамі твару. Ніжняя частка знаходкі абламаная. Выглядае, што галоўка пераходзіла ў стрыжань-жазло. Даўжыня захаванай на сёння часткі 9,5 см. Фігурка захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ў Мінску. Другая фігурка ўяўляе адламаную галоўку статуэткі з рогу даўжынёй 4,2 см. Гэта зноў жа вобраз мужчыны з вострай барадой, прамым носам, высокім ілбом і глыбокімі высвідраванымі вачніцамі. Вусны тонкія, сфармаваныя папярэчнай нарэзкай. На шыі каля самой асновы галавы прасвідравана адтуліна, выява таксама да нечага падвешвалася. Параўнанне статуэтак паказвае іх індывідуальнасць. Выконваючы пэўнае рытуальнае прызначэнне, яны ў той жа час перадаюць, несумненна, еўрапеоідныя вобразы жыхароў наваколля колішняга Крывінскага возера[56].

Захаваліся звесткі аб каменных ідалах з трыма тварамі з тэрыторыі Беларусі. Адзін з іх быў выяўлены ў лесе на беразе ракі Лясной ля в. Млыны Камянецкага р-на. У архівах Польшчы захаваўся яго схематычны малюнак і яго апісанне. Памеры ідала: 1,65×0,5×0,35 м[57]. Паводле малюнка, ідал антрапаморфны, мае добра акрэсленыя абрысы цела і галавы, але шыя адсутнічае. Рукі апушчаны ўздоўж цела, далоні складзены на поясе. Унізе стод мае пашырэнне, верагодна, каб надаць скульптуры ўстойлівасць. Варта адзначыць, што прыкладна ў раёне знаходкі ідала знаходзіўся на невялікім пясчаным пагорку вялікі курганны могільнік. Адзначаюць, што побач з курганамі было шмат камянёў, на адным з якіх была таксама схематычная выява чалавека[58]. Магчыма, што ідал таксама знаходзіўся на тэрыторыі курганнага могільніка. Рэшткі другога каменнага ідала з трыма тварамі былі знойдзены ля маёнтка Багуслаўцы ў Пружанскім р-не. Малюнак стода паступіў у музей 3 кастрычніка 1901 г. Захавалася частка галавы з трыма парамі вачэй. Памеры знаходкі: даўжыня 8 см, шырыня 6 см, вышыня 7,5 см, акружнасць 23,5 см. Знайшоў фрагмент ідала Багуслаў Крашэўскі[59]. Між тым, варта заўважыць, што малюнкі з выявамі гэтых стодаў не могуць пацвердзіць іх трохгаловасць. Малюнкі зроблены не якасна і толькі з аднаго боку.

У 1925 г. каля Ваўкавыскага гарадзішча на глыбіні 1.5 м знойдзены ідал з акамянелага пясчаніку памерамі 95×60×29 см[60]. Стод мае добра высечаную круглую галаву, бачны нос і вочы. Шыя ледзь акрэсленая, тулава пашырана, прамавугольнай формы накшталт пастаменту, але ўнізе бачны невялікія ножкі. На старых фотаздымках бачна, як на грудзях прасочваюцца лініі — магчыма, на ім быў высечаны нейкі крыжападобны знак. Пазней стод патрапіў у Гродненскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (былы музей атэізму).

У 1927 г. быў выяўлены крыжападобны каменны ідал блізу в. Стайкі Аршанскага р-на памерамі 70,4×39,6 см, вага — 98,4 кг[61]. Каменных ідалаў знаходзілі таксама і ў курганах на Аршаншчыне: блізу в. Плеханаў, в. Журавічы, адкуль стод быў перавезены ў сад саўгаса Смаляны[62]. Таксама на Аршаншчыне каменны стод быў выяўлены ў XIX ст. блізу в. Тур'ева, а потым быў перавезены ў сад маёнтка Смаляны[63]. Як адзначае Д. Васілеўскі, вялікай прыгажосці ў іх не назіраецца[64].

У 1934 г. пры пракладцы новай вуліцы на ўскрайку Слоніма на глыбіні 0,5 м. быў знойдзены ідал, зроблены з валуна чырвона-шэрага колеру ў выглядзе мужчынскага торса без рук. Фігура рэльефная з усіх бакоў. Твар даволі плоскі з завостранай бародкай, але без вусаў, і шырокім носам з гарбінкай, добра абазначана шыя, выразна пракрэслены вочы і рот. Ніз скульптуры клінападобны, відаць, таму, што яе ўстаўлялі ў спецыяльны пастамент. Вышыня стода 46 см, шырыня 22 см, таўшчыня 15 см. Захоўваецца ідал у Слонімскім краязнаўчым музеі[65]. Слонімскі ідал мае аналагі з паганскімі скульптурамі балтаў, напрыклад, з ідалам з Елічкі (Польшча)[66].

У 1955 г. у в. Астрамечава Брэсцкага раёна мясцовы жыхар А. Мацвеюк блізу будынка праўлення калгаса «Память Ильича» на глыбіні прыкладна 60 см знайшоў каменную галаву стода[67]. Галава па форме нагадвае грыб: выразна акрэсленая шапка ці лоб, выступаючы прамы шырокі нос, глыбока пасаджаныя вочы. Месца знаходкі галавы ідала мае назву «Дубовы Грудок»[68], што ўскосна сведчыць пра наяўнасць у мінулым шанаванага

[56] Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Пад. рэд. М. М. Чарняўскага. Мінск, 1997. С. 325–326.

[57] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С. 80. Рис. 56:8.

[58] Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. Москва, 1961. С. 18.

[59] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С. 75. Рис. 48:2.

[60] Jodkowski Jósef. Grodzisko Wołkowyskie. Grodno, 1925. S. 22.

[61] Васілеўскі Д. Помнікі старасветчыны на Аршаншчыне // Наш край. 1927. № 2. С. 43.

[62] Тамсама. С. 43.

[63] Васілеўскі Д. З матэрыялаў да археалагічнай карты Аршанскай акругі // Наш край. 1926. № 6—7. С. 67.

[64] Васілеўскі Д. Помнікі старасветчыны на Аршаншчыне // Наш край. 1927. № 2. С. 43.

[65] Дучыц Л. Слонімскі ідал // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Мінск, 2001. С. 339. Дучыц Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1990. № 6. С. 88. Стаброўскі І. Каменная галава, знойдзеная ў Слоніме // Беларусь. 1946. № 4. С. 61–62.

[66] Забашта Р. Язичницька монументальна скульптура Білорусії (Контекстуальні паралелі й зближення) // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у I тыс. н. э. Мінск, 1996. С. 34.

[67] Свято-Михайловская церковь / Остромечево и «остромычивцы» // http://astramechava. hmarka. net/cerkov. html

[68] Дучыц Л. У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў. Мінск, 1993. С. 23.

ўрочышча ў выглядзе пагорка з дубовым гаем, дзе, магчыма, раней і стаяў ідал. Такое размяшчэнне цалкам адпавядае прыведзеным намі летапісным звесткам.

Улетку 1963 г. быў знойдзены самы знакаміты і загадкавы ідал на тэрыторыі Беларусі — так званы Шклоўскі ідал. Яго знайшлі хлопчыкі з вёскі Стары Шклоў у пясчаным яры на правым беразе ракі Серабранкі ва ўрочышчы «Зязюлін роў». Ідал быў выкапаны дарослымі і перавезены ў Мінск археолагам Л. Д. Побалем. Пры транспартыроўцы стода ў кузаве грузавіка, скульптура атрымала пашкоджанні: моцна пацёрлася, быў крыху счасаны твар[69]. Калі мясцовыя жыхары адкапалі ідала, то далі яму назву «ёлуп»[70]. Ідал уяўляе з сябе пагрудную выяву мужчыны. Ніжняя частка апрацавана ў выглядзе пастамента. Фігура абчасана, мае выгляд слупа. Ідал высечаны з пясчаніку, вышыня 1,2 м, вага каля 250 кг[71]. У навуковы зварот быў уведзены Г. В. Штыхавым[72]. Цяпер захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі ў Мінску. Стод мае акрэслены твар: выразна прасочваюцца вочы, прычым падобныя на заплюшчаныя, рот і вусы. Між тым, Шклоўскі ідал мае дакладныя фалічныя абрысы. Дадзеная знаходка выклікала нямала спрэчак сярод гісторыкаў, археолагаў, мастацтвазнаўцаў. Агляд асноўных тэорый добра быў адлюстраваны ў дакладзе Р. Забашты[73]. Праблемы з атрыбуцыяй ідала, адпаведна і розныя погляды навукоўцаў, выкліканы пазакомплекснасцю знаходкі, а таксама адсутнасцю прыдатных для атрыбуцыі прыкмет непасрэдна ў ідала. Галоўныя пытанні: час стварэння і этнакультурная прыналежнасць насельніцтва, якое пакланялася яму. «Класічная» версія часу стварэння ідала — X ст. — належыць Г. В. Штыхаву. Яна зараз з'яўляецца прынятай у энцыклапедычных выданнях і падручніках. Аднак існуюць і іншыя версіі: VI—X стст., VI—VII стст., VI—XIII стст. Аднак усе яны з'яўляюцца гіпатэтычнымі і не маюць надзейнага абгрунтавання. Цікавую версію можна адшукаць у Р. Забашты. На падставе датыроўкі археалгічных помнікаў у ваколіцах знаходкі — селішча XII—XVII стст., курганнага могільніка таго ж часу, гарадзішча і селішча ля яго X—XVI ст., а таксама датыроўкі падобных паганскіх ідалаў з Туму (Польшча) XII ст. і Рыгі (Латвіі) XII—XIII стст., была зроблена выснова, што Шклоўскі ідал адносіцца да перыяду XII—XIII стст[74]. Таксама вялікія спрэчкі выклікае пытанне: балты ці славяне пакінулі гэты стод? На гэтае пытанне таксама пакуль што цяжка даць адназначны адказ. Р. Забашта схіляецца на карысць славянскага насельніцтва[75], але разам з тым, адзначае падабенства з балцкімі ідаламі з Рыгі (Латвія), верагоднымі слупападобнымі ідаламі са свяцілішч Тушамля, Гарадок, Прудкі (Смаленшчына)[76]. Пытанні застаюцца адкрытымі. Таксама немагчыма суаднесці ідал з пэўным боствам. Тут мы можам абапірацца толькі на ўскосныя дадзеныя наконт функцый таго боства. Заплюшчаныя вочы стода сведчаць аб прыналежнасці боства да хтанічнага свету,

Слонімскі стод

[69] Корбут В. «Кумир» с берегов Серебрянки // http://www. sb. by/post/56382

[70] Дучыц Л., Ракіцкі В. Ідалы — багі, істуканы, куміры, ёлупы… // http://www. svaboda. org/content/transcript/776543. html

[71] Дучыц Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі. С. 88.

[72] Штыхов Г. В. Интересная находка // Искусство. 1964. № 4.

[73] Забашта Р. До питання атрибуциї Шкловського ідола // Гісторыя Беларусі: жалезны і век і сярэднявечча. Мінск, 1977. С. 21–24.

[74] Тамсама. С. 22–23.

[75] Тамсама. С. 24.

[76] Забашта Р. Язичницька монументальна скульптура Білорусії (Контекстуальні паралелі й зближення). С. 34.

Каменны стод
з в. Буцькі
Пружанскага р-на

свету памерлых продкаў. Фалічная форма можа сведчыць пра функцыі плоднасці і ўрадлівасці.

У 1970-х гадаў у в. Варонічы Полацкага р-на на мысе, у самай паўднёвай аканечнасці возера Варанец, быў знойдзены маленькі каменны ідал, які, нажаль, быў згублены[77].

У энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў» быў апублікаваны здымак выпадкова знойдзенага таксама на Полачынне невялікага каменнага ідала[78].

Прафесар Э. Ляўкоў згадвае пра знаходку каменнага стода на беразе в. Павулле ва ўрочышчы Рэкшаты ля в. Цётча Ушацкага р-на: *«Другі камень, калі лічыць*

[77] Клімаў М. В. Сярэднявечны культавы помнік Заскаркі ў ваколіцы г. Полацка // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 17. Мінск, 2002. С. 223.

[78] Міфалогія беларусаў: Энцыклапедычны слоўнік. Мінск, 2011. С. 384.

з паўночна-заходняга краю, нават здалёк нагадваў ляжачага чалавека. Гэта быў стод, высечаны з цемнаколернага базальту. У яго выразна вылучалася масіўнае тулава, адна рука і ўцягнутая ў плечы галава. Вышыня фігуры складала 2 м 7 см, таўшчыня і шырыня па 0,7 м. Другая рука была адбітая. Некалі стод стаяў вертыкальна, а пасля быў павалены. Тут жа ляжала некалькі невялікіх камянёў, якія хутчэй за ўсё расклiноўвалі для ўстойлівасці падмурак стода»[79]. Побач захаваўся каменны ахвярнік са штучным паглыбленнем і камень са слядамі ўздзеяння агню, праз што Э. Ляўкоў зрабіў выснову аб існаванні тут свяцілішча.

У Гродненскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі захоўваецца ідал, які быў знойдзены на Лепельшчыне. Моцна стылізаваная выява выканана з вапнавага каменя. Галава няправільнай формы, уверсе пашырана. Тулава непрапарцыянальнае, расплясканае з бакоў. Памеры ідала 47×22,5×17,5 см[80].

Каменны крыжападобны ідал з в. Буцькі Пружанскага р-на адметны тым, што на грудзях высечана выява слупа з паўсферай наверсе. Гэты сімвал шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці на поўначы і паўночным усходзе Міншчыны і на Віцебшчыне. Ён пераважна выяўлены на старадаўніх надмагіллях, але сустракаецца і на некаторых іншых помніках. Гэты знак паганскі па паходжанні і абазначае вось сусвету і нябесную сферу, забяспечвае сувязь паміж гэтым светам і замагільным, утрымлівае ідэю падарожжа душы ў царства памерлых[81]. Характэрна, што ідал быў знойдзены ля курганоў на тэрыторыі старых вясковых могілак. Курганны могільнік, ля якога быў стод, датуецца XI ст. Магчыма, ідал таксама адносіцца да гэтага часу. Стод высечаны са светла-шэрага валуна, вышыня 1,04 м, шырыня 40—50 см, таўшчыня 30 см. Левая рука знаходзіцца ніжэй за правую, што надае фігуры асіметрычнасць. Фігура нязначна пашыраецца ўнізе. Ідал мае круглую галаву з акрэсленай лініяй твару і падбароддзем, прасочваюцца сляды вачэй, носа, рота[82]. Магчыма, што твар спрабавалі счасаць. Цяпер стод знаходзіцца ў Пружанскім краязнаўчым музеі.

Фрагмент маленькага каменнага стода быў выяўлены падчас археалагічных раскопак на гарадзішчы Пруднікі Міёрскага р-на. Ідальчык у выглядзе галоўкі чалавека, якая зроблена асіметрычна. Левае вока акрэслена поўнасцю, правае толькі пазначана, нос прамы, кончык яго прыплюснуты, рот ледзь прыкметны, падбароддзе выражана слаба[83]. Паводле стратыграфіі, знаходка належыць да VI—VII стст.; у гэты час на гарадзішчы пражывалі балцкія плямёны латгалаў ці селаў[84].

Як ужо згадвалася, на тэрыторыі Беларусі знаходзілі паганскія скульптурныя выявы з розных металаў, але яны не захаваліся да нашых дзён. Аднак у 2010 (ці 2011) г. у ваколіцах в. Стайкі Валожынскага р-на была знойдзена невялікая срэбная скульптура (2,4 см вышынёй)[85]. Выяўлены прысеўшы мужчына, рукі сагнутыя на жываце, правая вышэй за левую; галава лысая, бачны вушы, твар шырокі, вочы вялікія, нос прамы і доўгі. Статуэтка нагадвае некаторыя скандынаўскія знаходкі. Акрамя таго, разам з ёй былі знойдзены фрагменты дырхемаў, наканечнік дзіды і іншыя раннесярэдневечныя рэчы. Таксама адносна недалёка ад месца знаходкі, у суседняй в. Пагарэльшчына, быў выяўлены вялікі скарб дырхемаў, на некаторых манетах якога ёсць графіці ў выглядзе вайсковых сцягоў, княскага двузубца і рунападобнага знака[86]. Усё гэта можа сведчыць, што стайкаўская знаходка можа мець дачыненне да дружыннага асяроддзя і быць скандынаўскага паходжання.

Вялікую цікавасць выклікае і шэраг каменных жаночых стодаў, якія па форме нагадваюць крыжы. Самым вядомым сярод іх ёсць каменны ідал, які знаходзіўся паміж вв. Даўгінава і Жары Вілейскага р-на. Пасля ён быў перавезены ў Мінскі музей валуноў, а цяпер выстаўлены ў будынку Інстытута геалогіі Нацыянальнай акадэміі навук. Ідал крыжападобнай формы ўяўляе стылізаваную выяву жанчыны. Ён высечаны з шэрага гнейсавага валуна, злёгку кранутага выветрываннем. Вышыня яго 173 см, размах 107 см. Для такіх памераў ён занадта тонкі, каля 20—25 см. Верхні канец сваёй круглявасцю нагадвае галаву, папярочнікі падобныя на растаўленыя рукі. На іх узроўні ў сярэдзіне знаходзяцца два невялічкія выступы — грудзі. Яны

[79] Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мінск, 1992. С. 127–128.

[80] Дучыц Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі. С. 89.

[81] Прохараў А. Каменны шлях на нябёсы. Міфа-рытуальная семантыка пахавальнага знака з паўночнай Беларусі // Druvis. Almanach Centru etnakasmalogiji «Kryŭja». 2011. № 3. С. 87.

[82] Каробушкіна Т. Н. Буцькі // Археалогія Беларусі. У 2 т. Т. 1. Мінск, 2009. С. 134.

[83] Мітрафанаў А. Р., Шадыра В.І. Пруднікі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва. Т. 4. Мінск, 1987. С. 388.

[84] Шадыро В. И. Городище и селище Прудники // Lietuvos archeologija. T. 21. Vilnius, 2001. P. 269, 272.

[85] Фотаздымак знаходкі выстаўлены на форуме «Домонгол»: http://domongol.su/viewtopic.php?f=66&t=6284&p=52454&hilit=%D0%A1%D1%82%D0%B0%D0%B9%D0%BA%D0%B8#p52454

[86] Добровольский И. Г., Дубов И. В., Кузьменко Ю. К. Граффити на восточных монетах. Ленинград, 1991. С. 48, 64.

трохі абабітыя з такім разлікам, каб замяніць іх невялікімі крыжовымі знакамі. Трохі ніжэй, на ўзроўні жывата, знаходзіцца яшчэ адна пукатая фігура — дзіця. Яго форма паўтарае абрысы ўсёй скульптуры. Па ўсіх прыкметах гэта не крыж, а стод жаночага боства. На «спіне» ідала высечаны чатыры чатырохканцовыя крыжы з перакладзінамі на канцах. Латышскі гісторык і этнограф Гунціс Эніньш склаў спецыяльную табліцу сімвалаў, згодна з якой гэты сімвал мае ў народзе назвы «крыж крыжоў», «агнявы крыж», «крыж Мары». У Латгаліі Мару ўшаноўвалі як апякунку шлюбаў, вяселляў[87]. На гэтай падставе Э. Ляўкоў меркаваў, што гэты стод быў прысвечаны Мары — аднаму з найстаражытных боставаў індаеўрапейцаў — багіні, якая апякала замагільны свет, спрыяла працягу роду, жанчыне[88]. У беларускай фальклорнай традыцыі Мара дэградавала да персанажа ніжэйшай міфалогіі, была звязана з хтанічным светам і смерцю; ёй была характэрна юрлівасць, магла нарадзіць дзіця ад сувязі з смяротным мужчынам[89]. Археолагі Я. Г. Звяруга і М. М. Чарняўскі мяркуюць, што ідал ёсць выявай Лады — багіні шлюбу і дабрабыту, альбо Мокашы — багіні ўрадлівасці[90]. Як і ў выпадку са Шклоўскім ідалам, нельга дакладна суаднесці стод з пэўным боствам, вызначыць час яго стварэння і г. д. Падаецца смелым атаесамленне стода з-пад Даўгінава з Ладай ці Мокашшу, бо для гэтага няма дастатковых доказаў. Пагатоў, няма надзейных сведчанняў пра існаванне іх культаў на тэрыторыі Беларусі. Меркаванне Э. Ляўкова выглядае больш аргументаваным, прынамсі падмацаваным жывой фальклорнай традыцыяй. У любым разе, даўгінаўскі стод ёсць сведчаннем ушанавання багіні-маці. Сляды былых жаночых культаў, у тым ліку і ўшанаванне жаночых фігур-боставаў, захаваліся да нашых дзён[91].

Аналогіі з даўгінаўскім ідалам мае антрапаморфная каменная выява са старых могілак у Кобрыне. Стод мае выразна акрэсленую шыю, галаву з вушамі, твар. Рукі адсутнічаюць, магчыма, адбіты. На тулаве ўнізе рэльефная выява крыжа-дзіця, падобная на даўгінаўскую[92].

Не так даўно краязнаўцам на закінутых могілках ля в. Буйнавічы Лельчыцкага раёна быў выяўлены каменны стод падобнага тыпу. Фігура таксама апрацавана ў форме крыжа, але захавалася некранутай верхняя частка, якая мае акруглую форму. На грудзі высечана рэльефная выява дзіцяці (як і на Даўгінаўскім стодзе), пасярод галавы якога, падобна, высечаны маленькі крыжык.

З Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці паходзяць адразу два каменныя жаночыя ідалы. Абодва захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі. Стод з в. Грабаўцы мае крыжападобную форму памерамі 79×50×47 см, высечаны з камяня чырвона-попельнага колеру[93]. Добра акрэслены твар-авал, галаўны ўбор накшталт хусткі, пад падбароддзем высечана крыжападобная фігура. Ідал з в. Залуззе крыжападобны, памерамі 87×30×53 см, высечаны з валуна чырвона-шэрага колеру. Ён мае прадаўгаваты твар, выступае нос, бачныя вочы і рот. Амаль ад падбароддзя ідуць дзве лініі, якія абазначаюць рукі. На грудзях прашкрабаны крыж[94]. Ёсць меркаванне, што паглыбленыя дыяганальныя лініі акрэсліваюць канцы хусткі[95].

Як бачна, ўсе жаночыя стоды, што захаваліся, маюць на тулаве стылізаваную крыжападобную фігуру, якая ў некаторых выпадках мае выразную форму дзіця. Падобная з'ява характэрна і для каменнага жаночага ідала з берага возера Астроўна ў Себежскім р-не (цяпер Расія). На жываце жаночага стода высечаны крыж у коле, на вяршыні якога таксама крыж.

КАМЕННЫЯ БАБЫ

На тэрыторыі Беларусі стоды ў народзе таксама называлі «бабамі», напрыклад, каменны стод, які стаяў на кургане блізу в. Грыцкавічы Свіслацкага р-на, зваўся «Грыцэвіцкая Баба»[96]. Вельмі часта такі назоў адносіўся да старых каменных крыжоў. У Талочынскім р-не на беразе возера Глухога блізу в. Галошава стаіць каменны крыж, які называюць «Баба», «Кацярынаў крыж», «Крыж-Баба». Ля крыжа маліліся, прыносілі ў якасці ахвяраванняў грошы і тканіну[97].

[87] Зайкоўскі Э. Мара // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік. С. 304.

[88] Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. С. 96–99.

[89] Зайкоўскі Э. Мара. С. 303.

[90] Чарняўскі М. М., Звяруга Я. Г. Каменная выява з-пад Даўгінава // Помнікі мастацкай культуры беларусаў: новыя даследаванні. Мінск, 1989. С. 168.

[91] Лобачевская О. А. Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы. С. 107.

[92] Кацар М. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка. Мінск, 1996. С. 45. мал. 119.

[93] Дучыц Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі. С. 89.

[94] Тамсама. С. 88.

[95] Лобачевская О. А. Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы. С. 101.

[96] Валодзіна Т., Дучыц Л. Баба // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік. С. 33.

[97] Лобачевская О. А. Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы. С. 102; Валодзіна Т., Дучыц Л. Баба. С. 33.

Каменны крыж-баба
на могілках в. Ліпляны
Лельчыцкага р-на.
Фота Вольгі Лабачэўскай

Аднак пад «каменнымі бабамі» навукоўцы таксама разумеюць каменныя антрапаморфныя выявы, якія пакінула пасля сябе качавое насельніцтва Прычарнамор'я і іншых паўднёвых рэгіёнаў. Менавіта такія помнікі захаваліся і на тэрыторыі

Беларусі, але іх з'яўленне звязана не з перамяшчэннем качавога насельніцтва, а з дзейнасцю памешчыкаў у XIX — пач. XX стст., якія ўпрыгожвалі каменнымі бабамі паркі пры сваіх палацах, дзеля чаго скульптуры прывозілі з паўднёвых рэгіёнаў Расійскай Імперыі. Такія каменныя бабы вядомы з Дабраўлян на Смаргоншчыне, Гомеля (парк пры палацы Паскевічаў), маёнтка Крынкі на Віцебшчыне (у 1920–21 гг. дастаўлена ў Віцебскі абласны краязнаўчы музей). Некалькі каменных баб (з мястэчка Любонічы з Бабруйшчыны, Дзядзілава) захоўвалася ў 1920-х гг. у Мінску ў Беларускім дзяржаўным музеі[98]. Гэтыя каменныя бабы не могуць разглядацца ў якасці прыкладаў тутэйшых дахрысціянскіх рэлігійных культаў, помнікаў мастацтва і культуры.

У навуковай літаратуры XIX — пач. XX стст. пад «каменнымі бабамі» таксама маглі разумецца і тутэйшыя стоды, але адсутнасць падрабязных апісанняў не дазваляе зрабіць канчатковыя высновы. Паводле звестак Ф. Пакроўскага, ля в. Юхнавічы на Слонімшчыне быў пагорак, які народ называў татарскімі ці паганскімі могілкамі. Пагорак раней быў аточаны ровам, верхняя пляцоўка была абсалютна роўная, цалкам пакрытая камянямі, сярод якіх былі паваленыя і ўсталяваныя каменныя бабы. Аднак падрабязнага іх апісання не дае[99].

На Бабруйшчыне, недалёка ад Дняпра, па дарозе з Рэчыцы ў Бабруйск стаяла каменная баба, якая мела чатырохкантовую форму[100]. А. Кіркор згадвае каменную бабу на полі ў Мінскай губерні[101]. Натуральна, што падобныя апісанні не дазваляюць лакалізаваць і атрыбутаваць стоды. Шэраг іншых тутэйшых каменных стодаў, пра якія мы ўжо згадвалі, у ранейшай навуковай літаратуры таксама вядомы як «каменныя бабы».

ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ

Галоўнай праблемай, якая паўстае падчас вывучэння паганскіх стодаў на тэрыторыі Беларусі, ёсць немагчымасць дакладнай атрыбуцыі помнікаў. Гэта выклікана перадусім пазакомплекснасцю знаходак і ранейшымі перамяшчэннямі ідалаў. Вялікія перашкоды таксама ставарае недастатковае апісанне навукоўцамі XIX — пач. XX стст. знешняга выгляду стодаў, іх месцазнаходжання, часам ігнараванне даследавання фальклорнай традыцыі, звязанай з ідаламі. Усё гэта не дазваляе вызначыць час стварэння і ўшанавання, суаднесці стоды з рэлігійнай традыцыяй пэўнага насельніцтва: вызначыць, якому боству яны належылі і якое насельніцтва іх ушаноўвала. Як адзначае Р. Забашта, паганская скульптура Беларусі адносіцца да прыбалтыйскага гісторыка-культурнага асяроддзя IX/X—XII/XIII стст[102]. Такая датыроўка выклікае пэўныя пытанні, але калі яе прыняць, то атрымліваецца, што шэраг стодаў былі створаны ўжо ў часы хрысціянізацыі. Гэты факт з'яўляецца важным у разуменні гэтага працэсу на землях будучай Беларусі. Між тым, варта адзначыць, што многія стоды ўшаноўваліся на працягу некалькіх стагоддзяў. Напрыклад, такое адбылося з ужо згаданым ідалам з в. Пярэспа на Сенненшчыне, які быў у 1887 г. адкапаны ў лесе, а потым быў усталяваны на мясцовых могілках[103]. Гэта сведчыць і пра тое, што змяняліся функцыі стодаў. У такім выпадку яны ўшаноўваліся розным насельніцтвам, адбывалася напластаванне этнакультурных традыцый розных часоў, а таксама ўшанаванне паганскіх ідалаў прыстасоўвалася да хрысціянскіх вераванняў. Вельмі важным падаецца тое, што наноў знойдзеныя сялянамі паганскія стоды вярталіся ў культавае жыццё вяскоўцаў. Так, прыкладам, усталяваныя на могілках стоды ўдзельнічалі ў пахавальных і памінальных культах. Гэта сведчыць на карысць працяглага існавання традыцыі ўшанавання ідалаў на тэрыторыі Беларусі, якая адлюстравалася не толькі ў легендах і паданнях, але і здолела адрадзіцца ў пэўных іншых формах у XIX—XX стст., напрыклад, перанос ідалаў на могілкі і традыцыя ўшанавання антрапаморфных крыжоў.

Усе гэтыя акалічнасці павінен улічваць даследчык. Згаданыя праблемы таксама перашкаджаюць зрабіць агульную класіфікацыю стодаў, прасачыць храналагічна зме-

[98] Дучыц Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі. С. 90; Мялешка М. Камень у вераньнях і паданьнях беларуса. С. 31–32.

[99] Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии. Вильна, 1895. С. 33–34.

[100] Мялешка М. Камень у вераньнях і паданьнях беларуса. С. 31.

[101] Киркор А. Значение и успехи археологии в наше время // Записки Виленской археологической комиссии. Ч. 1. Вильно, 1856. С. 29.

[102] Забашта Р. Язичницька монументальна скульптура Білорусії (Контекстуальні паралелі й зближення). С. 33–35.

[103] Аникиевич К. Т. Сенненский уезд Могилевской губернии. Могилёв, 1907. С. 13.

ны ў традыцыі іх ўшанавання ды ў знешнім выглядзе. Перспектыўнай здаецца праца па вылучэнні рэгіянальных адрозненняў стодаў. На сённяшні момант мы можам пакуль толькі вылучыць групу жаночых стодаў, якая вельмі выразна адрозніваецца ад усіх іншых. Адсутнасць падобных адзін да аднаго ідалаў сведчыць аб адсутнасці на тэрыторыі Беларусі адзінага выяўленчага канону ў дачыненні да сакральнай скульптуры, што кажа аб магчымасці існавання пэўных рэгіянальных адрозненняў у культах.

На момант напісання артыкула дакладна захавалася 16 тутэйшых паганскіх стодаў, якія прыдатныя для вывучэння. Яшчэ 6 знойдзеных ідалаў ці іх фрагментаў захаваліся толькі ў апісаннях ці малюнках. Астатнія шматлікія згадкі ў пісьмовых і этнаграфічных крыніцах значна менш інфарматыўныя.

Трэба спадзявацца, што ў будучым знаходкі паганскіх ідалаў праз руплівую працу даследчыкаў дазволяць вырашыць акрэсленыя праблемы.

ARCANA·IMPERII·ALIAS. CASVS·LITHVANIÆ

Алексей·Дзермант

Алексей Дзермант — философ, этнокультуролог.
Сфера научных интересов — традиционная этническая культура, индоевропеистика, балто-славянская мифология, политическая и этническая история региона Балтийского моря, геополитика, философия традиционализма, история идей.

СІВЕРҌ

Великий князь литовский и король польский Александр Ягеллон на сейме в окружении гербов подчинённых земель. Гравюра Ёхана Халлера (*Johann Haller*) из «Статута» Яна Ласского. Краков, 1506 г.

Ничто так не соответствует праву и естественному порядку, как imperium, без которого не могут держаться ни дом, ни гражданская община, ни народ, ни человечество в целом, ни вся природа, ни сама вселенная. Ибо и вселенная повинуется божеству, и ему покорны и моря, и суши, и жизнь людей подчиняется велениям высшего закона.

Цицерон

Обычно Беларусь описывают как жертву империй. Наиболее этому поспособствовали отрицательные коннотации опыта нахождения в Российской империи и СССР. Не затрагивая тут вопроса про достаточно заметную и активную роль выходцев из белорусских земель в этих государственных образованиях, между прочим следует упомянуть, что «национализированные» белорусами государства — Полоцкое княжество и Великое Княжество Литовское также можно рассматривать через имперскую призму[1]. Но прежде всего это требует иного взгляда на сущность империи, если угодно, проникновения в её тайну (*arcana imperii*), которая до сих пор не даёт покоя многим исследователям, приверженцам и противникам «имперскости», а также того, какое отношение она имеет к нашему великому государству прошлого (*casus Lithuaniae*) и, наконец, к перспективам будущего.

[1] Сравн. заданный в контексте территориального расширения Полоцкого княжества в Прибалтике и экспансионистской политики ВКЛ при Витовте вопрос: *«можно ли назвать Полоцкое княжество и ВКЛ империями (или государствами с имперской властью)?»* // Ляховіч Л. Гісторыя і міфы, і не толькі // Спадчына. 2002. № 5—6. С. 131.

SVMMA IMPERII

Латинское понятие *imperium* ‘империй, власть, властное полномочие’, происходящее от глагола *imperare* ‘приказывать’ первоначально обозначало в Древнем Риме полноту исполнительной власти — управление армией и гражданской администрацией. Посредством выборов империем наделялись магистраты — те, кто занимал высшие государственные должности: сначала цари, затем консулы, преторы, диктаторы и проч.;

Древнеримский алтарь, посвящённый Непобедимому Солнцу (*Sol Invictus*) с имперским орлом. Рим, Капитолийский музей, 1-я половина I в.

но при этом права и полномочия носителя империя отличались в зависимости от места занимаемой должности в государственной иерархии. Наивысшей степенью империя (*summum imperium*) с исчезновением республиканской модели управления наделялся диктатор, позже принцепс-император, который вместе со вступлением на престол, пожизненно получал верховные руководящие и военные полномочия на всю территорию Римского государства, в результате чего империй и стал её синонимом — *Imperium Romanum*[2]. Империй имел сакральное измерение и был связан с обрядом ауспиций, проводимым для одобрения Юпитером его носителя[3]. Начиная с Августа, император как *Pontifex Maximus* являлся главой римской государственной религии[4]. Сакрализация фигуры императора в Риме нашла продолжение в христианском мире, где он рассматривался как единый земной наместник Бога, король королей и отец всех подданных, ответственный за поддержание порядка в обществе[5].

[2] Дементьева В. Магистратская власть Римской республики: содержание понятия «imperium» // Вестник древней истории. 2005 № 4. С. 46–75.

[3] Richardson J. S. Imperium Romanum: Empire and the Language of Power // The Journal of Roman Studies. 1991. Vol. 81. P. 2.

В глазах римлян их империя была универсальной основой единой высшей цивилизации, так как господствовала над всей землёй или, по крайней мере, над теми её частями, которые были этого достойны[6]. От Римской империи берёт начало представление о ней не столько как о государстве, сколько как о всём цивилизованном и политически организованном человечестве, упорядоченном Космосе: *«Империя как способ упорядоченного, ненасильственного существования с её тягой к универсализму и тотальнасти [...] в идеале — своего рода перфектная реальность»*, которая *«репродуцирует с наибольшей полнотой мифологическую парадигму взаимодействия человека и мира»*[7]. Мистическая миссия Рима виделась в безукоризненном властвовании над миром: *«Твой же, римлянин, долг — полновластно народами править! / Вот искусства твои: предписывать миру законы, / Ниспровержённых щадить и ниспровергать непокорных»* (Энеида, VI. 847—853). Захват Римом пространства базировался не только на завоеваниях, но и на сакральном праве провиденциального Города, который создавал иерархии подчинённых земель, органично включая их в свою систему государства, права и религии. Согласно Юлиусу Эволе, *Imperium Romanum* был органичным сочетанием сакрального и политического: *«Рим был одновременно материальным и духовным могуществом, [...] и вместе с этим являлся чем-то сакральным, потому что не было ни одного проявления жизни, общественной или частной, как на войне, так и в мире, которому не сопутствовал бы ритуал или символ, — Рим был культурной формой таинственного происхождения, у которой были свои полубоги и божественные цари, [...] и эта форма была кульминацией pax augusta et profunda (лат. 'мир августейший и глубокий'), где даже материально реализовалась универсальное отображение вечности (aeternitas), что почиталась в самой имперской функции»*[8]. С Римом связана традиция придания государству некоего абсолютного, мирового смысла, эманации которого распространяются на весь обозримый круг земель[9].

В средневековой Европе римская идея империи получила продолжение в лице всеобъемлющего христианского универсума[10]. Понятая через новую религиозную призму, она стала восприниматься как историческая сила, способная задержать появление антихриста и конец нынешнего эона[11]; этот *Sacrum Imperium* — органично структурированное общество, охватывающее всю землю, но образующееся не из отдельных индивидов как граждан мира, а из ряда союзов и сообществ и только посредством этого ряда ведущее к отдельному человеку[12]. Это означало, что вместо индивидуалистической модели в империи естественно продолжали существовать многочисленные промежуточные формы социализации, которые наиболее полно соответствовали политической, этнической, конфессиональной, профессиональной идентичности: семейные кланы, деревенские общины, братства, ремесленнические союзы, свободные города, княжества и т. д. Как замечает Ален де Бенуа: *«Принцип империи стремится согласовать единичное и множественное, частное и универсальное, её основным законом есть автономия и уважение разнообразия. Империя стремится к унификации на высшем уровне, без разрушения разнообразия культур, народов и этнической особенности. Она — целое, чьи автономные части соизмеримы прочности того, что их объединяет. Эти части дифференцированны и органичны»*[13]. Средневековая европейская империя представляла собой идеализированный трансцендентный порядок, осуществляемый как единство в многообразии[14].

Анализируя историю европейских и не только европейских империй, можно выделить их типичные черты, характеристики, элементы, из которых обычно складывается имперская система. Обратимся к наиболее авторитетным авторам, чьи дефиниции империи нашли научное признание и которыми активно пользуются при изучении конкретных имперских формаций. Джейн Бурбанк и Фредерик Купер предлагают понимать под империями *«большие политические структуры, экспансионистские либо те, что помнят о власти, которая распространялась на большие пространства; политии, создававшие разграничения и иерархии по мере того, как они включали в себя новых подданных. [...] Имперское государство склонно подчёркивать различия и неравенство своего многообразного населения»*, оно *«обращено наружу, оно захватывает и вбирает*

[4] Шукуров Р. Конфессия, этничность и византийская идентичность // http://www. centre-fr. net/spip. php? article169&artpage=7—10&lang=ru

[5] Коптев А. Princeps et Dominus: к вопросу об эволюции принципата в начале позднеантичной эпохи // Древнее право. 1996. № 1. С. 182—190.

[6] Ливен Д. Российская империя и ее враги с XVI века до наших дней. Москва. 2007. С. 48–49; Бурбанк Дж., Купер Ф. Траектории империи // Мифы и заблуждения в изучении империи и национализма. Москва, 2010. С. 339.

[7] Цуркан А. Имперское сознание римлян как мифологический феномен (К вопросу о специфике «римского мифа») // Вестник ВГУ. Серия Гуманитарные науки. 2001. № 2. С. 191.

[8] Evola J. Heidnischer Imperialismus. Leipzig, 1933. S. 43.

[9] Каспэ С. Империя и модернизация: общая модель и российская специфика. Москва, 2001. С. 33–34.

[10] Hüglin T. The Idea of Empire: Conditions for Integration and Disintegration in Europe // Publius. Vol. 12. № 3. Summer 1982. P. 14–24.

[11] Шмит К. Номос Земли в праве народов jus publicum europaeum. Санкт-Петербург, 2008. С. 33–35.

[12] Филиппов А. Социология и Космос. Суверенитет государства и суверенность социального // Социо-Логос. Вып. 1. Общество и сферы смысла. Москва, 1991. С. 10.

[13] Дэ Бенуа А. Ідэя Імперыі // Druvis. Almanach Centru etnakasmalogiji «Kryŭja». 2008. № 2. С. 212—213.

[14] Уколова В. Империя как «смысл» исторического пространства: попытка политологического анализа, обращенная в прошлое // Власть, общество, индивид в средневековой Европе. Отв. ред. Н. А. Хачатурян. Москва, 2008. С. 24.

в свою политическую структуру — часто через принуждение — новые народы, при этом открыто признавая их различия. Сама концепция империи подразумевает, что народы, её населяющие, управляются по-разному»[15].

Кроме территориальной протяжённости, экспансионизма, открытости и иерархической организации наиболее существенным является характер внутренних отношений в имперской структуре. Чарльз Тилли пишет: *«Империя — это большая, сложная политическая общность, связанная с центральной властью через косвенное управление. Центральная власть осуществляет определённый военный и фискальный контроль в каждом сегменте своего имперского господства, но позволяет два основных элемента косвенного управления: 1) сохранение или создание отличающихся соглашений для управления каждым сегментом; 2) осуществление власти через посредников, пользующихся значительной автономией в рамках своих областей, в обмен на лояльность, дань и военное сотрудничество с центром»*[16]. Центр империи, как правило, идентифицируется с определенной этнической или общественной группой, территориальным объединением, господствующими над другими этническими, территориальными или социальными группами[17].

Центром империи является метрополия, контролирующая подчинённую периферию, в связи с чем Майкл Дойл определяет империю как систему *«взаимодействия между двумя политическими единицами, одна из которых — доминирующая метрополия, осуществляет политический контроль над внутренней и внешней политикой, т. е. действующим суверенитетом другой единицы — подчинённой периферии»*[18]. Александр Мотыль полагает, что империя как *«иерархично организованная политическая система со ступицеподобной структурой — колесо без оправы — в котором элитное ядро и государство доминируют над периферийными элитами и обществами, выступая посредниками в важнейших взаимодействиях и направляя ресурсы из периферии в центр и обратно на периферию»*[19]. Ричард Суни так подытоживает суть империи: *«Это сложносочинённое государство, в котором метрополия так или иначе отличается от периферии, а отношения между ними определяются метрополией и воспринимаются периферией как оправданное или неоправданное неравенство, субординация и/или эксплуатация»*[20].

Достаточно ли только этих определений для понимания и анализа империй? Да, это определённый универсализованный набор признаков, наличие которых позволяет с научной точки зрения говорить о имперском характере того или иного государства. Но тут сразу хотелось бы предостеречь от крайностей позитивистского подхода, чтобы не применять упомянутые выше характеристики в качестве инструментария для «точно-математического» измерения. Кажется, наиболее оптимальный подход тут был предложен в рамках школы «новой имперской истории», которая подняла аналогичные вопросы относительно империи: *«То ли это историческая категория, то ли аналитический концепт, то ли метафора гетерогенности, а может быть все вместе? Между тем, «империя» — это исследовательская ситуация, а не структура, проблема, а не диагноз. «Помыслить как империю» можно любое общество, точно также как в номинальной «империи» можно обнаружить черты — или целые эпохи — национального. Секрет в том, что [...] аналитический инструментарий модерности насквозь «национален» и империю нельзя описывать в рамках некой одной модели с помощью какого-то одного метанарратива. Поэтому увидеть империю можно только осознанно и контекстуализованно совместив различные исследовательские «оптики»... »*[21].

Есть ещё один признак, который непросто методологически корректно описать, но он также очень часто является неотъемлемой частью империи. Это «имперский миф», который воплощается в форме идеологии, культурной политике, коллективной памяти и ностальгии, и живёт он дольше самих империй, каждый раз возвращая их к жизни, невзирая на возникшие границы во времени и пространстве: *«Империя уникальна тем, что в ней соединены в одно конкретно-историческая (и поэтому текущая) данность и некая метафизическая тайна, геополитическая и часто безобразная действительность*

[15] Бурбанк Дж., Купер Ф. Траектории империи. С. 331–332.

[16] Tilly Ch. How Empires End // After Empire. Multiethnic Societies and Nation-Building. The Soviet Union and the Russian, Ottoman and Habsburg Empires. Ed. by Karen Barkey and Mark von Hagen. Boulder, 1997. P. 3.

[17] Finer S. E. The History of Government from the Earliest Times. Vol. 1. Ancient Monarchies and Empires. Oxford, 1997. P. 8.

[18] Doyle M. Empires. Ithaca, 1986. P. 14.

[19] Motyl A. Imperial Ends. The Decay, Collapse, and Revival of Empires. New York, 2001. P. 4.

[20] Suny R. The Empire Strikes Out: Imperial Russia, «National» Identity, and Theories of Empire // A State of Nations. Empire and Nation-Building in the Age of Lenin and Stalin. Ed. by R. Suny. and M. Terry Oxford, 2001. P. 23.

[21] Герасимов И., Глебов С., Каплуновский А., Могильнер М., Семёнов А. В поисках новой имперской истории // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань, 2004. С. 26.

Флаг Священной Римской империи германской нации из книги «Wapen. Des Heyligen Römischen Reichs Teutscher Nation» Якоба Кёбеля (*Jacob Koebel*), художник Якоб Калленберг (*Jacob Kallenberg*). Франкфурт, 1545 г.

и мистическая по духу универсалистская парадигма социально-исторического бытия, своеобразный способ взаимодействия человека и мира, что превышает в своём скрытом значении свои внешние этнокультурные периметры. В империях в одно сливаются время и вечность, и потому их мифы не умирают»[22].

Вооружившись этими знаниями, мы можем смело совершить исследовательский экскурс в отечественную историю с целью поиска империи.

[22] Цуркан А. Цуркан А. Имперское сознание римлян как мифологический феномен (К вопросу о специфике «римского мифа»). С. 180.

Единственным адекватным ответом Москве казалось присоединение «своих» православных к государственной католической церкви. Действительно, это был очень лёгкий путь: не решать «православный вопрос», а просто ликвидировать его. Это была главная трагическая ошибка Великого Княжества Литовского, предрешившая его будущее и судьбу всей Речи Посполитой.

В 1572 г. умер последний представитель Ягеллонов по мужской линии Жигимонт Август. Вместо передачи короны Габсбургам, как легитимным преемникам, знать открывает эпоху выборных королей, что в дальнейшем сыграло свою пагубную роль для государства.

Во второй половине XVI в. в Речи Посполитой разворачивается католическая контрреформация. Проекты «единства костёла» предусматривали присоединение к католичеству и протестантов, и православных.

В то время конфликты между православными епископами и братствами достигли критического уровня. В 1586 г. Литву посещает Антиохийской Патриарх Иоаким, а в 1589 г. — Константинопольский Патриарх Иеремия II. Некоторые скоропалительные решения, такие как дарование ставрапигий братствам и монастырям, создание экзархата, только увеличили хаос в церкви и склонили часть местного епископата к унии с католиками.

Брестская уния 1596 г. была ими тщательно спланирована и проведена: пять из семи архиереев согласились на неё. Но уже 17 октября 1596 г. на параллельном православном соборе в Бресте патриарший экзарх Никифор Парасхес Кантакузин принял решение об освобождении от обязанностей и духовных должностей этих епископов-униатов.

Однако под давлением государственной власти уния активно расширялась: вскоре большинство православных приходов и монастырей стали униатскими, все греки были высланы из страны, а патриарший экзарх Никифор был схвачен и принял мученическую смерть в Мальборкском замке. В Беларуси не осталось ни одного православного епископа.

Провал прежних Лионской и Ферраро-Флорентийской уний так и не заставил католиков понять, что «локальные унии» вроде Брестской — абсолютная утопия. Ныне можно только удивиться наивной надежде решить «православный вопрос» в отдельной стране, пока Папа и Восточные Патриархи продолжают своё противостояние.

Тем не менее надо признать, что Брестская уния была выдающимся политическим проектом — она виделась как первый шаг по присоединению Московского Царства к Речи Посполитой. В 1610 г. даже удалось привести Москву к присяге на верность короле-

Собор святых апостолов Петра и Павла в Минске, 1612 — конец 1620-х гг.

вичу Владиславу. Но весь этот проект рухнул так же стремительно, как и начинался: Москва отбилась, православные в Речи Посполитой сохранились, а религиозная напряжённость в стране достигла наивысшего градуса.

Крах идеи Брестской унии стал очевидным в 1620 г., когда иерусалимский Патриарх Феофан III восстановил православную иерархию в Киеве и назначил епископов на другие кафедры. Брестская уния, таким образом, не объединила христиан в Речи Посполитой, не говоря уже о Москве. Единственным результатом стал раскол православной церкви и дополнительная религиозная напряжённость.

Церковь св. Ильи XVII в. в Витебске. Рисунок XIX в.

ПРАВОСЛАВИЕ И МОНАРХИ РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ

После Брестской унии православная церковь сохранилась в Речи Посполитой, хотя её влияние существенно уменьшилось — с 1632 в рамках ВКЛ существовала единственная Могилёвско-Мстиславско-Оршанская православная епархия.

Но говорить о тотальном упадке всё же не приходится[16]. Малоизвестен тот факт, что в первой половине XVII в. продолжали основываться православные монастыри, среди

[16] Котлярчук А. Праваслаўе ў Вялікім Княстве Літоўскім // http://www. belaoc. org/content/ view/55/72/lang, belarussian

меценатов были крупные дворяне ВКЛ: Константин Маскевич, Иван Юревич, Николай Суходольский, Михаил Миорский и другие. Действовали православные братства и типографии, всяческими способами помогали и защищали православие княжны св. Софья Слуцкая, Елена Стяткевич, Анна Огинская, Марина Суходольская, Софья Огинская, Софья Радзивилл, Ева Соломерецкая.

Отношения с государством тоже нельзя назвать сплошной конфронтацией — как перед, так и после Брестской унии. Так, в 1616 г. Жигимонт III издает указ о непринуждении православных к переходу на григорианский календарь. Интересно также упомянуть, что православная церковь, хотя и не участвовала в помазании королей и интронизации великих князей, тем не менее всегда поминала их на литургии вместе с православными епископами и патриархами. Формулировки менялись с XIV—XVII вв[17]. Первоначально молились

о здравии и спасении благочестивых царей, о благочестивом и боголюбивом Великом Князи нашем ИМЯРЕК, и всех благочестивых князий наших иже русскую землею пекущимися

Тропарь Креста Господня во времена Речи Посполитой звучал так:

Спаси, Господи, люди своя, и благослови достояние твое, победы великому Господару нашему на сопротивныя даруя, и своя сохраняя Крестомъ си люди.

В ходе многочисленных войн, в том числе с московитами, во всех православных церквях Великого Княжества Литовского служился молебен «За царя и людие, воспеваемый во время брани на супостата», в котором между прочим говорилось[18]:

Победу с небесе подаждь, якоже иногда Константину, верному Царю нашему, и всемъ людемъ твоимъ... И ныне смеренно молим Тя, рабу Своему Царю нашему ИМЯРЕК: сопутешествуй, и побори по нем на враги наша и покори техъ подъ нозе его... Но подаждь рабу твоему цару нашему мирное и безмятежное царство: и всякия междоусобныя брани и мятежи и волны того избави: и вышша всехъ бедъ и нуждъ сотвори: и вся вражды и крамолы востающия на державу его разруши: непреоборима же Твоею непобедимою силою от всякаго вражияго навета и нашествия того яви.

Во время проскомидии из просфор вынимались частицы с молитвой «О державнем Государи нашем великом Короли имярек», чтобы потом на Литургии вложить их в потир с Кровью Христовой. Поминались как живые, так и почившие монархи, подчеркнём, независимо от их личного вероисповедания — ведь царская власть для христиан имеет священную природу.

Таким образом, несмотря на религиозное давление, православные сохраняли верность королю Речи Посполитой, не порывая своей духовной связи с Константинопольским патриархатом. Настоящий упадок православие в Беларуси претерпело несколько позже — в результате русско-польской войны 1654—1667 гг.

ИНОЗЕМНЫЕ ВЛИЯНИЯ. ПОЛЬША И РОССИЯ

Пока Великое Княжество Литовское в XIII—XVI вв. сохраняло самостоятельность внутренней политики, межконфессиональные отношения в нём оставались относительно мирными и спокойными. Но со времен Брестской унии в Речи Посполитой начала стремительно накапливаться религиозная напряжённость, которая, в конце концов, взорвалась восстанием Богдана Хмельницкого на Украине в 1648 г. Гражданской войной в соседней стране воспользовалось Московское государство, развязав войну 1654—1667 гг. В ходе военных действий православие вновь было использовано обеими сторонами как политическая карта.

Хотя Москва декларировала защиту здешних православных, она в обход Константинополя направила на земли ВКЛ собственных епископов и организовала

[17] Медведева Е. М. Поминания церковных и государственных властей в печатных кириллических Служебниках Великого княжества Литовского XVI—XVIII вв. // Белорусский Сборник. Статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. Вып. 3. Санкт-Петербург, 2005. С.125–134.

[18] Требник митрополита Петра Могилы.Інформаційно-видавничий центр Української Православної Церкви. Киев, 1996.

вывоз местных православных святынь. В Россию попали Полоцкая и Виленская иконы Божией Матери, «Виленский крест», целиком был вывезен крупнейший просветительский центр — Оршанский Кутеинский монастырь. А после войны здешнее православие было добито властями Речи Посполитой на волне антимосковских настроений: в 1673 г. православные были лишены права нобилитации, конституция 1676 г. запрещала православным общаться с Царьградским патриархатом и ликвидировала ставрапигию братств. Вместо поддержки независимости киевских митрополитов католические власти сами толкнули православных в руки Московского патриархата.

От этой ситуации опять выиграла Москва, ликвидировав в 1686 г. автономию Киевской митрополии. С помощью турецких властей Московский Патриарх Иоаким получил в 1687 г. от Константинопольского Патриарха Дионисия IV грамоту, в которой Восточные Патриархи соглашались на смену юрисдикции Киевской митрополии. Несмотря на это, Иерусалимский патриарх Досифей II (Нотара) и следующие Константинопольские Патриархи считали этот переход неканоническим.

Так или иначе, но смена юрисдикции состоялась, и нынешний Константинопольский Патриарх Варфоломей недавно высказывал следующую мысль[19]:

Патриарх Дионисий IV рассудил, что при тогдашних обстоятельствах было необходимо церковное подчинение Украинской Церкви Московскому Патриархату, чтобы не преумножать беды благочестивого украинского народа и, чтобы он находился под православным политическим руководством.

[19] Патриарх Варфоломей I изложил свое видение вопроса о переходе Киевской митрополии из юрисдикции Константинопольской Церкви в состав Московского Патриархата в 1687 году // http://www.pravoslavie.ru/jurnal/print27270.htm

Сказанное справедливо для украинского народа, но белорусское православие в результате смены юрисдикции было почти полностью уничтожено католиками и униатами. Целое столетие — вплоть до разделов Речи Посполитой — польско-католическое влияние было абсолютным. В то же время Россия получила легальную возможность вмешиваться во внутренние дела своей соседки, чем часто и с удовольствием пользовалась.

Польскому государству, которое родилось в перманентном конфликте со Священной Римской империей, имперские идеалы всегда были чужими и непонятными. Поэтому, получив власть в Речи Посполитой, польская элита своей местечковостью и религиозной нетерпимостью сама довела страну до позорной гибели. Речь Посполитая после Потопа уже не возродилась, а всё больше углублялась в хаос, чтобы, наконец, быть разделённой своими соседями, которые вновь удачно использовали вопрос защиты православных и протестантских диссидентов.

Внутренняя и внешняя политика Великого Княжества Литовского в это время окончательно теряет свои особенности, аристократия перенимает польско-сарматскую идеологию и начинает смотреть на мир польскими глазами. Память о величии старой Литвы почти стёрлась.

РУССКИЙ МИР — ТУПИКОВЫЙ ПУТЬ?

Великое Княжество Литовское полностью вошло в состав Российской империи в 1795 г. Тогда же развернулся процесс ликвидации Брестской унии, который на наших землях закончился Полоцким объединяющим собором в 1839 г. Православие, таким образом, вновь воцарилось в Беларуси, хотя уже под московской, а не царьградской юрисдикцией.

Всё XIX ст. российские идеологи западноруссизма воспевали торжество триединой Руси, которой, очевидно, было суждено стать инструментом наказания польского национализма и возрождения православия на нашей земле. В то же время российские власти не заметили постепенной нравственной деградации своего стержневого великорусского этноса. Или, точнее, заметили только во время революции, когда обезумевшие толпы начали разрушать свои же церкви. Попробуем проанализировать причины этих печальных событий.

Часовня XIX в. с «литовскими» крестами, восстановлена в 1980 г., д. Заболотье Узденский р-н. Фото Ольги Лобачевской

XVIII—XIX вв. — время рождения европейского национализма, поэтому польское и российское влияние были очень схожи, как братья-близнецы. Идеалом государства была моноэтническая централизованная страна с одной государственной верой, языком и культурой. Московское государство некоторое время пыталось быть настоящей империей, в которой сохранялись особенности различных провинций — в ней даже существовали отдельные царства, такие как Касимовское на Рязанщине в 1452—1681 гг. Но со времен Петра этнорегиональные особенности начинают стираться на западноевропейский манер.



Спас Вседержитель.
Икона Успенской церкви (XVII в.)
в д. Бытень, Западное
Полесье, XVI в.

Прежде всего это касалось славяноязычных народов, поэтому белорусы, русские и украинцы рассматривались как единая нация. Это была явная идеологическая натяжка, ведь происхождение и исторический опыт этих народов очень разный. Объединяет их религия и славянский язык — также как болгар и сербов, что, однако не превращает все эти народы в мифический «русский суперэтнос» (терминология некоторых русских идеологов[20]). Упорное сознательное игнорирование культурных особенностей спровоцировало позднейший антагонизм и сепаратизм в Украине и Беларуси.

[20] Иеромонах Евфимий (Моисеев). Русская Церковь как основа Русского мира, Русский мир как основа Вселенской Церкви // http://www.bogoslov.ru/text/501891.html

Но эта ошибка была не единственной и даже не решающей. Главная проблема заключается в сокровенном, но очень устойчивом филетизме Русской Церкви, зацикленности на «русском мире» и славянофильстве. Лояльность государству ценилась в России больше, чем принадлежность к христианской ойкумене.

Проблема зародилась еще в XIV в., вместе с московским сепаратизмом, который Константинопольские Патриархи неоднократно сурово осуждали. Достаточно вспомнить известную грамоту Патриарха Антония IV (1388—1395) к московскому великому князю Василию Димитриевичу[21]:

Отчего ты не уважаешь меня, патриарха, и, не воздая должной чести, какую воздавали предки твои, великие князья, не почитаешь не только меня, но и людей, которых я посылаю к вам и которые не получают ни чести, ни места, всегда и везде принадлежавших патриаршим людям? Кроме того, слышу некоторые слова, которые произносит благородство твое о державнейшем и благочестивом самодержце моем и царе, и скорблю, что ты возбраняешь, как говорят, митрополиту поминать Божественное имя царя на сугубых ектениях,— это дело небывалое!

Такая линия поведения характерна и для некоторых других народов и, в конце концов, была осуждена на Большом Поместном соборе 1872 г. в Константинополе, как ересь этнофилетизма:

Мы отвергаем и осуждаем племенное деление, то есть племенные различия, народные распри и разногласия в Христовой Церкви, как противные евангельскому учению и священным законам блаженных отцов наших.

Сейчас термин «русский мир» звучит повсюду, в том числе от первоиерархов Русской Православной Церкви. Безусловно, он, несмотря на сложные дипломатичные формулировки, имеет привкус филетизма, так как переводит фокус внимания с **христианского мира** на узкий этнический уровень «**русского мира**». Подобный подход также девальвирует принципы имперского универсализма, искусственно ограничивая империю сферой влияния одного этноса.

Парадоксально на этом фоне выглядит тот факт, что титульный и стержневой имперский этнос оказался, пожалуй, самым несчастным и угнетенным в Российской империи. Крепостничество, рекрутские наборы, тотальная неграмотность и забитость государствообразующего народа — такого парадокса история империй ещё не знала. Изменения этого странного положения оказались нерешительными и запоздалыми. Кроме того, эти меры одновременно привели к ещё большей эмансипации враждебных инородцев, которые во время революции и в СССР совершили, по сути, геноцид бывшего имперского этноса ради создания фантастического «советского народа». Уничтожение русского этноса не прекратилась, а даже приняло новые формы и после распада СССР.

Путём напряжения последних сил и пролития рек крови Россия выстояла в XX в. ценой гибели лучшей части своего генофонда и потери почти всех территориальных приобретений за последние 250 лет.

Теперь Москва вместо имперского масштаба мышления зачастую демонстрирует только истеричный национализм и мелочные обиды на соседей. Великорусский этнос за последние столетия драматически ослабел морально и физически, он болен идейной шизофренией. Коммунисты, либералы, фашисты, монархисты создали невероятный хаос в русских головах. Даже среди «имперцев» настоящая имперская идея деградировала до уровня банальной националистической идеи-фикс, на что обращают внимание и в Русской Православной Церкви[22]. Всё это заставляет наши народы искать новую, более широкую альтернативу герметичному «русскому миру».

[21] Acta et diplomata græca medii ævi sacra et profana. Ed. F. Miklosich et J. Muller. T. II. Vindobonæ, 1862. P. 192.

[22] Свящ. Андрей Дудченко. Русский мир — манифест филетизма? // http://www.bogoslov.ru/text/505334.html

Сейчас мы имеем разрушенную и изувеченную Восточную Европу, разодранную на части молодыми этногосударствами, лишённую имперских центров власти.

Возможно, была особая воля Божия, чтобы обе страны, которые считали просторы Великого Княжества Литовского своей вотчиной, потерпели исторические катастрофы, в результате которых Россия уменьшилась до размеров XVII в., а Польша вообще оказалась в пястовских границах тысячелетней давности. Более ярко крах националистических проектов, пожалуй, невозможно проиллюстрировать.

Обычно считают, что история Великого Княжества Литовского очень трагична из-за его нахождения на линии геополитического разлома Запад—Восток, отмеченной тысячелетним конфликтом католичества и православия. Но на эту ситуацию можно посмотреть совсем с другой стороны — как на уникальную концентрацию и точку напряжения европейского духа.

Так в своё время синтез христианства и греко-римского античного наследия родил европейскую цивилизацию, которая в итоге овладела всем миром. Эта величественная история может повториться на новом уровне.

Земля древних кривичей ещё в дохристианские времена была насыщена сакральным смыслом, есть даже основания соотносить её с мифической Гипербореей[23]. Может, совсем не случайно, что тут же встретились и оба Рима, укоренились и живут до сих пор вместе. В этом уникальном для Европы сочетании виден огромный потенциал для духовного развития, который до сих пор не осмыслен должным образом и не использован.

[23] Санько С. Імёны бацькаўшчыны. Крыўя // Druvis. Almanach Centru etnakasmalogiji «Kryŭja». 2005. № 1. С. 7–17.

Похоже, народы бывшего Великого Княжества Литовского не зря «отдыхали» несколько веков от государственного строительства, и теперь уже не стоит скрывать свой талант, как в евангельской притче. В своё время литовская протоимперия была весьма успешной, хотя потом инициативу и соответствующий инструментарий перехватили соседи. Но во времена расцвета государства её правители демонстрировали этническую и религиозную терпимость, недосягаемую для понимания других монархий. Причём личное вероисповедание (даже язычество!) великих князей не могли поколебать их преданности идее общего блага края, что напоминает нам богатство духа великих Кира и Константина. Даже в современной Литве бросается в глаза множество памятников героям всех народов Великого Княжества и Речи Посполитой, ухоженные магнатские дворцы и усадьбы, польские и белорусские вывески, в храмах звучат церковно-славянские, белорусские, украинские, литовские, польские, латинские молитвы, уличные торговцы понимают немецкий, русский, английский языки. И всё это — не забывая свою родную литовскую культуру. Вот пример настоящего имперского духа и мышления, которые до сих пор хранит литовский народ!

Эти особенности литовского менталитета органично дополняются качествами белорусов, чьи предки также активно участвовали в строительстве ВКЛ. Здесь уместно вспомнить всегдашний консерватизм белорусов, их любовь к порядку во всем — от чистоты на улицах, до упорядоченности общественной жизни. Недаром Беларусь — единственное государство на постсоветском пространстве, не допустившее уничтожения собственной экономики и сохранившее независимость во внешней и внутренней политике.

Поэтому, рассуждая о белорусской мечте, о нашем видении будущего, которое способно веками вести общество к заветной цели, подобно путеводной звезде, будет вполне уместно в качестве такого футуристического проекта выдвинуть идею зарождения на наших землях новой империи, несущей общее благо Европе и миру и творчески сочетающей наследие восточных и западных половинок европейской цивилизации. Именно это я и понимаю под литовской альтернативой вместо проектов культурного гетто «русского мира» и глобалистской мультикультуральной антиимперии. Из нашего сурового северного края, расположенного в центре географической Европы, но веками считавшегося задворками Европы или России, как из евангель-

ского горчичного зёрнышка, вновь может вырасти большое дерево новой империи, ветви которой покроют сначала север нашего континента, а затем устремятся ввысь.

Масштаб задач не должен нас смущать, а подстёгивать к усердной работе ради высокой цели — способность к пониманию и решению задач такого уровня является тестом на зрелость народа и нас самих. Как говорят белорусы: *«Працуй, нябожа, то і Бог паможа»*.

Палымяныя крыжы Святога Андрэя,
або Бургундская іста вечнай Еўрапейскай імперыі

Кірыла Карлюк

Кірыла Карлюк — гісторык, магістр гісторыі.
Скончыў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка,
магістратуру Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Вільня)
па праграме Універсітэта Паўднёвага Стакгольма (Södertörns högskola)
«Параўнаўчая гісторыя краін Паўночна-Усходняй Еўропы».
Займаецца гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага канца XVI—XVII стст.,
дынастычнай гісторыяй Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы раннемадэрнага часу.

Сіверга

Алегарычная выява шлюбу Максіміліяна I Габсбурга і Марыі Бургундскай. Гравюра Ганса Бургкмайра Старэйшага (*Hans Burgkmair der Ältere*) з кнігі Максіміліяна Габсбурга «Der Weißkunig», 1514–1516 гг.

Еўрапейская Супольнасць у асноўным жыве паводле спадчыны Святой Рымскай імперыі, хоць большасць людзей, што жывуць згодна ёй, не ведаюць, паводле якой спадчыны яны жывуць.

Эрцгерцаг Ота фон Габсбург

Калі 5 студзеня 1477 г. у бітве пад Нансі скрываўленае нежывое цела герцага Карла Смелага, апошняга легітымнага мужчынскага нашчадка Бургундскага Дома, упала долу на халодную зямлю, а рэшткі яго невялікага стомленага войска былі ўшчэнт разбітыя ў колькі разоў большымі сіламі антыбургундскай кааліцыі пад кіраўніцтвам герцага Рэнэ II Латарынгскага, наўрад ці хто мог падумаць, што гэта зусім не канец амбітнага «Вялікага Герцагства» (як сучаснікі называлі велічнае і заможнае Бургундскае гаспадарства), а толькі яго новы пачатак. Гісторыя толькі зрабіла яшчэ адзін віток, а святая ахвярная кроў дынастыі бургундскіх герцагаў, прамых нашчадкаў Карла Вялікага, азначыла чарговае пераўвасабленне еўрапейскай імперскай ідэі. Гэтым разам пахіснуты белы штандар са знакамітым пунсовым бургундскім крыжам з акрываўленых рук герцага перахапілі Габсбургі, якім было наканавана годна трымаць

Герб Антуана
Бургундскага як рыцара
Ордэна Залатога Руна, 1478 г.

яго на абсягах сваёй велізарнай імперыі, над якой у самым літаральным сэнсе ніколі не заходзіла сонца.

Звяртаючыся да гісторыі Бургундскага Дому, малодшай галіны французскай каралеўскай дынастыі Валуа, цяжка пазбыцца зачаравання яе містычным складнікам, магіяй правідэнцыялізма, абсалютна невытлумачальнага з гледзішча звычайнай логікі. Бо як яшчэ зразумець той уражвальны, вельмі парадаксальны шлях, які прайшлі бургундскія герцагі ад адносна нязначных феадальных уладароў Французскай кароны да архітэктараў новай імперскай ідэі, пачынаючы ад Філіпа II Смелага, што ў 1363 г. атрымаў Бургундыю ад свайго бацькі Жана II, караля Францыі, у якасці звычайнага апанажа? Гэта праўдзівая містэрыя духу, крыві і зямлі, увасобленая ў бляску бургундскага рыцарства, святасці крыві Каралінгаў і непахіснай восі духоўнай метраполіі Лацінскага свету. Менавіта іх арганічнае спалучэнне сілкавала праўдзівую Імперыю цераз стагоддзі, гарантавала пераемнасць яе герархіі і Традыцыі.

Перыпетыі дынастычнай гісторыі, на першы погляд, ніяк не спрыялі высокаму статусу, які займеў Бургундскі Дом у сям'і паноўных дынастый *Res publica Christiana*. Герцаг Філіп II быў *толькі* малодшым сынам дзейснага і братам наступнага французскага караля, а яго першапачатковыя ўладанні збольшага не выходзілі за межы ўласна Бургудскага герцагства, якое на XIV ст. уяўляла толькі невялікую паўночную перыферыю ранейшага слаўнага Каралеўства бургундаў, меншую за аднайменную сучасную французскую правінцыю. Аднак тая няўхільна прырастала новымі землямі ў самым сэрцы колішняй імперыі Карла Вялікага. Ужо ў 1384 г. заззяла шчаслівая зорка Бургундыі: у выніку шлюбу Філіпа II з Маргарытай III, адзінай дачкой графа Людовіка II Фландарскага, ён атрымаў у спадчыну Фландрыю, Артуа, Ніверне, Франш-Кантэ, Рэтэль і Мехелен.

Потым цягам аднаго стагоддзя плеяда таленавітых герцагаў самымі рознымі шляхамі спрабавалі ўмацаваць магуту сваёй дынастычнай дзяржавы. Яе галоўная крыніца — *Stirps Regia*, каралеўская кроў, дынастычныя шлюбы. Шэраг суседніх імперскіх біскупстваў і княстваў трапляюць пад уплыў Бургундыі і прыслухоўваюцца да герцагаў: Мец, Туль, Вердэн, Люксель, Сэн-Поль, Турнэ, Камбрэ, Льеж, Манбельяр, Клеве-Марк ды інш. Часта іх узначальваюць сваякі ці нават бастарды бургундскіх герцагаў. *Bella gerant alii, tu felix Austria nube, nam quae Mars aliis, dat tibi regna Venus*[1] — адна з многіх мудрых формул, сапраўдная філасофія імперскага канструявання, якую атрымалі ў спадчыну Габсбургі ў пэўным сэнсе з рук бургундскіх герцагаў.

Бургундыя — гэта ўласна не *гаспадарства* ў сучасным разуменні, але канфедэрацыя, хаўрус размаітых натуральных тэрытарыяльна-дзяржаўных арганізмаў і лакальных традыцый, асобных княстваў, багатых гарадоў ці проста перыферыйных правінцый пад адной супольнай каронай, уладай бургундскіх герцагаў. У свеце, дзе па-ранейшаму амаль беспасярэдне панавалі дынастычная палітыка, старадаўнія правы і прывілеі земляў, станаў, розных сацыяльных груп і нават сем'яў і прыватных асоб. Дзе імператар, як і раней, узвышаўся над суверэнітэтам усіх зямных гаспадароў, а іх улада часам сягала далёка за нейкія акрэсленыя лінейныя палітычныя межы — важкага атрыбута позніх мадэрных дзяржаў, якога па-вялікаму рахунку не існавала прынамсі да другой паловы XVII ст. Традыцыя ніжэйшых станаў фарміравалася ў вельмі вузкіх абмежаваных лакальнасцях, а культура паноўных груп і каралеўскіх двароў насіла ўніверсальныя рысы.

Лад, які быў адбіткам натуральнага нябёснага парадку, у якім не было месца штучным нацыянальным пачуццям, а імкненне да цэнтралізацыі і ўзурпацыі ўладнага суверэнітэта ў адных руках ад імя «народа» выглядала першапачаткова не болей, чым дэвіяцыяй ці нават паталогіяй. У Хрысціянскім свеце быў адзін Імператар, *quod in coelis Sol hoc in terra Caesar*[2], сакральная ўлада якога ўзвышалася над вельмі складнай пірамідальны палітычнай герархіяй каралёў і князёў, біскупаў і рыцараў, вольных гарадоў і правінцыйных парламентаў, вясковых супольнасцяў і землеўласнікаў, спалучаных з ім і паміж сабой тонкімі ніцямі павуціння феадальных адносін, лаяльнасці і легітымнасці. У сваю чаргу, гэта каласальная сістэма ў самых розных праявах бясконца

[1] Няхай іншыя ваююць, а ты, шчаслівая Аўстрыя, гуляй вяселлі, бо ўлада, якую адным дае Марс, табе прыносіць Венера (лац.).

[2] Як у небе Сонца, так і на зямлі Імператар (лац.).

ўзнаўлялася ў межах асобных каронаў і на больш нізкіх узроўнях. Натуральны парадак, які непасрэдна спрыяў фарміраванню і захаванню лакальных традыцый, асаблівай філасофіі еўрапейскай тутэйшасці.

Гэтак была сканструявана Вялікая Бургундыя і ў той ці іншай ступені ўсе астатнія еўрапейскія дзяржавы. У тым ліку і тагачаснае Вялікае Княства Літоўскае з яго тыповай сярэднявечнай структурай лакальных зямельных прывілеяў і шматузроўневых аўтаномій: Жамойць, Віцебская і Полацкая зямля, Наваградчына са сваім Чорным Анёлам[3], іншыя рускія землі, даўняя традыцыя феадальна-ўласніцкага Слуцкага княства, якое дажыло блізу да самага канца ВКЛ, гарадское самакіраванне буйных местаў ды мястэчак і г. д.

[3] Гучна маніфеставаным мясцовай шляхтай у якасці зямельнага сімвала замест агульнадзяржаўнай Пагоні.

Дзясяткі моў, гаворак, этнакультурных і гістарычных рэгіёнаў ды ідэнтычнасцяў. Бургундцы, пікардыйцы, валоны, люксембуржцы, фламандцы, галандцы, ніжнефранконцы, эльзасцы — гэта толькі досыць *спрошчаная* этнічная карціна бургундскіх земляў, аб'яднаных дзеля сакральнага дынастычнага права пад скіпетрам супольнага ўладара. Менавіта таму агрэсія або захоп тэрыторый амаль ніколі не легітымаваўся ілжывымі прэтэнзіямі «нацыянальнага адзінства» або «этнакультурнай перавагі», пакуль гэта не стала правілам, пачынаючы ад Французскай рэвалюцыі і Напалеона, дасягнуўшы свайго апагею ў плашчыні праектаў таталітарна-плябейскага мадэрну Гітлера і Сталіна (узгадаем, напрыклад, рыторыку «вызвольнага паходу» 1939 г. Нямеччыны і СССР супраць Польскай Рэспублікі).

Зараз тэрыторыі сярэднявечных дынастычных гаспадарстваў падзеленыя шматлікімі штучнымі межамі нацый-дзяржаў, як, напрыклад, шасцю ў выпадку Бургундыі (Францыя, Нямеччына, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург і Швейцарыя); што, праўда, пасля Шэнгенскай дамовы межамі вельмі ўмоўнымі. Падобная сітуацыя і з ВКЛ, дзе мясцовыя ўсходнееўрапейскія нацыяналісты да ўсяго высунулі прэтэнзіі і на «гісторыю», што ў выпадку падобнага «падзелу бургундскай спадчыны» выглядала б поўным абсурдам — прыкмета таго, наколькі моцна маладыя гістарычныя школы пацярпелі ад мясцовых нацыяналістычных ідэалогій. Ва ўмовах жа Еўрапейскага Звязу, дзе палітычныя межы і адпаведныя ідэалагемы ўсё больш страчваюць сваю актуальнасць, як птушка Фенікс, адраджаюцца рэгіёны ды вяртаецца ідэя Бургундыі, гісторыя зараз ёсць часцей не прычынай чарговых нацыяналістычных спрэчак і неабгрунтаваных закідаў, а наадварот — моцным нутраным штуршком, які абуджае ў знявечаных душах еўрапейцаў пакрыёмны покліч традыцыйнай Імперыі.

Ідэя Бургундыі крышталізавалася амаль два стагоддзі ў асяроддзі мультыэтнічнага рыцарства, казачна багатых месцічаў Бруге, Гента, Іпра, Антверпена, Бруселю ці Ліля (нават у параўнанні з гандлярамі і банкірамі Ламбардыі, Генуі, Фларэнцыі, Сіены, Лукі ці велічнай Венецыі) і працавітых сялян Люксембурга ці Гельдэрна. Яна ж чырвонай ніткай праходзіць праз нябачаны раней росквіт познесярэднявечнай культуры і нараджэнне паўночнарэнесанснага мастацтва ў бургундскай Фландрыі. І асабліва герцагскага двара, шыкоўны, бездакорны стыль якога стаў прыкладам для ўсіх хрысціянскіх манархаў. Калі бачыш шматлікія каштоўныя артэфакты, звязаныя з Бургундскім Домам, як, напрыклад, келіх Філіпа Добрага ці карону Матыльды, жонкі Карла Смелага, гэта зразумела без лішніх словаў і мудрагелістых канцэпцый. Двор, які стаў абсалютным культурным цэнтрам рыцарства, шмат у чым пахіснуўшы манаполію італійскага мастацтва. Раскоша, якая не магла не ўразіць: за два гады (1444—1446) на шоўк і парчу для адзення герцага і аздобы яго палацаў толькі аднаму (!) з прыдворных італійскіх пастаўшчыкоў было выдаткавана 2% усіх падаткаў, што трапілі за гэты час у дзяржаўную скарбніцу. Клаўс Слютэр, Жан дэ Марвіль, Жан Малуэль, Жан дэ Бюмец, Ян ван Эйк, Рабер Мартон, Жыль Беншуа, Гіём Дзюфаі, Гуга ван дэр Гус, Рагір ван дэр Вейдэн — знакавыя постаці мастацтва, шчодра фінансаваныя з бургундскае скарбніцы, творы якіх і зараз фарміруюць прастору еўрапейскага культурнага ландашфта.

Гэта двор, які сабраў самае бліскучае рыцарства Еўропы. Бо трэба мець на ўвазе старое памылковае меркаванне, нібыта ад XV ст. еўрапейскія манархіі ў уяўным хаўрусе

Герцаг Філіп III Добры.
Вялікі конны гербоўнік Ордэна
Залатога Руна, 1430–1461 гг.

Герцагіня Марыя Бургундская з гербамі бургундскіх зямель. Мініяцюра з Выдатнай хронікі Фландрыі, канец XV ст.

з буржуазіяй імкнуліся да нейкае звышцэнтралізацыі і абмежавання дваранскіх прывілеяў; аднак цягам XV—XVI стст. тыя дамагліся куды большых поспехаў у ліквідацыі шырокіх правоў гарадскога самакіравання і палітычных уплываў месцічаў. Гэта ж тычыцца і гаспадароў Бургундыі, якія даволі ўдала змагаліся з сур'ёзнай апазіцыяй заможных фламандскіх гарадоў, што часам перарастала ва ўзброеныя паўстанні (Льеж, Гент, Бруге ды інш.). У гэтай барацьбе натуральным станавым апірышчам бургундскай манархіі заставалася дваранства.

Да таго ж самі герцагі з'яўляліся бездакорным прыкладам мужнасці і шляхецкага чыну, ці не самымі вядомымі рыцарамі ў Еўропе. Пачынаючы ад Філіпа II *Смелага*. Яго

сын Жан *Sans-Peur*[4], які ў 1396 г. самастойна браў удзел у выправе вугорскага караля Жыгімонта супраць турак, кінуўся ў самы гушчар бітвы пад Нікопалем, быў схоплены асманамі і пазней выкуплены бацькам за астранамічную суму 200 000 дукатаў. Яго нашчадак — герцаг Філіп III Добры — праводзіць шмат часу ў вайсковых выправах Стогадовай вайны і рыцарскіх турнірах. Гэтаксама і Карл Смелы (ці Карл *Адчайны*), мянушка якога кажа сама за сябе, увогуле звязаў сваё жыццё з досыць агрэсіўнай знешняй палітыкай і войнамі, падчас якіх асабіста ўзначальваў бургундскае войска.

Набілітэт складае ўсяго каля 1—2% падданых бургундскіх герцагаў, але разам з тым іх двор прыцягвае рыцарства з усіх куткоў Еўропы, звязваючы яго ў адну вялікую шляхетную карпарацыю. Напрыклад, падскарбі ВКЛ Аляксандр Солтан у 1468 г. быў ушанаваны бургундскім герцагам Карлам Смелым ганаровым званнем радцы і камергера, *in consiliarium et cambellanum nostrum retinendum duximus*; а яшчэ раней у 1406 г. бургундскі герольд быў адным з першых, хто павітаў вялікага князя Вітаўта падчас яго маскоўскай выправы. Ці ў 1421 г., калі бургундскі рыцар Жыльбер дэ Лануа наведваў літоўскі вялікакняскі двор з дыпламатычнай місіяй заключыць антытурэцкі хаўрус.

Дваранства, узначаленае таленавітымі герцагамі, — гэта *меч*, што карае тых, хто ідзе супраць дынастыі і Хрыста, а таксама *кроў* Бургундыі. Тагачасны еўрапеец прынамсі да XVIII ст. перакананы ў містэрыі Крыві. Яшчэ ў першай палове XIV ст. знакаміты італійскі праўнік Бартола да Сасаферата быў упэўнены, што нованабілітаванае дваранства не такое выдатнае, як старое, прынамсі пакуль не зменіцца чатыры калены. Але дваранства — гэта таксама чын, адвага і годнасць. Асаблівы стыль паводзінаў — жыць шляхетна. Вось цікавыя рэдкі ўзнёслага Жоржа Шатэлена, хранікёра герцагаў Філіпа Добрага і Карла Смелага, які правёў сваё жыццё пры бургундскім двары:

Усіх шляхетных сэрцам гонар кліча
Любіць усё, у чым шляхетнасць ёсць,
Так шчыра, як шляхетны кажа звычай[5].

Бургундскія рыцары супрацьстаяць праўдзівым і ўяўным ворагам Хрыста, выпраўляючыся далёка на ўсход у Вугоршчыну змагацца з ісламскай пагрозай ці ў землі балтаў, дзе яны пад сцягамі Тэўтонскага ордэна мараць хрысціянізаваць «паганскую» Літву. Гэта ж прывяло многіх з іх і пад Грунвальд. У 1454 г. на шыкоўным *банкеце Фазана*[6] ў Зальным палацы Ліля герцаг Філіп Добры ад імя магістра Ордэна Залатога Руна і бургундскага рыцарства кінуў выклік магутнай асманскай Порце, даўшы са сваімі васаламі ўрачыстую прысягу вызваліць Канстантынопаль і Праваслаўную Царкву ад турэцкага ярма. Сапраўды прыгожая фантастычная мара аб Крыжовым паходзе, якая аднак не была рэалізаваная дзеля тагачасных складаных палітычных рэалій.

Сапраўдным «бэстсэлерам» таго часу стаў «Жыццяпіс добрага шэвалье месіра Жака дэ Лалена», аўтарам якога быў бургундскі герольд і хранікёр Жан Ляфеўр. Дэ Лален — ці не самы ўшанаваны герой бургундцаў — быў валонскім рыцарам герцага Філіпа III Добрага і зрабіў сабе гучнае імя, дзякуючы бліскучым подзвігам на рысталішчы. Што праўда, турніры, гэтая праява праўдзівай рыцарскасці, *à la mode de Bourgogne* набываюць настолькі шыкоўную афарбоўку і становяцца такімі дарагімі, уражваючы ўсіх сучаснікаў, што ўдзел у іх могуць прымаць збольшага толькі чальцы паноўных дынастый і *crème de la crème* арыстакратыі падуладных ім земель. Як трапна заўважыў эстрэмадурскі ідальга дон Бернабэ Марэна дэ Варгас:

Las letras y las armas dan nobleza: consérvanla el valor y la riqueza nobles[7].

Познесярэднявечныя дактары навук і універсітэцкая прафесура шмат у якіх землях (Кастылія, Леон, Праванс, Дафінэ, Нармандыя, Эмілія ды інш.) аўтаматычна атрымоўваюць шляхецтва. Як лічылі ў першай палове XV ст. Джавані Буанакорса

[4] Бясстрашны (фран.).

[5] Пераклад з французскай Антона Францішака Брыля.

[6] Магчыма самы вядомы і бліскучы прыём позняга сярэднявечча. Назва абрана паводле ракі *Phasis* (зараз Рыоні) у Калхідзе (Грузія), з якой звязаны подзвігі Язона, а назва ракі адпаведна паходзіць ад назову птушкі, якая была там багата прадстаўлена. У 1446 г. у Батумі нават прыбыла бургундская экпседыцыя пад кіраўніцтвам Жафруа дэ Туазі. На «банкеце Фазана» былі прадстаўлены шматлікія жывыя сцэны з жыцця Язона. Такім чынам, гісторыя загадкавага *Orient*'у, старажытнай Грэцыі і велічнай Бургундыі звязвалася ў адно цэлае.

[7] Лісты ды зброя надаюць шляхетнасць, адвага і багацце яго захоўваюць (гішп.).

дэ Мантэманьё і Поджыа Брачыаліні, шляхецтва — годнасць, атрыманая праз веду. «Жыццяпіс маршала Бусіко» першай паловы XV ст. тлумачыць гэта наступным чынам:

Дзве рэчы былі заснаваныя ў свеце воляю Госпада, падобна двум слупам, каб падтрымліваць парадак законаў божых і чалавечых… Гэтыя два бездакорных слупа ёсць Рыцарства і Вучонасць, гэтак цудоўна спалучальныя паміж сабой.

Для біскупа Філіпа Ветрыйскага гэта тры алегарычныя ліліі, увасобленыя ў станавай структуры: Веда, Вера і Рыцарства.

Зрэшты, высакародны рыцарскі этас ніякім чынам не перашкаджаў прагматычным кіраўнікам Бургундыі плесці шматлікія інтрыгі і змовы ў абарону сваіх дынастычных інтарэсаў і дзеля рэалізацыі сваіх амбіцый, што вылілася ў серыю гучных крывавых палітычных забойстваў, адной з ахвяраў якіх у 1419 г. у Мантэро стаў сам герцаг Жан Бясстрашны.

Княская слава шукае праявы ў гонары і высокіх небяспеках; усе сілы гаспадароў сумяшчаюцца ў адной кропцы, менавіта ў гонары.

Гэта было і абсалютна зразумелай прычынай першапачатковай падтрымкі яго сынам Філіпам Добрым прэтэнзій ангельскіх каралёў Генрыха V і Генрыха VI на французскі пасад падчас Стагадовай вайны, калі сама Бургундыя імкнецца інкарпараваць Шампань, злучыўшы падзеленыя бургундскія землі на поўдні і поўначы. Апошняя вайна, у якой герцаг Філіп уздымаў свой меч, амаль безвыніковая для Бургундскага гаспадарства. Мажліва перад ім нейкім чынам на момант раскрыўся сэнс боскае задумы, наканавасці лёсу яго дынастыі і гаспадарства, іх хуткага трыумфальнага ўзыходжання. Адна за адной на яго сыпаліся кароны, якія той атрымаў у спадчыну праз дынастычныя сувязі ці ў абмен на шчодрыя грашовыя сумы.

Заможныя Брабант, Лімбург і Антверпен адыходзяць да герцага Філіпа III Бургундскага ў 1430 г. пасля смерці яго кузена Філіпа дэ Сэн-Поля, зусім хутка пасля набыцця ім Намюра годам раней. У 1432 г. да іх далучацца яшчэ Эно і ўся Галандыя, а яшчэ праз адзінаццаць гадоў Люксембург. Менавіта Філіп III пачаў нефармальна называць сябе *le grand duc d'Occident*, да чаго часам жартаўліва дадавалі дзеля шыкоўнага чырвонага бургундскага напою — *«вялікі герцаг Захаду і гаспадар самых лепшых він Хрысціянскага свету»*.

Брусель, сталіца Брабанту, у якім перабудоўваецца шыкоўны палац Каўдэнберг, на доўгі час робіцца адной з асноўных рэзідэнцый двара, як бургундскага, так і пазнейшага габсбургскага. Дыжон, уласна сталіца Бургундскай зямлі, адыходзіць на другі план. Аднак трэба мець на ўвазе, што Бургундыя, як і доўгі час шмат якія іншыя гаспадарствы тагачаснай Еўропы (Кастылія/Гішпанія, Швецыя, Данія, Аўстрыя, многія нямецкія дзяржавы ды сама Свяшчэнная Рымская імперыя, Вугоршчына і г. д.), не мела адзінай сталай сталіцы, што было звязана з палітычнай і эканамічнай мэтазгоднасцю. Двор доўгі час заставаўся «вандроўным». Гент, Ліль, Брусель, Дыжон, Люксембург ці Прынцэнхоф у маляўнічым, амаль казачным Бруге… Гэта дапамагала эканоміць на яго ўтрыманні, на месцы вырашаць бягучыя пытанні, падкрэсліваць сувязь асобных зямель і іх гаспадара, кантраляваць лаяльнасць правінцый, выконваць прадстаўніча-цырыманіяльныя функцыі згодна мясцовых традыцыяў.

У той самай ступені гэта тычыцца і Вялікага Княства Літоўскага, якое, хоць і атрымала *de jure* сталіцу ў 1323 г., *de facto* не мела яе да канца XV — пачатку XVI ст., калі, працягваючы працэс, запушчаны яго папярэднікамі, рэформы Аляксандра Ягелончыка аформілі інстытуцыянальныя падваліны літоўскай дзяржаўнасці, сканцэнтраваныя ў Вільні (двор, яго службовая сістэма, паны-рада, сойм, адміністрацыйныя органы). Яшчэ вялікакняскі двор Вітаўта знаходзіўся ў сталых вандроўках, а значныя дзяржаўныя і прыдворныя падзеі адбываліся ў Троках ці валынскім Луцку. Як сведчаць крыніцы, толькі за два месяцы (!) ў 1430 г. Вітаўт разам з дваром наведаў Варэну, Даўгаі, Алітус, Дарсунішкіс, Коўню і Трокі[8].

[8] Čapaitė R. The Everyday Life of Grand Duke Vytautas of Lithuania. According to Contemporary Correspondence // Lithuanian Historical Studies. 2003. № 8. P. 3–4.



Герцаг Карл Смелы прызначае службоўцаў і атрымоўвае вайскoвы статут. Вакол выяўленыя гербы зямель Бургундскага Дома. Мініяцюра Лівена ван Латэма (*Lieven van Lathem*), 1475 г.

Ідэя разгалінаванай сеткавай імперскай сталіцы, функцыі якой размеркаваны паміж рознымі гарадамі і лакальнымі цэнтрамі, што становіцца нагэтулькі папулярнай у нашы дні, дасталася еўрапейцам з іх традыцыйнай спадчыны. Гэта яшчэ адзін гучны выклік Традыцыі мадэрным ідэям нацыянальнага ўнітарызму і каланіяльнага цэнтралізму, ужо паспяхова рэалізаваны ў Еўрапейскім Звязе, дзе розныя адміністрацыйныя і кіроўныя органы размеркаваны паміж Бруселем, Страсбургам, Люксембургам, Парыжам і іншымі гарадамі. Парадаксальна, але ў крывым люстэрку ўсходнееўрапейскіх нацыяналізмаў нават гэты цудоўны вопыт нашых продкаў замест карысці прынёс чарговыя непаразуменні, перавернуты з ног на галаву дзеля



Адзін з трох г. зв. Чорных Часасловаў герцагаў бургундскіх. Скрыпторый Віллема Врэланта (*Willem Vrelant*), каля 1475 г.

бессэнсоўных і непісьменных спрэчак вакол Кярнавы, Варуты і Наваградка як «першый сталіцы ВКЛ»...

Так паўставала Вялікая Бургундыя. Яе каштоўны вопыт, зразумелы яшчэ Філіпам Добрым і пазней атрыманы ў спадчыну Габсбургамі, азначаў, што толькі бяскроўныя дынастычныя набыткі могуць закласці трывалы падмурак праўдзівай імперскай велічы, а вайна служыла толькі іх абаронай. Змяняліся ўладары і дынастыі, але сутнасць такога гаспадарства грунтавалася на непахіснай звышідэі вечнай Імперыі. Герцаг Філіп III нібы прадбачыў трагічны, у чымсці ахвярны лёс свайго недальнабачнага сына, сваёй сям'і, крыві. Нібы ён рыхтаваў гэты велічны праект не для сябе і сваіх нашчадкаў, а для новай дынастыі, для вечнасці. Мажліва дзеля гэтага Філіп Добры нагэтулькі шмат увагі надаваў мецэнацтву, вялікім візуальным рэчам, якія сталі сапраўдным мастацкім скарбам.

Яго ж чыннасці належыць і стварэнне ў 1430 г. знакамітага Ордэна Залатога Руна, вакол якога згуртавалася бліскучае рыцарства Бургундыі, — ці не самага прэстыжнага еўрапейскага прыдворнага рыцарскага ордэна, традыцыю якога ў свой час працягвалі аўстрыйскія Габсбургі, а ў нашы дні і гішпанскія Бурбоны. Варта заўважыць, што ідэя ордэну паўстала на міфалагічным падмурку правадыра арганаўтаў Ясона і рыцараў круглага стала караля Артура. Ордэн, заснаваны ў гонар сваёй трэцяй жонкі Ізабэлы Партугальскай, якой Філіп Добры прысвяціў і ўласны рамантычны рыцарскі дэвіз *Aultre naray tant que je vive*[9]. Сваю ж міфалагізаваную генеалогію герцагі вывелі ад Геракла. Храніст Аліўе Дэламарш, звяртаючыся да аўтарытэта Дзіядора Сіцыйлійскага, зазначыў, што па дарозе ў Іберыю Геракл, нібы праяжджаючы праз Бургундыю, палюбіў даму Алісію і ажаніўся з ёй, пачаўшы такім чынам дынастыю герцагаў. Сюжэты з жыцця Ясона і Геракла былі змешчаны на габеленах, якія аздаблялі рэзідэнцыі Філіпа Добрага.

Бургундыя набыла статус новага імперскага арыенціра ў час, калі прэстыж колішняй кароны Атона Вялікага быў моцна падарваны папярэднімі грамадзянскімі войнамі ў Імперыі. Філасофію пераасэнсаванай стваральнай дынастычнай архітэктуры на трансфармаваным феадальным грунце было наканавана пераняць ужо новай дынастыі, якая акумулявала ў сваіх руках і пасад Святой Рымскай імперыі.

Відавочна, што гаспадарства Бургундскага Дома нездарма сфарміравалася на восі даўняй еўрапейскай духоўнай, эканамічнай і палітычнай метраполіі — багацейшых рэйнскіх земляў ад Фландрыі і Галандыі да паўночных кантонаў Швейцарыі. Пас адніх з самых шчыльна заселеных еўрапейскіх тэрыторый, буйных гарадоў, цэнтраў гандлю і тэкстыльнай вытворчасці, рамесніцтва, урадлівых глеб і паспяховых аграрных рэгіёнаў (кшталту Люксембурга і Бургундыі). Яшчэ адна загадкавая крыніца бургундскай ідэі, якая сілкавала шэраг імперскіх і псеўдаімперскіх праектаў, як у духоўным, гэтак і ў эканамічным плане. Колішняя перыферыя Рымскай імперыі, што пакінула тут безліч антычных артэфактаў, а таксама *Lex Romana*, на традыцыях якога грунтавалася права ўсяго Лацінскага свету. Гэта колішні цэнтр імперыі Карла Вялікага, у самай непасрэднай блізкасці Аахена, сакральнага месца каранацыі імператараў, дзе ў катэдры (уласна і Аахен па-французску Экс-ла-*Шапель*) цягам стагоддзяў захоўваліся і захоўваюцца да нашага часу іх рэгаліі[10]. Крыху пазней «бургундская вось» — важкі цэнтр дынастычнай імперыі Габсбургаў. Галоўная мэта геапалітычных памкненняў моцарстваў з праўдзівымі кантынентальнымі амбіцыямі, шчодра палітая крывёй еўрапейцаў: Францыі Караля-Сонца і Напалеона, нямецкіх *Kaiserreich*'у і нацысцкага «Трэцяга Райху».

Не выпадкова гэтыя землі сталі падмуркам новага імперскага праекту нашых часоў, Еўрапейскага Звязу, у выглядзе яго функцыянальных падвалін — Еўрапейскага аб'яднання вуглю і сталі (ECSC), створанага ў выцягнутым трохкутніку Бенілюкса-Нямеччыны-Італіі-Францыі ў 1952 г. Ідэя, нібы дынаміт закладзеная стагоддзямі раней бургундскімі гаспадарамі, нарэшце здэтанавала. Гэты еўрапейскі хрыбет зрабіў нешта проста фантастычнае ў цывілізацыйным вымярэнні, аб'яднаўшы вакол сябе народы і дзяржавы, самых заклятых ворагаў і праціўнікаў, якія ледзь не захлынуліся ў моры ўласнай крыві папярэдніх жахлівых войнаў сучаснасці.

[9] У мяне не будзе іншай да самай смерці (франц.).

[10] Прынамсі, тая частка, што не трапіла пасля ў Вену.

Другая сусветная з усімі сваімі жахамі, здавалася б, азначыла прадказаны заняпад Еўропы, чырвоным зарывам раскінуты над руінамі гарадоў і вёсак, а над святой зямлёй еўрапейцаў апусцілася жалезная заслона, якая зноў падзяліла іх на варагуючыя бакі. Да таго ж заставаліся боль і недавер нават на захадзе Еўропы — натуральныя вынікі двух страшэнных войнаў эпохі нацыяналізму. Свет застыў у чаканні ядзернага апакаліпсісу. Заставаўся хіба толькі спадзеў на *цуд*, увасоблены ў паданні пра вяртанне вечнага Імператара, які спіць і мусіць нарэшце прачнуцца ў часе такой небяспекі, — міф, уласцівы ўсім еўрапейцам ад Лісабона да Смаленска: Себасцьян Партугальскі, *Шарлемань* (Карл Вялікі), кароль Артур, Фрыдрых Барбароса, асілак Аж'е Ардэнскі (Хольгер Дацкі), святы кароль Іштван Вугорскі ці вялікі князь Вітаўт. Трыумф духа, крыві і зямлі, персаніфікаваны ў вобразе паўлегендарных для народнай свядомасці асобаў.

Для пасляваеннай Еўропы такім калектыўным выратавальнікам стала сама кроў працавітых еўрапейцаў шматэтнічных памежных Парэйнскіх земляў, колішняй Вялікай Бургундыі, якім было наканавана ўзняць свой край з руінаў, першымі адмовіцца назаўжды ад дэструктыўных ідэй папярэдняй эпохі і стаць новым імперскім цэнтрам, які здолее сабраць вакол сябе ўсе без вынятку еўрапейскія краіны. Імператар ужо прачынаецца і можа абудзіцца літаральна ў душы кожнага еўрапейца. Так будзе рэалізавана вялікая містэрыя Бургундыі.

Зараз выключная роля гэтага велічнага, заможнага, урбанізаванага рэгіёна ўвасабляецца ў канцэпцыі *Блакітнага Банана*[11], распрацаванай групай еўрапейскіх географаў на чале з Ражэ Брунэ ў 1989 г., — урбанізаванай метраполіі Еўрапейскага Звяза, што цягнецца ад Усходняй Ангельшчыны да Паўночнай Італіі, цэнтральнае месца ў якой бясспрэчна займаюць колішнія землі бургундскіх герцагаў. Гэта палітычны і эканамічны касцяк, вакол якога ўласна канцэнтруецца эканамічны і духоўны патэнцыял Еўраімперыі, з яго лепшай і самай інавацыйнай у свеце гаспадаркай, сістэмай сацыяльнай абароны, каласальнай ваеннай, палітычнай і дэмаграфічнай вагой.

[11] *Blue Banana* ці *European Megalopolis.*

Падобны прыклад з вельмі перспектыўным і калісь вельмі заможным мультыэтнічным рэгіёнам з багатай гісторыяй метраполіі колішняга велізарнага сярэднявечнага гаспадарства, які ў сучасных умовах мог бы стаць воссю аб'яднання для народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, зноў ператварыўся толькі ў нязграбнае поле супрацьстаяння мясцовых нацыянальных праектаў. Гаворка, натуральна, пра Віленшчыну, перакрэсленую праз самае сэрца абсурднымі палітычнымі і духоўнымі межамі. У сумнай усходнееўрапейскай рэчаіснасці «лепшая» будучыня для летапіснай Літвы — у гэтакім парэзаным стане застацца цэнтрам сучаснага хутарскога літоўскага, а таксама глыбокай перэферыяй варагуючых польскага, беларускага і расейскага нацыяналізмаў. Іншымі словамі, сапраўдная трагедыя і далёкасяжная стратэгічная параза як для саміх віленчукоў, так і для гэтых чатырох суседніх народаў.

Варта адзначыць, што яшчэ ў свой час бургундскія герцагі самі спрабавалі рэалізаваць імперскі патэнцыял падуладных ім земляў. Дасягнуўшы яшчэ пры Філіпе Добрым уражвальнай моцы і ўплыву, Бургундыя пачала высоўваць прэтэнзіі, што да вакантнай кароны Лотара I — трэцяга сярэдняга каралеўства, якое Карл Вялікі пакінуў аднаму са сваіх сыноў. Бургундскае гаспадарства якраз заняло значную частку яго тэрыторый і працягвала ўжо свядома пашырацца ў гэтым накірунку. Да таго ж калегія курфюрстаў заўжды магла аддаць перавагу бургундскаму герцагу і абраць яго імператарам, што прапаноўваў у 1460—1470-я гг. герцаг Карл Бургундскі Фрыдрыху III Габсбургу як умову магчымага шлюбу яго адзінай дачкі Марыі і сына эрцгерцага Максіміліяна, сына імператара. Яшчэ адна магчымасць: атрымаць у спадчыну французскую карону дзеля салічнага права, калі б скончылася асноўная каралеўская лінія Валуа (што здарылася, праўда, толькі ў 1589 г.)... Ці, іншымі словамі, адрадзіць імперыю Карла Вялікага, спалучыўшы *auctoritas* (сакральную метафізічную ўладу імператара) і *dominium* (непасрэдную палітычную ўладу і моц гаспадара).

Герцаг Карл Смелы, які ўзышоў на пасад у 1467 г. (*de facto* кіраваў з 1465 г.), быў нашмат менш прадбачлівы і асцярожны за свайго мудрага бацьку. Пачаўшы з задушэння

Двор герцага Філіпа III Добрага
прымае ўсходніх паслоў.
Карціна В. Геца, 1881 г.

Імператар Максіміліян I Габсбург са сваім сынам Філіпам Прыгожым, жонкай Марыяй Бургундскай, унукамі Фердынандам I, Карлам V і Людовткам II Вугорскім. Мастак Бернхард Штрыгель (*Bernhard Strigel*), першая чвэрць XVI ст.

паўстання ў Льежы, справакаванага Францыяй, і крывавага пакарання горада Дынана за абразу маестату з такой беспрэцэдэнтнай жорсткасцю, што тая ўразіла нават яго сучаснікаў, якія бачылі ў будзённасці шмат крыві і пакутаў. Карл узяўся рэалізоўваць маштабны бургундскі імперскі праект вельмі хуткімі, агрэсіўнымі і валявымі метадамі.

У 1469 г. эрцгерцаг Пярэдняй Аўстрыі Жыгімонт Габсбург за абяцанне вайсковай дапамогі супраць швейцарцаў і шчодрую грашовую суму з правам выкупу саступіў Карлу Паўднёвы Эльзас і частку аўстрыйскага Форарльбергу — землі, якія ўласна і прывядуць апошняга да згубы. Цяжка сказаць, наколькі гэта было тонкім палітычным разлікам самога Жыгімонта ці яго сваяка, які магчыма быў за яго спіной, — імператара Фрыдрыха III Габсбурга, вельмі таямнічай постаці ў гісторыі гэтага рода, фундатара новай дынастычнай імперыі і аўтара знакамітага габсбургскага акроніма *A. E. I. O. U.* Але менавіта тут, калі Бургундыя дасягнула каласальнай магутнасці, капрызная Фартуна пачала пакрысе змяняць герцагу.

У 1473 г. Карл Смелы атрымоўвае герцагства Гельдэрн і спачатку нават угаворвае Фрыдрыха III Габсбурга нарэшце каранаваць яго ў Трыры «каралём Арля». Але непрыемна ўражаны пыхлівасцю герцага і яго абразлівымі паводзінамі, імператар таемна з'яжджае ўначы, назаўжды ўвозячы з сабой так і няспраўджаную мару Бургундыі. У адказ Карл зноў узняў свой меч і нападае на землі аднаго з курфюрстаў, кёльнскага арцыбіскупа, бярэ ў аблогу імперскі горад Нойс, дзе яго напаткала першая вялікая няўдача. Разззлаваны імператар прымае выклік, а яго кузен Жыгімонт Габсбург адмаўляецца ад хаўрусу з Карлам. Супраць вельмі жорсткіх і недальнабачных дзеянняў бургундскіх намеснікаў узняліся гарады Паўднёвага Эльзасу, а некаторыя ўвогуле імкнуцца далучыцца да *Eidgenossenschaft*, Швейцарскай канфедэрацыі, што актыўна ўцягвае швейцарскія кантоны, асабліва ваяўнічы Берн у барацьбу супраць памацнелай Бургундыі. За ўсімі імі стаяла падтрымка і грошы зламыснага караля Людовіка XI Французскага, трапна празванага *Сусветным павуком*.

Прадказальны Карл дзейнічае як заўжды рашуча, у 1474—1476 гг. пасылаючы супраць антыбургундскай кааліцыяй адну за другой велізарныя для свайго часу 10—30-тысячныя добраўзброеныя арміі з выдатнай сучаснай артылерыяй, якія воляй лёсу гэтак жа паслядоўна гінуць у прыальпійскіх землях у бітвах пры Эрыкуры, Грансоне і Муртэне. Нарэшце, фінальная сцэна гэтай трагедыі адбываецца пасля таго, як Карл ідзе ва-банк і вырашае акупаваць Латарынгію, ажыццяўляючы даўнюю мару бургундскіх герцагаў злучыць раскіданыя землі дынастыі на шляху да сваёй імперскай мары. Але гэты крок абсалютна супярэчыў уласна бургундскай ідэі збіральніцтва зямель пераважна мірным дынастычным шляхам і азначыў канец Бургундскага Дому; тады ад яго, відаць, адвярнуўся нават Гасподзь. Аблога латарынгскай сталіцы зацягнулася, і драматычная кропка была пастаўлена ў згаданай у самым пачатку бітве пры Нансі. Знявечанае страшнымі ранамі цела герцага Карла было апазнанае пасля бітвы з вялікай цяжкасцю. А яго пралітая кроў дала жыццё новай дынастычнай імперыі.

У сваім сінтэзе «Гісторыя Еўропы» Норман Дэвіс звязаў дзве трагічныя смерці ў Бургундскай дынастыі, якія прадвызначылі гістарычны лёс Еўропы і ўсяго свету:

Шмат гадоў пазней адзін манах дэманстраваў чэрап Жана Бясстрашнага Францыску I, каралю Францыі, і, як сведчаць, сказаў пры гэтым: «Вось адтуліна, праз якую ангельцы трапілі ў Францыю». Але гэтак жа слушна можна ўказаць і на бязглуздыя прэтэнзіі Карла Смелага: вось правал, цераз які Габсбургі трапілі ў Заходнюю Еўропу[12].

Чатыры гады пазней, на дзень св. Валянціна 1481 г. на Дыжон *«з неба паліў крывавы дождж»*. Як занатаваў у сваіх успамінах Жан Лудзін, адзін з тагачасных радцаў суседняга імперскага горада Безансона (што ў Франш-Кантэ), пяцццю тыднямі пазней гэта жахлівая азнака паўтарылася. У Дыжоне найбольш заліло тое месца, дзе новы гаспадар гораду Людовік XI загадаў закласці свой замак. Французскі кароль прадбачліва забараніў напужаным уражлівым месцічам неяк інтэрпрэтаваць гэтыя невытлумачальныя нябесныя з'явы...

Austria est imperare orbi universo[13]. Новы містычны пачатак, асвечаны шлюбам Марыі Бургундскай, дачкі Карла Смелага, і эрцгерцага Максіміліяна Габсбурга, нашчадкам якіх і было наканавана працягваць гэты вялікі імперскі праект. Імператар Максіміліян — апошні праўдзівы рыцар Еўропы, які гэтаксама, як і яго бургундскі папярэднік, згубіў войска ў 1499 г. у бітве са швейцарцамі пры Дорнахе (нарэшце пагадзіўшыся з іх фактычнай незалежнасцю). Менавіта Максіміліян, пад наглядам свайго кемлівага бацькі выдатна праштудзіраваўшы бургундскі вопыт, працягне гэтыя традыцыі, стварыўшы новы імперскі цэнтр, ідэю, двор, свой асаблівы *максіміліянаўскі* стыль мастацтва і нават кіравання. Адной з яго гібелінскіх мараў было ні больш ні менш аб'яднаць у сваёй асобе імператарскую карону і папскі пасад. Гэта ён будзе так зацята бараніць спадчыну сваёй жонкі ад французскай агрэсіі, што колішнія бургундскія жаўнеры Карла Смелага складуць песні пра свайго новага гераічнага водцу:

[12] Девис Н. История Европы. Москва, 2005. С. 312.

[13] Лёс Аўстрыі — уладарыць усім светам (лац.).

А дзе аўстрыйскі князь?
У Дольніх землях ён
І з ім яго пікардцы; яны ўжо многа дзён
Упрошваюць яго павесці іх у бой,
Каб Горнюю Бургундыю здабыць яму вайной[14].

Цягам наступных некалькіх стагоддзяў асаблівая *бургундская* ідэнтычнасць працягвала заставацца важнай складовай часткай самасвядомасці жыхароў Парэйнскіх земель ад Фландрыі і Пікардыі да перадгор'яў швейцарскіх Альпаў.

Разам з крывёй Аўстрыйскі Дом узяў бургундскую сімволіку, дух і, натуральна, Ідэю. Увасобленыя ў творах мастацтва, архітэктуры і іншых артэфактах, створаных з непасрэдным удзелам вядомых гуманістаў пачатку XVI ст. бургундскага паходжання, іх можна знайсці літаральна па ўсім свеце. Бургундскі крыж у прамым і пераносным сэнсе ўзняўся пазней над Бруселем, Інсбрукам, Венай, Прагай, Будай, Міланам, Неапалем, Палерма, Барселонай, Мадрыдам, Лісабонам, Мехіка, Лімай, Гоа і Манілай. Меў усе шанцы патрапіць у тым ліку ў Кракаў і Вільню. Сістэма гішпанскіх калоній у Новым свеце была арганізавана паводле традыцыйнай мадэлі, дзе былі свае *reinos*[15], а віцэкаралі традыцыйна падпарадкоўваліся каралю ў гішпанскай метраполіі, нібы ўладары Хрысціянскага свету імператару. *Plus Ultra* — дэвіз і адначасова духоўны кірунак імператара і гішпанскага караля Карла V, праўнука Карла Смелага, які мусіў аб'яднаць у планетарным бязмежжы *monarchia universalis* людзей усіх кантынентаў, любога паходжання і вызнання. Як пісаў Якаб Кёбель з Апенхайму ў сваім *Glaublische Offenbarung* (1532), *«нават паганцы, жыды і іншыя замежныя людзі ды народы»* — усе падданыя Імператара, які ёсць гаспадаром ўсяго свету.

Агрэсія Французскай рэвалюцыі, а потым і Напалеона была найперш накіравана ў кірунку колішняй Вялікай Бургундыі — нібы такім чынам была зроблена спроба назаўжды пазбавіцца гэтага містычнага апірышча еўрапейскай Традыцыі, нівеліраваўшы яго ў прасторы новастворанай французскай нацыі. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. у супрацьстаянні з гэтай навалай Габсбургі страцілі амаль усе колішнія бургундскія тэрытарыяльныя набыткі.

Але ідэя Бургундыі засталася і ўвасобілася натуральным чынам у іх прывабнай абноўленай імперыі, Аўстра-Вугоршчыне, а ў наш час пускае парасткі і ў самым сэрцы аб'яднанай Еўропы ў выглядзе імперскага стратэгічнага бачання, рэнесансу рэгіёнаў, пан-нідэрландскага бургундызму і г. д. Прынамсі, гэты каштоўны вопыт, які належыць яшчэ глыбока пераасэнсаваць і спасцігнуць новым пакаленням. Хаця б дзеля таго, каб зразумець, чым для Заходняй Еўропы была і ёсць Бургундыя і чым для нас, усіх жыхароў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы, так і не стала Вялікае Княства Літоўскае.

[14] З пікардскай вайсковай песні канца XV ст. Пераклад з французскай А. Ф. Брыля.

[15] Каралеўствы (гішп.).

Імператар Максіміліян I Габсбург на кані. Гравюра Ганса Бургкмайра Старэйшага, 1518 г.

НАЦЫЯ·І·ІМПЕРЫЯ

Джоржыё·Локі

Джоржыё Локі (1923—1992) — доктар права, італьянскі філосаф і музыказнаўца, markdown рознабаковы даследчык, называны «чалавекам Рэнесансу». Адмысловец у творчасці Ніцшэ, Хайдэгера і Вагнера. Зрабіў значны ўнёсак у станаўленне і развіццё еўрапейскай «новай правіцы».

Пераклад з італьянскай мовы Віталя Шпакоўскага.

Статуя рымскага імператара Траяна (98—117 гг.) на фоне збудаванага ім імператарскага форума (*Forum Traiani*)

ІДЭЯ НАЦЫІ Ў ФРАНЦЫІ, ІТАЛІІ І НЯМЕЧЧЫНЕ

Ніколі ў належнай ступені не звяртаецца ўвага на тое, што ёсць два спосабы «адчуваць», падсвядома разважаць аб ідэі нацыі, два спосабы, якія наўпрост вынікаюць з дыхатаміі, якая характарызуе гісторыю Заходняй Еўропы. Калі разглядаць нацыю як супольнасць, заснаваную на мове (і самой мовай), культуры ды «агульным лёсе», адразу стане відавочным, прыкладам, што ў выпадку з Францыяй нацыя была народжаная дзякуючы нялёгкай чыннасці дзяржавы, тады як у Нямеччыне або Італіі дзяржава вызначыла выйсце («традыцыю» ў палітычнай тэрміналогіі) нацыянальнай свядомасці, якая нарэшце абудзілася. Тое, што мы можам назваць «эфектам нацыі», процістаіць такім чынам «прычыне нацыі».

У французскім шасцікутніку, чые прыблізныя абрысы першымі накрэслілі рымляне ў часе свайго валадарання, розныя народы былі «напластаваныя» адзін на аднаго або размяшчаліся побач адзін з адным пасля распаду імперыі. Згадаем, што ў тую эпоху панятак *gentes* ‘народы’ недастаткова раскрываў сутнасць новых этнапалітычных рэальнасцяў і пакрысе вызваляў месца панятку *nationes* ‘нацыі’. Усе ведаюць, як пазней адна з гэтых «нацый», улучаных у шасцікутнік, нацыя франкаў, уціхамірыла іншыя

Пантэон — «храм усіх багоў» у Рыме, помнік культавай архітэктуры перыяду росквіту Рымскай імперыі, збудаваны ў II ст. пры імператары Адрыяне

ды асімілявала іх, навязваючы, часам гвалтам, сваю мову, сваё разуменне права і сваю культуру. Гэты працэс асіміляцыі завяршыўся не без «акалічнасцяў», якія і цяпер можна адчуць у сучаснай палітычнай рэальнасці Францыі. Тым не менш, відавочна, што даўнія нефранкскія «нацыі» ёсць цалкам прыватныя з любога магчымага палітычнага гледжання, нават пры ўсё яшчэ жывых фальклорных эманацыях, падабаецца гэта каму ці не. Бясспрэчна, групы прыхільнікаў аўтаноміі, або сепаратысты, не могуць уявіць аўтаномію для сваіх этнасаў у перспектыве захавання сучасных дзяржаваў (то бок пры існым міжнародным палітычным парадку), і таму змушаныя адкідваць гэтую ідэю ў перспектыве агульнаеўрапейскай паводле адных або ўніверсальнай паводле іншых.

Не ўсведамляючы ў поўнай ступені, яны, гэткім чынам, прызнаюць, што папраўдзе не могуць быць адрозныя, адасобленыя ад Францыі, апрача таго выпадку, калі ў свеце больш не будзе Францыі, як, зрэшты, і Англіі, Італіі, Нямеччыны, Бельгіі або Нідэрландаў.

Калі зараз звярнуцца да выпадку Нямеччыны або Італіі, то заўважым, што гістарычная панарама, паўсталая перад нашым позіркам, ёсць зусім іншай, адрознай ад супярэчлівых асаблівасцяў французскай рэальнасці. Франкскія каралі валодалі ў пэўным сэнсе «перагорнутай» палітычнай спадчынай рымлянаў. Аддзяліўшыся ад Імперыі, пачынаючы з 843 году (падпісання Вердэнскай дамовы), яны адкінулі імперскую ідэю, каб прысвяціць сябе задуманай справе перабудовы паводле франкскай мадэлі ўсіх этнапалітычных рэальнасцяў, улучаных тады у склад Францыі. Такім чынам, сцвердзілася тое, што можна назваць *regnum* ‘каралеўства’: палітычная ўлада больш фарміравала не нацыі (узятыя ў межах Імперыі), а класы, створаныя больш-менш

з «народнасцяў», але якія мелі хутка страціць памяць пра сваё паходжанне. Па той бок Вагезаў[1], сярод немцаў, наадварот, гэтаксама як і ў Італіі, ідэя *imperium* працягвала існаваць, турбаваць сэрцы і панаваць ва ўсіх палітычных ідэях.

Варта зацеміць, што гэтая ідэя не мела тады нерэалістычнага характару. Святая Рымская імперыя Нямецкай Нацыі (*Heiliges Romisches Reich Deutscher Nation*) не была паўторам ранейшага, хаця імперская ідэя ўсё яшчэ мела досыць сілы для таго, каб навязваць ідэнтычную «структуру» лёсу народаў, якія яе падтрымлівалі. У яе ўлонні на аснове даўніх народаў сфарміраваліся іншыя, але яны ніколі не прэтэндавалі на праўдзівую палітычную свядомасць, бо імперская ідэя, спадкаваная ад Рыму, процістаяла гэтаму. Прыкладам, Дантэ, для якога італьянец як чалавек сцвярджаецца праз мову і культуру, усяляк бараніў правадыра, то бок Імператара Святой Рымскай Імперыі, немца з паходжання. Дантэ, як прыхільнік імператара, застаючыся пры гэтым фларэнтыйцам, бачыў у сваіх суседзях-пізанцах «ганьбу народаў». Для яго Італія ёсць нішто іншае, як *«цудоўная краіна, дзе гучыць слова «так»»*. Адпаведна, у тую эпоху гэта яшчэ ні Нямеччына, ні Італія, але толькі немцы і італьянцы.

Для таго, каб нарадзілася палітычная свядомасць гэтых народаў, патрэбнае было знікненне імперскай «візіі». Гэта тое, што выявілася павольна і непрыкметна па ходзе гісторыі, заўсёды жорсткай для тых, хто настойвае на сваім. Трыццацігадовая вайна, іншаземнае панаванне, якія зрабілі з Італіі крывавую арэну змагання, пазначаюць кульмінацыйныя моманты гэтага працэсу. Але гэтага недастаткова. Трэба было, каб знікла ці абрынулася ўсё, што было апазіцыяй Імперыі: найперш гэта была каталіцкая царква, якая выступала ўнутранай антытэзай Імперыі, таксама і каралеўства, якое было антытэзай знешняй. Яго скон у выніку рэвалюцыі 1789 году пазначыў завяршэнне асаблівай гістарычнай эвалюцыі Францыі і стаў таксама штуршком да з'яўлення рамантызму, які актыўна адрэагаваў на пашырэнне рэвалюцыйных ідэй (прынамсі, у Нямеччыне).

Народжанае праз абсалютнае адмаўленне ідэі Імперыі, каралеўства Францыя фактычна і безумоўна сцвердзіла перавагу адной нацыі над іншымі. Феадальная арыстакратыя германскага паходжання спачатку грала тут ролю, цалкам аналагічную той, што выконваў рымскі народ у нараджэнні грамадзянскай супольнасці. Але гэтая арыстакратыя праз немагчымасць увасабляць вярхоўную ўладу паступова страціла свае этнічныя абрысы і гістарычную свядомасць. Гэта быў досыць складаны працэс. Французская арыстакратыя была змушаная асімляваць арыстакратыю іншых народаў, улучаных у шасцікутнік. У выніку гэта ўзмацніла адцэнтравыя тэндэнцыі, якія спадарожнічалі спробам каралеўскай цэнтралізацыі. У гэтых абставінах каралі павінны былі змагацца са станам арыстакратаў або, прынамсі, процістаяць іх прэтэнзіям, нават калі гэты стан пачаткова быў адным з апірышчаў каралеўскай улады. Мы ведаем, што з гэтага атрымалася. Пасля таго як Людовік XIV канчаткова пазбавіў арыстакратыю яе паўнамоцтваў, палітычнай значнасці і ператварыў у паразітарны стан, дзякуючы спакусе залатой клеткі, якой быў двор Версаля, рэвалюцыя стала непазбежнай. Французская рэвалюцыя, па сутнасці, была перадусім антыарыстакратычнай, а затым ужо антыманархічнай. Не будзе перабольшаннем сказаць, што «вялікія дзеячы» 1789 году ўрэшце рэшт падштурхнулі да натуральнага завяршэння працэс, які французскія «сорак каралёў» развівалі стагоддзямі.

Паўстанне мяшанай французскай нацыі, якому паспрыяла рэвалюцыя, насамрэч паказала, *што* страціў прывеліяваны стан: разам са сваімі абавязкамі ён страціў сваё апраўданне. Гэта прывяло да з'яўлення канцэпцыі нацыянальнай дзяржавы, якая поруч з рэвалюцыйнымі войнамі пакрысе апаноўвала свядомасцю еўрапейскіх народаў. Урэшце сфарміраваная ці, дакладней, створаная дзяржавай, французская «нацыя» магла цяпер прэтэндаваць на валоданне гэтай самай дзяржавай. Гэтак узнікла французская рэспубліка.

Перад аблічам народжанай французскай нацыі (пагатоў яна стала заваёўніцай пры Напалеоне) народы Еўропы, атрымаўшы прызнанне ў якасці нацый, вядома, захацелі гэтак жа ўвасобіць сваю дзяржаву. У Нямеччыне і Італіі гэты палітычны рух за

[1] Горны масіў на паўночным усходзе Францыі, які складае заходнюю мяжу Верхнерэйнскай нізіны. — Зацем перакл.

«незалежнасць» і «нацыянальнае адзінства» у ідэйным сэнсе быў збянтэжаны рамантызмам. Праз тое, што гістарычная спадчына тут істотна рознілася ад французскай, многія італьянскія і нямецкія рамантыкі ўспрынялі нацыю і права нацыі на самавыяўленне адносна дзяржавы ў форме, радыкальна адрознай ад французскай канцэпцыі. Існавалі, вядома, рамантыкі (італьянскія і нямецкія), якія пераймалі французскія ідэі гэткімі, як ёсць, або таму, што яны выводзілі хрысціянскую эгалітарную свядомасць на больш высокі ўзровень.

Відавочна, што гэта зусім не той рух, які мы тут абмяркоўваем, гэта не той карэнны італьянскі і нямецкі рамантызм, што вызначыў ажно да першай паловы XX ст. «паралельны лёс» народаў. Нацыя, створаная французскай рэвалюцыяй ёсць дэмакратычнай, пераважна цэнтралісцкай, эгалітарнай і «антыкласавай», нават калі яе эгалітарызм і «антыкласавасць» не знайшлі свайго адлюстравання ў законе. Наадварот, нацыя «рамантыкаў» (возьмем гэты тэрмін у вузкім сэнсе, пра які мы казалі вышэй) сама па сабе не ёсць ані эгалітарнай, ані дэмакратычнай, ані цэнтралісцкай.

З гледзішча «рэвалюцыйнай» логікі, любая нацыя мае роўныя правы з іншымі. Але ўсё па-іншаму ў канцэпцыі італьянскага або нямецкага рамантызму, і нават у мове адчуваецца адрозненне (там, дзе французы казалі пра нацыю, немцы хутчэй згадалі б *Volk* ‘народ’). І таму клірык Вінчэнца Джаберці[2] гучна абвяшчае аб перавазе італьянцаў, тады як Ёган Готліб Фіхтэ[3] ўхваляе ўнікальнасць нямецкага народу ў свеце, у якім не засталося нікога, апрача масаў.

Усё гэта тлумачыцца досыць лёгка. У Францыі пераход ад панятку Імперыі да каралеўства фактычна азначаў пэўнага кшталту «звужэнне» геаграфічнага і ментальнага далягляду. Непазбежным вынікам гэткага сыходу ў сябе стала «самотная Францыя». І за больш-менш працяглы тэрмін гэта вяло да прызнання роўнасці з іншымі народамі, з усім Іншым. З іншага боку, вернасць панятку Імперыі мусіла абавязкова весці да візіі праўдзівага «палітычнага космасу», што ўлучаў у сябе ўсе народы, але ў герархічным уладкаванні. У той час, калі нацыянальная свядомасць народаў крывава разгортвалася ў гісторыі Еўропы, Людвіг ван Бетховен узрушваў дух свайго часу, ствараючы дзівосную Дзявятую сімфонію, якая ёсць гімнам радасці ўсяго чалавецтва, чыя гісторыя стала глабальнай. Таксама Бетховен выкрэслівае прысвячэнне сваёй «Гераічнай» сімфоніі[4], калі Банапарт ператвараецца ў Напалеона, але, з іншага боку, ён зусім не ў стане ўявіць сабе песню наноў задзіночаных народаў у новым космасе без лідэра, які яго спараджае, узначальвае і арганізуе. Тут мы пазнаем дзве непарыўна звязаныя, «варожыя душы», якія жылі ўнутры рамантыкаў...

[2] Вінчэнца Джаберці (італ. *Vincenzo Gioberti*, 1801—1852) — італьянскі філосаф, дзяржаўны і палітычны дзеяч, святар; вядомы сваім змаганнем з псіхалагізмам у філасофіі і работамі, у якіх ён імкнуўся даць палітыцы філасофскае абгрунтаванне. — Зацем перакл.

[3] Ёган Готліб Фіхтэ (ням. *Johann Gottlieb Fichte*, 1762—1814) — нямецкі філосаф. Адзін з заснавальнікаў групы кірункаў і філасофіі, вядомай як суб'ектыўны ідэалізм, які развіўся з тэарэтычных і этычных работ Імануіла Канта; таксама пісаў работы з палітычнай філасофіі, дзеля чаго часта ўспрымаецца як бацька нямецкага нацыяналізму. — Зацем перакл.

[4] Сімфонія № 3 («Гераічная») — сімфонія Людвіга ван Бетховена. Пачаткова была напісаная ў гонар Напалеона, яго лёсу і гераічнай дзейнасці, але пазней, праз расчараванне ў палітыцы Напалеона, Бетховен выкрэсліў імя Напалеона з партытуры. — Зацем перакл.

ІНДАЕЎРАПЕЙСКІЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ СТРУКТУРЫ І РЫМ

Вернемся да рымскай ідэі *imperium*, а таксама да палітычнага перакладу, які мы тут прапанавалі. Першыя індаеўрапейскія супольнасці, пра якія мы ведаем, дзякуючы кампаратыўным даследаванням, характарызуюцца досыць відавочным, дзіўным кантрастам паміж суворай дысцыплінай, што існуе ўнутры падстаповай сацыяпалітычнай ячэйкі, «патрыярхальнай сям'і», клану, і досыць выяўленай тэндэнцыяй да анархіі для ўсяго, што тычыцца дачыненняў гэтых ячэек паміж сабой. Насамрэч, гэты кантраст, шчыльна звязаны з дынамікай індаеўрапейскай гісторыі, ёсць толькі сучаснай перспектывай. Сацыя-палітычная рэальнасць той далёкай эпохі (ранні неаліт), калі індаеўрапейцы выходзяць на арэну гісторыі, сапраўды ёсць рэальнасцю невялікай групы — клану. І дачыненні паміж кланамі падобныя паводле сваёй прыроды на тыя, што ўсталёўваюцца ў іншыя эпохі паміж гарадамі і дзяржавамі. Адсюль і ўражанне «анархіі», хутчэй ілюзорнае, калі прыняць пад увагу этнічнае адзінства індаеўрапейцаў і паспрабаваць высветліць, якім было іх грамадства.

Але тады не існавала індаеўрапейскага грамадства ў сучасным разуменні. Індаеўрапейцы не ўсведамлялі на сацыяпалітычным узроўні свайго адзінства, бо не мелі (і не маглі мець) усведамлення таго, што, паводле нашага меркавання, іх аб'ядноўвала.

Панарама
Рымскага форума
(*Forum Romanum*) —
цэнтра палітычнага
і эканамічнага жыцця
старажытнага Рыма,
захаванага
да нашых дзён

Трыумф імператара Марка Аўрэлія (161—180 гг.). Барэльеф з ніжняй часткі аркі Марка Аўрэлія ў Рыме

Гэтага ўсведамлення індаеўрапейцы маглі дасягнуць толькі паступова, калі ў пазнейшую эпоху яны сталі выходзіць са сваёй ізаляцыі ды спаборнічаць з іншымі этнасамі і культурамі. Зрэшты, гэты працэс адбываўся не без цяжкасцяў і амаль ніколі напоўніцу не завяршаўся. Вялікія саюзы «суперплямёнаў», сфарміраваныя ў звязку з міграцыямі і першымі пасяленнямі ў новых краінах сярод розных народаў, былі, як правіла, непрацяглымі ды мелі тэндэнцыю да распаду. Усталяванне каралеўскай улады, якая пачаткова забяспечвала арганізацыю і дысцыпліну племені цягам перасоўванняў (этымалагічна: кароль-*rex* — «той, хто паказвае шлях наперад»), мела выбарны і часовы характар. Калі яна, паводле сваёй прыроды намагалася ўмацавацца і стаць спадчыннай, дык заўсёды сустракала супраціў лідэраў кланаў пасля завяршэння заваёваў.

Менавіта з гэтай прычыны раннюю гісторыю індаеўрапейскіх перасяленцаў у іншых месцах часта блытаюць з павольнай дэградацыяй манархічнай улады і «рэатамізацыяй» супольнасці. У прыватнасці, гэтак здарылася з грэкамі і кельтамі. Але ў іншым месцы адбылася інстытуцыялізацыя манархіі коштам усёй індаеўрапейскай традыцыі (куль-

турнай і генетычнай). Гэтак было ў горадзе Нэса[5], які даў сваё імя хетам[6], а таксама ў некаторых германскіх плямёнах, якія вычарпалі свой патэнцыял на берагах Міжземнага мора.

Агулам, індаеўрапейскія народы напоўніцу спазналі патрэбу захавання самабытнасці, прымаючы наступствы пашырэння культурных і геапалітычных даляглядаў, што вынікала з поступу «неалітычнай рэвалюцыі». Але ў межах старажытнага свету толькі рымляне здолелі стварыць сінтэз паміж даўгавечнасцю, вернасцю сабе ды сваім караням і поўным разуменнем «касмічнай складанасці». Гэты сінтэз мае імя, выграviраванае ў гісторыі загалоўнымі літарамі — *imperium*.

Адразу папярэдзім, што панятак *imperium* не варта блытаць са словам *імперыя*, нават Рымскай. Няма ніякага сумневу ў тым, што праўдзівую сутнасць *imperium* ды найбольш поўную сваю рэалізацыю мы бачым у стварэнні Рымскай рэспублікі, а не ў спробах захаваць пост'юліянскую Імперыю. Насамрэч, *imperium* адлюстроўвае імкненне да касмічнага парадку, і менавіта ён арганізуе людзей герархічна. У тэорыі і практыцы *imperium* з'яўляецца антыподам якога-кольвек «універсалізму». Яго ні ў якім разе нельга разумець як нешта, што імкнецца звесці чалавецтва да аднаго і таго самага, але як тое, што імкнецца захаваць разнастайнасць у свеце, які няўхільна ідзе да аб'яднання.

Рымляне хацелі захаваць свае гарады, сваё *jus* 'права' (бо паводле свайго светагляду ўспрымалі ўсё праз звычай і права). Але гэтае іх імкненне да аўтэнтычнасці лагічна прыводзіла да патрэбы прызнання ўсяго Іншага. Менавіта ў гэтым заключаецца іх палітычная веліч, што, дарэчы, яны выдатна ўсведамлялі. І можна таксама сцвердзіць, што кампанія заваёваў для Рыма была толькі «аспектам» іншай кампаніі, чыста абарончай. Не варта забывацца, што слова *urbs* (лац. 'горад') мае індаеўрапейскае паходжанне і значыць яно «сховішча, абароненае ад вады». У свеце, дзе ў выніку неалітычнай рэвалюцыі народы выйшлі з ізаляцыі і ўваходзілі ў складаны комплекс шчыльных дачыненняў, рымскі *imperium* быў нічым іншым, як прагрэсуючым ростам абароненай прасторы ўласнага *urbs*. Узводзячы муры, за якімі рымскі грамадзянін быў упэўнены, што можа жыць паводле свайго рытму і свайго права ў той ступені, у якой іншыя дзеля патрэбаў ды ўзаемнасці карысталіся той жа гарантыяй.

Арганізацыйна і свядома адмаўляючы любы ўніверсалізм, любое *reductio ad unum* (лац. 'звядзенне да аднаго'), *imperium* ёсць палітычнай з'явай, то бок рэалістычнай, а не ўтапічнай. *Imperium* герархічны. Кожны тут захоўвае сваё *jus*, уласнае права: кожны народ мае права кіраваць сваім горадам паводле ўласных юрыдычных традыцый. Але ў дачыненнях, якія складваюцца паміж людзьмі з розных гарадоў, або паміж самімі гарадамі, *jus romanus* заўсёды пераважае над *jus latinus*, якое ў сваю чаргу, мае прыярытэт над усімі астатнімі. І там, дзе нельга карыстацца ні *jus romanus*, ні *jus latinus*, дзейнічае (прынамсі, павінна быць ужытае) *jus gentium* (лац. 'права народаў, міжнароднае права') — тыпова рымская абстракцыя для вызначэння агульных пастановаў у правах для ўсіх народаў. У межах *imperium* Рым мае абсалютную перавагу, якая развілася натуральным чынам, дзякуючы дасканалай юстыцыі, бо менавіта ён задумаў і арганізаваў гэты парадак, у якім кожны мае належнае ад Гісторыі, якая ёсць *fatum* (лёс).

У сваёй мастацкай мроі грэкі таксама намагаліся стварыць сінтэз паміж уласнай ідэнтычнасцю і фатальнай патрэбай ва ўдзеле ў «пашырэнні» свету, але пашырэнні толькі ў межах элінізму. У выніку яны намагаліся «прыручыць» вайну, ператвараючы прыродную агрэсію ў рытуал з дапамогай *агона* (арэны, спаборніцтва), які ахопліваў усе грамадзянскія праявы ў полісе. Алімпійскімі гульнямі яны ўсё адно хацелі, хаця б перыядычна, забяспечваць пан'элінскі парадак. І мір, усталяваны гэтым парадкам, у значнай ступені вынікаў з трыумфальнай пастаноўкі на агоне.

Гэтую элінскую мрою Рым перажыў і ажыццявіў ва ўсім свеце. Рымляне не «прыручалі» вайну. Наадварот, яны інстытуцыяналізуюць яе, ведаючы, што вайна — гэта ўсяго толькі адно з відовішчаў, што ўвесь час паўстае перад позіркам двухаблічнага Януса. Бо і мір, *pax romana*, таксама інстытуцыялізаваны. Гэта больш не гульня, якая дазваляе «прыручыць» вайну, але, наадварот, парадак унутры *imperium*, які ўзнікае ў выніку вайны, а таксама прызнанне прынцыпа вечнай вайны паміж народамі *imperium* і тымі, хто ёй

[5] Канес, Канеш, Неса, Неша — адзін з гарадоў Малой Азіі II тыс. да н. э., знаходзіўся на паўднёвым ўсходзе ад горада Хатусас (Хаці) на мяжы сучасных вобласцяў Ёзгат і Кайсэры ў Турцыі. — Зацем перакл.

[6] Індаеўрапейскі народ бронзавага веку, які жыў у Малой Азіі, дзе стварыў Хецкае царства; саманазва хетаў *Nesili* або *Kanesili* паходзіць ад назвы горада Неса. — Зацем перакл.

«Вусны ісціны» — антычная акруглая мармуровая пліта з выявай маскі Трытона (або Акіяна), датаваная IV ст. да н. э. і размешчаная з XVII ст. у царкве Санта-Марыя-ін-Касмедын у Рыме

яшчэ не належыць. І праз тое, што *imperium* уяўляе парадак, асвечаны фатумам, многія народы, урэшце рэшт, звяртаюцца да рымлянаў і просяць дазволу ўвайсці ў склад імперыі (за выняткам спробаў адмовы ад заключанай дамовы, прыкладам, калі галы звяртаюцца па дапамогу да Рыма супраць германцаў, а затым падымаюць паўстанне супраць парадка, якім яны ўжо карыстаюцца, зрэшты, безпаспяхова).

«*Regere imperio populos, Romane, memento / parcere victis ac debellare superbos*» (*«Ты ж, о рымлянін, памятай — дзяржаўна ўладарыць народамі; // Будзе ў гэтым мастацтва тваё, каб мір пашыраць // Літасць пакорным даваць і вайной скараць ганарлівых»)* — гэтак гальскі паэт Вяргілій вызначае місію, ускладзеную на рымлянаў. Вызначэнне нагэтулькі трапнае, што, калі Рым знікне, народы Еўропы адчуюць моцны сум па «рымскім парадку», і ўсяляк марна будуць намагацца яго ўзнавіць. Рым тады стане сінонімам «палітычнага ладу», а Цэзарам, імператарам назавуць носьбітаў суверэннай улады, адказных за падтрыманне парадку.

ЗАХАВАННЕ РАЗНАСТАЙНАСЦІ Ў НАДНАЦЫЯНАЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Можна было б запярэчыць, што *imperium* прывёў насамрэч да ўніверсалізму, да этнічнага хаосу, супраць якога ствараўся, і што ён змог пратрымацца ўсяго некалькі стагоддзяў перад тым, як прыйсці ў заняпад ды знікнуць. «*Orbi fecisti quod prius urbis*

erat» *(«Тое, што светам было, горадам стала адным»)* спяваў у гімне Рыму іншы кельцкі паэт, названы Руціліям Намацыянам[7], які жыў пры Ганорыі[8]. Паэт меў рацыю, але варта дадаць, што Рым, вядома, не хацеў гэтага. Усё ў гісторыі мае сваю меру. Нішто не ёсць вечным і абсалютным. Ідзецца пра волю схіліць гісторыю на свой бок, надаць ёй форму. За той кароткі дзень, што рымляне пражылі ў гісторыі, яны сцвердзіліся ў параўнанні з іншымі ды насуперак ім, рэалізуючы свой праект існага *imperium*. Яны рабілі гэта нагэтулькі доўга, колькі самі існавалі. Бо *imperium* прыходзіць у заняпад адно тады, калі няма саміх рымлянаў, калі «Рыму няма больш у Рыме».

Магчыма, не адразу было заўважна, што апошнія нашчадкі народу загінулі на палях боек, а мо і наадварот. Але гэта старанна хавалася. Рабілі выгляд, нібы верацьу тое, што называныя рымлянамі ўсё яшчэ былі імі насамрэч. Апошні з рымлянаў, мабыць, ведаў, што быў ім. Ён не зважаў на варты жалю падман заўтрашняга дня і навучыўся смяяцца над гэтым па-свойму, жорстка, з пагардай, але і са спагадай. Мабыць, калі ён узводзіў на пасад консула або сенатара свайго каня, ён непрыкметна казаў нам, што з таго моманту не стала больш праўдзівых рымлянаў і ўсе маглі быць імі...

Дзякуючы прамысловай рэвалюцыі чалавецтва ўвайшло сёння ў перыяд глабалізацыі. Ніводзін народ не можа пазбегнуць гэтай планетарнай перспектывы і мроіць аб ізаляцыі бессэнсоўна. Сусветны парадак ёсць абавязковым. Ён непазбежны ў больш-менш аглядным адрэзку часу. Вялікая палітыка будучыні не можа быць зразуметая і здзейсненая, калі не будзе мець на ўвазе тое, што Эрнст Юнгер[9] называў *Weltstadt* (ням. ‘сусветная дзяржава’), сусветны парадак у якасці матыву і мэты. Сімптомы ўжо праявіліся: Ліга Нацый, затым Арганізацыя Аб'яднаных Нацый — на ўзроўні ўтопіі; савецкая і амерыканская імперыі — на практыцы.

Але ўсё сведчыць пра тое, што Злучаныя Штаты, як і Савецкі Саюз, не могуць быць заўтрашнім Рымам. Гэтыя «блокі», якія, як могуць, намагаюцца арганізаваць абсяг наяўнай у іх, дзякуючы тэхнічнай рэвалюцыі, улады, нагадваюць хутчэй Егіпет часоў фараонаў і тэакратыі ўрадлівых земляў Паўмесяца[10]. Аднак фактам ёсць тое, што цяперашняяя глабалізацыя патрабуе касмічнага парадку. Ці будзе гэты парадак «імперскім» альбо «рэспубліканскім» у французскім сэнсе гэтага слова, то бок эгалітарным? Ніхто не можа прадказаць гэта, бо гістарычная прышласць застаецца вольнай. Мы можам хіба што браць на сябе абавязак у тым ці іншым сэнсе. Эгалітарнае вырашэнне, якое мае на ўвазе «Усеагульную Рэспубліку», азначае звядзенне чалавецтва да Аднолькавага, з'яўленне «ўніверсальнага тыпу» і глабальную стандартызацыю.

«Імперскае» вырашэнне, паўторым яшчэ раз, ёсць герархічным. Калі свабода ў эгалітарнай дыялектыцы ёсць абсалютам, які процістаіць іншаму абсалюту (адмаўленню свабоды), то ў «імперскай» дыялектыцы яна нішто іншае, як адноснасць, беспасярэдне звязаная з паняткам сацыяльнай адказнасці. У *imperium* абсалют — гэта права найлепшага ў адпаведнасці з культываванымі чалавечымі якасцямі. Але *imperium* — гэта таксама і адзіны спосаб захаваць адрозненні ў глабальнай перспектыве праз *unicuique suum* (лац. ‘кожнаму сваё’), што прызнае падставовы факт няроўнасці каштоўнасцяў і асобаў.

З вузка псіхалагічнага гледзішча непрыязнасць, якую маюць многія сепаратысты і рэгіяналісты да эгалітарнай «рэспубліканскай» ідэі, цалкам апраўданая. Аднак яны сур'ёзна падмануліся б, уяўляючы, нібы замены існага парадку на «ўніверсалісцкі» было б досыць для вырашэння іх праблемаў. Бо ўніверсалісцкая «Рэспубліка», распрацаваная дзеячамі 1789 году ёсць нічым іншым, як праваобразам на нацыянальным узроўні Сусветнай эгалітарнай дзяржавы, яшчэ большым механізмам ураўнілаўкі, чым той, што стварылі якабінцы[11].

[7] Клаўдзій Руцілій Намацыян (лац. *Claudius Rutilius Namatiānus*) — рымскі паэт і дзяржаўны дзеяч пачатку V ст., родам з Галіі, язычнік. Цытата з паэмы «Аб вяртанні на радзіму», лац. «*De reditu suo*»). — Зацем перакл.

[8] Флавій Ганорый Аўгуст (лац. *Flavius Honorius Augustus*, 384—423), першы заходне-рымскі імператар пасля падзелу імперыі на Заходнюю і Усходнюю, сын імператара Феадосія І. Яго кіраванне — перыяд трыумфу барбараў, пачатак распаду заходняй Рымскай імперыі. Пры ім готы захапілі і разрабавалі Рым. — Зацем перакл.

[9] Эрнст Юнгер (ням. *Ernst Jünger*, 1895—1998) — нямецкі пісьменнік, мысляр, адзін з галоўных тэарэтыкаў кансерватыўнай рэвалюцыі. — Зацем перакл.

[10] «Урадлівы Паўмесяц» — умоўная назва рэгіёну на Блізкім Усходзе, у якім у зімнія месяцы назіраецца падвышаная колькасць ападкаў, геаграфічна размешчаны ад Ніжняга Егіпту праз Палестыну да Міжрэчча. — Зацем перакл.

[11] Удзельнікі палітычнага клубу эпохі Вялікай Французскай рэвалюцыі, якія ўсталявалі сваю дыктатуру ў 1793—1794 гг. Атрымалі сваю назву ад клубу, што знаходзіўся ў дамініканскім кляштары св. Якуба. — Зацем перакл.

КАРНЭЛІУ КАДРАНУ. ЗМАГАННЕ І САМОТА

Герхард Петак

Герхард Петак — аўстрыйскі музыка,
аўтар *neofolk* і *martial industrial* праекту «Allerseelen»,
выдавец, вандроўнік, даследчык невядомых старонак
еўрапейскай гісторыі і культуры.

З ангельскай мовы пераклаў Аляксей Дзермант.

CIBEPIA

На здымку зправа налева: Карнэліу Кадрану, яго бацька Іон Кадрану і найлепшы сябр Іон Моца

Я слухаў велічную, змрочную прыгажосць, што сыходзіла з касетнага запісу старых спеваў ды маршаў. Адзінагалоссе сведчыла аб грамадзе, звязанай клятвай. Многія спевы мелі стрыманую, урачыстую атмасферу і перадавалі трагічны погляд на жыццё. У іх я адчуў рэха ваеннай эпохі, калі традыцыя і сучаснасць счапіліся ў смяротным ходанні. Гэтыя старыя запісы былі спевамі «Жалезнай Гвардыі», містычна-ваяўнічага рэлігійнага руху, які з'явіўся паміж дзвюма сусветнымі войнамі ў Румыніі ды існуе па сёння.

25 лютага 1992 г. Краявід рабіўся ўсё больш цямнейшым ды попельна-шэрым. Больш дэспатычным і пачварным. Я мінуў светлыя, вясёлыя фермы, якія ўбачыў з вакна цягніка пасля перасячэння вугорскай мяжы. Снег усё яшчэ ляжаў на зямлі, але шэры, падобны на вугаль. Пагоркі, палі, хаты станавіліся змрачнейшымі. Цягнік прыехаў у Копса Міцу, невялікае мястэчка блізу румынскага гораду Медыяш. Тут краявід паўстаў у суцэльнай чарноце, і я высветліў паходжанне гэтага агромністага ўсеабдымнага туману, які знішчыў усе колеры на колькі кіламетраў: дым і сажа цягнуліся з трубаў зусім збуцьвелага заводу. Гэта было валадарства Танатаса. Усё чорнае: дамы, хмызняк, нават лёд у барознах глебы. Апакаліпсіс. Манахромнасць. Завод быў на адным баку са станцыяй, а на іншым месціліся маленькія могілкі. Нават драўляныя крыжы былі чорнымі ад дыму і сажы. Прыступкі вялі да невялічкай, калісьці белай, царквы. У гэтым індустрыяльным змрочным краі, гэтай адзіноце, вырачанай на смерць, гэтай балючай цішыні, тыя маленькія могілкі здаваліся праявай ідыліі. Яны былі падобныя на вёску,

што выклікае адчуванне дому. Пасярод усяго гэтага безнадзейнага разбурэння рэальная смерць здавалася промнем надзеі, ачышчэннем, заспакаеннем. Паміж крыжоў гуляліся дзеці. Я зразумеў, чаму яны не рабілі гэта дзе-кольвек яшчэ. Малады румын сядзеў насупраць мяне. Ён адчуў мой жах. На ламанай нямецкай ён распавёў мне пра рэжым Нікалае Чаўшэску. Калі «Conducător»[1] меўся наведаць гэты раён, платы і фасады дамоў, праз якія ён праязджаў, наноў фарбавалі. Чорныя хмызнякі і дрэвы апырсквалі зялёнай фарбай. Заводы спыняліся на некалькі гадзінаў… Пасля таго як ён з'язджаў, трубы аднаўлялі свае выкіды, вывяргаючы ў наваколле цяжкія металы, душачы штодзённае жыццё вяскоўцаў анеміяй і свінцовай атрутай. Павольна цягнік пачаў рухацца. Мне было цяжка пазбыцца ўражання ад гэтага краявіду, дзе згубілася жуда смерці.

Абраз Арханёла Міхаіла з турэмнай капліцы ў Вакарашці

У Брашаве я сыйшоў з цягніка. У кнігарні знайшоўшы зялёную кнігу, работу Карнэліу Кадрэяну «Eiserne Garde» («Жалезная Гвардыя»), пачаў чытаць яе цягам майго знаходжання ў Румыніі. З захапленнем я чытаў жыццяпіс высакароднага і адважнага чалавека, які напаткаў смерць за свае пераканнані.

Карнэліу Кадрану нарадзіўся 13 верасня 1899 г. у Ясах[2], горадзе на паўночным усходзе Румыніі. Ён скончыў ваенную вучэльню, а калі яму было сямнаццаць год пайшоў на фронт у Карпацкіх гарах змагацца поруч з бацькам. Увосень 1919 г. пачаў вывучаць правы. У 1922 г. паехаў у Нямеччыну вывучаць эканоміку ў Берліне, але неўзабаве вярнуўся на радзіму, якая падобна да Нямеччыны ды многіх іншых краінаў стала полем бітвы паміж левымі і правымі сіламі. Карнэліу Кадрану быў чалавекам веры, які з самага юнацтва змагаўся супраць панцырнага матэрыялізму (*Panzermaterialismus*), што найбольш быў сканцэнтраваны ў камунізме. Перастрэлкі паміж варагуючымі бакамі адбываліся ўвесь час.

Разам са сваім таварышам Ёнам Моца ён абвясціў вайну супраць карупцыі, злачынных палітыкаў і бізнэсоўцаў для таго, каб спыніць іхныя махінацыі супраць румынскага народу. Колькі маладзёнаў таксама далучыліся да іх. У пачатку кастрычніка 1923 г. іх арыштавалі. Нехта здрадзіў. Іх дапытвалі паасобку. Кадрану не быў пэўны, альбо адмаўляць усё, альбо настойваць на сваім. Ён вырашыў быць абсалютна шчырым і прызнаць, што яго група планавала забойствы і забастоўкі, скіраваныя супраць розных вайсковых і палітычных установаў.

Іх адправілі ў турму Вакарашці блізу Бухарэста, якая раней была кляштарам. Кадрану часта маліўся ў турэмнай капліцы, дзе знаходзілася ікона арханёла Міхаіла. Кадрану быў глыбока ўражаны гэтым святым рыцарам, што з узнятым мечам бароніць ад цмока.

Панцырны матэрыялізм (Panzermaterialismus) — слова, якое я вынайшаў. Гэты тэрмін выкарыстоўваецца для камуністаў, што заваёўваюць свет не праз ідэалогію, але праз сілу танкаў. Панцырны — значыць танкавы. Гэта метафара ўжываецца для брутальнага капіталізму/матэрыялізму.

[1] Рум. *conducător* 'лідэр, правадыр'. — Заўвага перакл.

[2] Насамрэч Карнэліу Кадрану нарадзіўся ў г. Хушы гістарычнай воласці Малдова. — Заўвага перакл.

Ніколі раней я не захапляўся нагэтулькі прыгажосцю іконы святога, але я адчуваў абавязаным гэтай выяве ўсёй сваёй душой. Святы арханёл здаваўся жывым. Я палюбіў гэты абраз (Alexandra von Randa. Lebende Kreuze).

Гэтак саспеў план стварыць ваенізаванае згуртаванне веры, у якім спалучыліся містычная і вайсковая якасці арханёла. Яно будзе названае *Legiunes Achanghelul Mihail* («Легіён Арханёла Міхаіла»). Мастак, які сядзеў разам з Кадрану, зрабіў некалькі копій для яго. Адгэтуль Кадрану заўжды насіў з сабою маленькую іконку арханёла.

У канцы сакавіка 1924 г. распачаўся судовы працэс. Зноў яны ва ўсім прызналіся. Але праз тое, што ніводзін з іх планаў не ажыццявіўся, яны былі апраўданыя. Карнэліу Кадрану вярнуўся ў Ясы з двума рознымі выявамі арханёла. Большая выява была асвечаная ды змешчаная на алтар у бажніцы св. Спірыдона. Але праз колькі дзён яны зноў мелі сутыкненне з паліцыяй. У траўні таго ж году Кадрану разам з таварышамі пачаў будаўніцтва ўласнага дому ў мястэчку Унгені. Праз некалькі тыдняў салдаты і паліцыя атачылі будынак і арыштавалі іх. У часе перамоваў многіх з іх жорстка збівалі. Бацькі і выкладчыкі студэнтаў-прыхільнікаў Кадрану засведчылі катаванні ў дактароў і склалі дэкларацыю супраць неапраўданага гвалту.

Кадрану сышоў у горы Рарэу блізу Чымпулунга на некалькі тыдняў, вырашаючы, ці працягваць сваё змаганне у Румыніі, ці пакінуць краіну. У гарах ён жыў у збудаванай уласнаруч з галля хаціне, пастухі прыносілі ежу. Пакідаючы горы, ён прыняў рашэнне, і адгэтуль з ім заўсёды быў зараджаны пісталет, гатовы для выкарыстання, калі б хтонебудзь намагаўся стаць упоперак ягонага шляху.

У кастрычніку 1924 г. ён выступіў у якасці юрыста аднаго са сваіх катаваных таварышаў. У зале судовага паседжання знаходзіліся шэф паліцыі Манчыу ды некаторыя яго падначаленыя, адказныя за жорсткія допыты і катаванні. Кадрану застрэліў шэфа і параніў двух паліцыянтаў, і праз гэта зноў быў увязнены. Нават ягоны бацька і шмат хто з сяброў таксама былі арыштаваныя. Да Калядаў амаль усе былі вызваленыя, але Кадрану адзін заставаўся ў турме. Была суворая зіма. Сівер завіваў снег у камеру праз шчыліны ў дзверах і вокнах. У вязніцы Кадрану быў да траўня 1925 г. За гэты час ён набыў шмат прыхільнікаў у народзе, ягоны учынак зрабіў яго знакамітым. Тысячы юрыстаў з усёй Румыніі былі гатовы бараніць яго ў судзе. 20 траўня 1925 г. адбыўся судовы працэс. Карнэліу Кадрану быў апраўданы. Ён адмовіўся ад паслуг адвакатаў і бараніў сам сябе. На вуліцах яго вітаў натхнёны натоўп.

24 траўня 1927 г. Кадрану разам з пятнаццаццю блізкімі таварышамі засноўвае «Легіён Арханёла Міхаіла» — духоўны рух, які злучыў змаганне і ўсамотненасць, ініцыятыву і ініцыяцыю. Народніцкі дух і хрысціянскі містыцызм стварылі стрыжань, вайсковы этас, які меў ідэалам змагарнага арханёла. Вера, любоў, самаахвярнасць, справядлівасць, шчырасць, гонар, таемнасць — складалі падставовыя прынцыпы арганізацыі. Легіён увасабляў жалезны этас, які меў вялікае падабенства з каштоўнасцямі сярэднявечнага рыцарства, дактрынай стараіндыйскай Бхагават-Гіты і бусідо японскіх самураяў: кшатрыйскі характар, культавы, ваяўнічы псіхічны настрой, містычна-вайсковы авангард. Для легіянераў іх вайна супраць панцырнага матэрыялізму і ўсіх светапоглядаў, якія ўзвышалі матэрыю над духам, была чынам веры. Яны хацелі пераўзысці свет. Кадрану ў сваіх запісах часта казаў, што не важна, ці перамогуць яны, ці прайграюць, найважнейшым было тое, што яны дзейнічалі з жалезным адзінствам.

8 верасня 1927 г. дваццаць шэсць легіянераў упершыню прысягнулі свайму згуртаванню. Кожны з іх прынёс жменю зямлі з розных рэгіёнаў краіны. Карнэліу Кадрану злучыў зямлю і ўрачыста напоўніў ёю невялікія скураныя мяшэчкі. Гэтая «зямля продкаў» стала таксама найменнем газеты, заснаванай Легіёнам. Адгэтуль яны трымалі гэтыя мяшчэкі пад зялёнымі кашулямі, якія сталі ўніформай легіянераў.

Ад самога пачатку яны падкрэслівалі, што іх рух не мае нічога супольнага з палітыкай. Яны ўтварыліся як сакральная супольнасць, а не партыя, менавіта таму ў іх і не было праграмы. Яны не хацелі іншай праграмы, апрача паклікання да дзеяння

ў якасці кузні духоўнай зброі, дзе мае быць створаны новы чалавек, які развівае псіхічна-духоўныя сілы. Святая вайна, якую вялі легіянеры пачыналася з саміх сябе. Для таго каб пераўзысці асабістыя заганы, яны крытыкавалі памылкі і слабасці адзін аднаго. Іхнай мэтай было ачышчэнне сябе, узыходжанне да ўзроўню арханёльскай душы, да рыцара Міхаіла. Імкненнем Кадрану было абнаўленне Румыніі і наданне высокародства яе жыхарам. Ягоная канцэпцыя народу як нацыі была адрозная ад звыклага разумення гэтага слова. Народ зазнае росквіт тады, калі становіцца адзіным і змагарным. Нават калі ўсяго некалькі асобаў рэалізуюць гэтыя прынцыпы, яны, насамрэч, і складаюць народ. Меркаванне большыні не ўлічваецца. Кадрану быў таксама невысокага меркавання пра дэмакратыю. Яму здавалася бессэнсоўным абіраць палітыка, гэтаксама як абіраць пілота для самалёта. Яму не падабаліся шматлікія непатрэбныя прамовы, фальшывыя абяцанні, крывадушнае стаўленне, пустыя словы палітыкаў, і ён не хацеў, каб яго легіянеры збіралі грошы для арганізацыі або хадзілі ў людзі, раздаючы прапагандысцкія брашуры. Легіянеры не гандлююць сваёй верай. Іхны шлях быў у стрыманым, самотным дзеянні. Кадрану адрынаў любыя ілжывыя выбары. Ягоная ўлада грунтавалася на цішыні. Мабыць, ён ведаў дэвіз сярэднявечнага чараўніцтва: «Ведаць. Жадаць. Рызыкаваць. Маўчаць».

Мы жывем у час, калі грошы ўсемагутныя. Але для змагання і перамогі легіянераў грошы і матэрыя не маюць значэння. Праз наш дзёрзкі чын мы парываем з ментальнасцю, якая пануе ў цяперашнім свеце. Мы забіваем свет унутры нас ды замяняем яго ўзвышаным светам, які сягае зораў. Абсалютызм матэрыі зрынуты. Замест яго мы ўсталёўваем валадарства духу і этычныя каштоўнасці. Мы не адмаўляем ані існавання, ані мэтазгоднасці, ані патрэбы матэрыі ў гэтым свеце, але мы адмаўляем ёй у праве на абсалютную ўладу і заўжды будзем адмаўляць гэта. Вычварэнне натуральных адносінаў матэрыі і духа забіла ўсе сілы, усю веру і надзею ўнутры нас (Corneliu Zelea Codreanu. Eiserne Garde).

Канцавы стан, які быў мэтаю легіянерскай грамады, — удасканаленне духоўнага свету і аднаўленне фізічных ды маральных якасцяў румынскага народу. Сістэма карысці і камфорту, матэрыяльнага ўзбагачэння і тэхнічнага прагрэсу застаецца падпарадкаванай мэтай. Канцавая мэта камуністычнага грамадства заключаецца збольшага ў стварэнні гэткай сістэмы матэрыяльнага жыцця. Яно беспрынцыпна і бязлітасна імкнецца стварыць усё дзеля высокатэхнічнага прагрэсу, які дазваляе матэрыяльнае задавальненне і бясконцую вытворчасць (Alexandru Cantacuzino. Zwischen der Legionärswelt und der kommunistischen Welt).

Гэткая строгая духоўнасць рабіла «Легіён Арханёла Міхаіла» рэзкай апазіцыяй да ўсяго атачэння. Тым не менш усё больш і больш маладзёнаў далучалася да грамады, якую не прыймала большыня румынскіх святароў, нягледзячы на яе хрысціянскі містыцызм. Улады таксама не давяралі руху. Яны ўважалі іх сустрэчы, ціхія маршы, публічныя выступы, творы, чыя народніцкая рэлігійнасць мела вялікую прыхільнасць сярод людзей, за пагрозу грамадскаму парадку.

Урад пачаў ставіцца з яшчэ большай засцярогай да гэтай небяспекі, калі Кадрану вырашыў злучыць духоўны шлях з палітычнай актыўнасцю, стварыць сінэргію ініцыятывы ды ініцыяцыі. Кадрану заснаваў «Жалезную Гвардыю» ўвесну 1930 г. Легіён стаў часткаю гэтага новага руху. Разам з таварышамі ён ездзіў ад вёскі да вёскі. Яны насілі зялёныя кашулі і пандурскія шапкі[3] і часта неслі з сабою вялікі драўляны крыж, калі наведвалі вёску. Яны не давалі абяцанняў і не абвяшчалі праграмаў.

Мы не абяцаем грошы, алкаголь і пасады, мы не купляем чалавечыя душы за грошы. Легіянерскі рух нічога не абяцае і не прапануе спакусаў (Corneliu Zelea Codreanu. Eiserne Garde).

Чым больш людзей пачало верыць у «Жалезную Гвардыю», тым больш падазронай, больш жорсткай станавілася рэакцыя афіцыйных уладаў. Сутыкненні і бойкі здараліся ўсё часцейшымі. Улетку 1930 г. газеты Легіёну «Legiunes Arhanghelul Mihali» і «Garda de

[3] Пандуры пачаткова — ў XVIII ст і да пачатку XIX ст. іррэгулярныя пешыя наёмныя войскі ў Аўстрыйскай і расійскай імперыях, пазней ў некаторых дзяржавах пандуры выконвалі паліцэйскія функцыі. — Зацем перакл.

Карнэліу Кадрану з жонкай Аленай

Fier» былі ўпершыню забароненыя. Кватэры і дамы абшуквалі на прадмет зброі і прапагандысцкай літаратуры пасля таго, як уладальнік бухарэсцкай газеты, які неаднойчы і рэзка атакаваў «Жалезную Гвардыю», быў застрэлены. У пачатку 1931 г. Кадрану ды іншыя легіянеры былі ўвязнены і зноў іх адправілі ў Вакарашці. Ікона Арханёла ўсё яшчэ вісела на сцяне турэмнай капліцы. Пасля трох месяцаў зняволення іх вызвалілі.

Чым больш на нас ціснуць цяжкасці, чым больш удараў і выпрабаванняў вітае нас з усіх бакоў, тым больш непахісна мы стаім перад абліччам і пад абаронай боскага пераможцы, Арханёла Міхаіла, пад грымотамі ды ў ззянні ягонага мяча. Для нас ён ужо не

мёртвая выява. Для нас ён паўстае жывым і магутным. Мы адчуваем ягоны дух у нашым згуртаванні. Удзень і ўночы мы нясем варту перад яго іконай ды яго ззяючым мечам (Corneliu Zelea Codreanu. Eiserne Garde).

У войнах перамагаюць тыя, хто разумее як зачароўваць таемныя сілы нябачнага свету з паветра, з нябёсаў і хто можа дамагчыся іхнай падтрымкі... Калі гэтыя сілы зачараваныя, яны дапамогуць вам, дадуць вам адвагу, яны ініцыююць вашую перамогу. Яны насылаюць паніку ды жах на вашых ворагаў і паралізуюць іх дзеянні. Урэшце рэшт, перамога залежыць не ад матэрыяльнай падрыхтоўкі і матэрыяльных сілаў ваенных лідараў, але ад іх здольнасці дамагчыся дапамогі духоўных сілаў (Alexandra von Randa. Lebende Kreuze).

Часта паўтараныя словы Карнэліу Кадрану пра тое, што легіянеры абыякавыя да таго, ці выйграюць яны, ці прайграюць, — важнае сведчанне метафізічнага ментальнага стаўлення, вельмі блізкага да этыкі Бхагават-Гіты. У гэтых паэмах, якія нярэдка памылкова разумеюцца як апафеоз матэрыяльнай вайны, спакойная абыякавасць да поспеху і паразы, жарсці і болю, усхвалення і пагарды ёсць асновай этыкі. Гэта таксама падставовы ключ да разумення працаў вялікага італьянскага філосафа Юліуса Эволы (1898—1974), які высока цаніў Кадрану і сустракаўся з ім у Бухарэсце ў сакавіку 1936 г.

Карнэліу Кадрану ля берага Чорнага мора, 1935 г.

«Общество щита» проводило регулярные тренировки на базах Сил самообороны. Профессиональные военные обучали молодых людей обращению с оружием, управлению военной техникой, национальным видам борьбы. Вместе со всеми занимался Мисима. Между прочим, у него не всегда всё отлично получалось, но, как говорится, главное не победа, а участие. Смелость и упорство — основные двигатели прогресса в его жизни. Как и прежде, Юкио Мисима пробует себя в разных ипостасях. Самая запоминающаяся в этот период — лётчик реактивного истребителя.

Конец был уже близок. Утром 25 ноября 1970 года Мисима закончил свой последний роман «Падение ангела». Дописывая последние страницы, он понимал, что в этот день ему суждено умереть. После завтрака, приведя себя в порядок, он одел форму «Общества щита» и сел в машину, которая ждала его у дома. В машине было четыре человека в такой же форме. В 11 часов утра машина подъехала к штабу Восточного округа Сил самообороны на токийской военной базе Итигая. Военные были предупреждены о визите, поэтому неладного не заподозрили.

Мисима поднялся в кабинет к командующему округом генералу Кэнри Масите, которого через несколько мгновений схватили и связали соратники писателя по «Обществу щита». Дверь в кабинет забаррикадировали. Мисима, угрожая убить генерала, потребовал от военных сбора на плацу всего личного состава Сил самообороны. Пока его требование выполняли, члены общества «Общества щита» разбрасывали с балкона листовки, в которых писатель призывал к восстанию и свержению парламента. Обращение заканчивалось словами: *«Неужели вы цените только жизнь и позволили умереть духу?.. Мы покажем вам, что есть ценность большая, чем наша жизнь. Это не свобода и не демократия. Это Япония! Япония. Страна истории и традиций. Япония, которую мы любим»*.

В полдень Мисима предстал перед собравшейся аудиторией и начал своё обращение. Известная фотография запечатлила этот момент: писатель с повязкой на голове, на которой изображен красный круг восходящего солнца, и протянутой правой рукой обращается к солдатам. Возможно, именно в этот момент он говорил своим слушателям: *«...Сегодня японцы думают только о деньгах... Где же наш национальный дух?.. Вы должны восстать, чтобы защитить Японию. Японские традиции! Историю! Культуру! Императора!.. Вы же солдаты. Почему вы защищаете конституцию, отрицающую само ваше существование? Почему вы не проснётесь?..»*

Солдаты неохотно слушали оратора, отпускали шуточки и оскорбляли его, называя дебилом. Будучи освистанным и неуслышанным, Мисима трижды прокричал «*Да здравствует император!*» и вернулся в кабинет генерала. Там он, сказав «*Кажется, они даже не слышали меня*», сел на пол, расстегнул свой китель и вонзил в правую сторону живота меч. Всё было сделано согласно самурайской традиции. Его соратник по «Обществу щита» Морита, который согласно договорённости должен был обезглавить писателя, не сумел этого сделать. Поэтому лишь с третьего удара ещё живого классика японской литературы обезглавил другой его соратник Фуру-Кога. Он же лишил головы и Мориту, который решил последовать примеру вождя. Остальные участники путча освободили генерала и сдались полиции. За участие в этом кровавом спектакле они получат срок в четыре года тюрьмы.

Несомненно, Юкио Мисима знал, чем для него обернётся попытка мятежа. Собственно сама попытка восстания была им срежиссированна задолго до ноября 1970-го года. Об этом свидетельствуют различные события, произошедшие в последний год писателя. Мисима как будто старался уладить до своей гибели все дела, которые так или иначе требовали его решения: закрыл счета, уладил все финансовые вопросы, отказался от новых проектов, покинул ряд должностей. Мисима всячески старался успеть закончить «Море Изобилия» до своей гибели, поэтому специально опережал свой же собственный «официальный» литературный план почти на год.

Юкио Мисима обращается к солдатам с призывом к свершению военного переворота

О причинах его поступка написано немало статей. Каждый из исследователей творчества Мисимы по-своему трактует события того ноябрьского дня. Некоторые выдвигают версию о том, что писатель, будучи приверженцем самурайской традиции, не смог вынести позора. Другие считают, что политическая неудача Мисимы — это лишь формальный повод для «героической» смерти, о которой так долго мечтал писатель. Третьи полагают, что Мисима добился всего, чего можно было добиться человеку в жизни человеческой и напоследок поразвлёк публику кровавой драмой, главную роль в которой сыграл он сам.

Но это всего лишь теории и догадки. Рано или поздно нечто подобное должно было произойти с человеком, который на протяжении всей своей жизни был зачарован Её величеством Смертью. Ответ же можно получить у самого писателя, тем более что он его нам оставил. Всё в том же «Хагакурэ Нюмон» есть слова, которые, на мой взгляд, произнёс бы писатель, если бы у него спросили о причинах своего поступка:

Не имеет значения, какую смерть мы рассматриваем в качестве завершения пути человека к совершенству — естественную или же смерть в духе «Хагакурэ», смерть от руки врага или в результате вскрытия себе живота. В любом случае, требование быть человеком действия не меняет отношения к жизни и не толкает нас на поиски лёгкого пути.

Кадр из фильма «Патриотизм» (1966 г.) со сценой самоубийства японского офицера после неудачной попытки военного переворота. Режиссёр, автор сценария и исполнитель главной роли — Юкио Мисима

Рассуждение, в результате которого человек принимает решение умереть, приходит после многих других рассуждений и решений жить дальше. И это длительное созревание человека для принятия окончательного решения требует, чтобы он долго боролся и размышлял. Для такого человека жизнь — это круг, который может замкнуться, если к нему прибавить одну-единственную точку. Изо дня в день он отбрасывает круги, которым недостает какой-нибудь точки, и продолжает встречать последовательность таких

же кругов. В противоположность этому, жизнь писателя или философа представляется ему нагромождением постепенно расширяющихся кругов, в центре которых находится он сам. Но когда наконец наступает смерть, у кого возникает большее чувство завершённости — у человека действия или у писателя? Я склонен считать, что смерть, которая завершает наш мир добавлением к нему единственной точки, даёт человеку намного большее чувство завершённости.

Наибольшим несчастьем человеку действия представляется ситуация, в которой он не умрёт после того, как к его жизни добавлена завершающая точка.

ВМЕСТО ЭПИЛОГА

Про Мисиму я узнал благодаря фильму «Пёс-призрак: путь самурая» Джима Джармуша. Сюжет простой: бандит по кличке «Пёс-призрак» живёт согласно кодексу самурая, рубится с итальянской мафией и в итоге погибает от рук собственного хозяина. Фильм не о том, что даже негр из гангстерского района может стать самураем, а о том, как в современном мире жить согласно традициям. Картина разделена на несколько частей, каждую из которых предваряет цитата из «Хагакуре». Фигурирует там и сама книга, главный герой регулярно перечитывает её, а в концовке дарит маленькой девочке. Собственно из фильма я и узнал о книге, позже узнал, что существует комментарий к ней.

С творчеством Юкио Мисимы я познакомился в 2007 году, прочитав его роман «Золотой Храм». Через некоторое время на распродаже, в ящике с никому не нужными книгами, я наткнулся на биографическую работу «Мисима» Джона Натана и собрание сочинений Юкио Мисимы. Естественно, я эти книги приобрёл, тем более что стоили они смешную цену. После прочтения я долго не мог себе ответить, какая из них меня больше впечатлила: жизнеописание Кимитакэ Хираока или то, благодаря чему он стал известен. Его жизнь сама похожа на книгу, вернее, на роман, который имеет продолжение. Возможно, это даже можно назвать литературным сериалом длинной в 45 лет, главный посыл которого: возможно всё! Мисима пробовал себя в разных направлениях человеческой деятельности, но за что бы ни брался, всегда достигал вершин. В этой статье мне не удалось охватить всего того, что хотелось бы описать. Так или иначе, но я не стремился изобразить его этаким всемогущим сверхчеловеком, я хотел лишь показать его талант и взгляды.

За 25 лет своей «творческой жизни» он написал 40 романов, 18 пьес и огромное количество всевозможных статей, эссе и рассказов; 15 его произведений были экранизированы, многие при жизни автора. Мисима оставил огромный след не только в японской, но и в мировой культуре. Многие молодые писатели считают себя продолжателями «героического пути» в литературе. Различные музыкальные группы в своём творчестве обращаются к литературным образам его произведений. Самая известная из таких — *Death In June*. Жизни и творчеству Мисимы посвящён легендарный фильм Пола Шрёдера «Мисима: Жизнь в четырёх главах», продюсировал который сам Френсис Форд Коппола. Пользователи интернета теперь имеют возможность регулярно слушать «Радио Мисима», которое начало своё вещание во всемирной паутине. Ежегодно появляются новые книги и статьи так или иначе посвящённые Юкио Мисиме. Осенью этого года в мировой прокат выйдет фильм Кодзи Вакамацу, посвященный последним дням писателя. Хочется верить, что эта цепь не прервётся уже никогда, а стезя, проложенная Мисимой на пути к самосовершенствованию человека, не зарастёт.

ДАРЫЙСКІ СВЕТ.
ДАСЛЕДАВАННЕ АБ СУАДНОСІНАХ МАСТАЦТВА І ЎЛАДЫ

Готфрыд Бэн

Готфрыд Бэн (1886—1956) — доктар медыцыны,
нямецкі паэт-экспрэсіяніст, пісьменнік, эсэіст, прадстаўнік руху
кансерватыўнай рэвалюцыі.

Пераклаў з нямецкай мовы Дзяніс Быханькоў.
Стыль-рэдактура перакладу і каментары Аляксея Дзерманта.

Сіверга



Бронзавая статуя Зеўса Грымотніка або Пасейдона, знойдзеная ў моры ля мыса Артэмісіён. Суровы стыль, каля 460 г. да н. э.

І. СВЕТ У ЗЗЯННІ, ГЭТАК ЧАСТА АПІСАНЫ

Дарыйскі свет межаваў праз Мікены з крыцкім тысячагоддзем, тысячагоддзем без бітваў і ваяроў, поўным юных служак, якія нясуць высокія завостраныя ўнізе амфары ды з чароўнымі прынцамі ў фантастычных галаўных уборах, тысячагоддзем без крыві і палявання, без каня і зброі; з эпохай да жалезу ў даліне Кносу[1], з яго безабароннымі галерэямі, мудрагелістымі аздобамі сценаў, далікатным мастацкім стылем, каляровай керамікай, даўгімі спадніцамі і станікамі крыцянак з вузкімі таліямі, пажаноцку плаўнымі лесвіцамі палацаў з іх нізкімі ды шырокімі прыступкамі, зручнымі для вузкага кроку. Дарыйскі свет арыйскіх мужчынаў і барадатых багоў межаваў з аскепкамі хецкай расы з яе матрыярхатам, з жанчынамі-валадаркамі, з жаночымі працэсіямі, з квяцістымі нацюрмортамі і гіпсавымі барэльефамі, а праз мяжу — велічная кампазіцыя і манументальнасць. Вось з чым межаваў гэты свет, які ўрываецца ўнутр нашага Руху і на руіны якога скіраваныя нашыя напружаныя, ўражаныя і поўныя трагічных пытанняў позіркі. Гэта заўжды Быццё, але цалкам пераадоленае, гэта заўжды Разнастайнасць, але сабраная, крыкі скалаў, эсхілаўскі смутак,ператвораны ў вершы, падзелены на хоры. Там заўжды ёсць парадак, праз які мы глядзім у глыбіню, парадак, які ловіць жыццё ў падзеленую прастору. Які выкоўвае жыццё, точыць разцом, авалодвае ёю,

[1] Кнос (ст.-грэц. *Κνωσσός*) — старажытны горад на выспе Крыт. Галоўны горад выспы ў часы мінойскай цывілізацыі (2600—1450 гг. да н. э.).

Фрагмент бронзавай статуі «дэльфійскага каляснічага», знойдзеная пры раскопках храма Апалона ў Дэльфах. Суровы стыль, створана ў 478—474 гг. да н. э. ды змешчана ў храм на знак перамогі каманды калясніцаў у Піфійскіх гульнях. Надпіс на вапняковай базе скульптуры паведамляе, што яе стварылі па загад Палізаласа, тырана Гелы, грэцкай калоніі на Сіцыліі, як падарунак Апалону, што дазволіў перамагчы яму ў спаборніцтвах

выпальвае яе на вазе, як шэсце быкоў. Парадак, у якім зямная матэрыя і дух чалавечы непадзельныя ды звязаныя спарышом, трымаючы адзін аднаго і спараджаючы тое, што сёння шукаюць нашыя роспачныя позіркі — Мастацтва, Дасканаласць.

Калі мы, азіраючыся назад, паспрабуем знайсці формулу Еўропы, убачым, што яна была створаная як народамі, якія толькі парушалі прыроду, гэтак і тымі, што выпрацоўвалі стыль, і ў пачатку Еўропы паўстане спалучэнне абодвух прынцыпаў у адным народзе. Гэты народ, прышоўшы з Поўначы, штурмаваў муры пеласгаў[2], сцены, збудаваныя яшчэ цыклопамі, дзе кожны з камянёў, нават найменшы, было не зрушыць муламі, як пісаў Паўсаній[3]. Народ гэты зруйнаваў муры, разбурыў купальныя грабніцы і на гэтых няроўных, збольшага неўрадлівых землях, у беднасці, пачаў у сваіх уладаннях велічнае разгортванне стылю пад знакам бязмежнай панічнай улады.

Гэта пасляахейская эпоха. Васьміканцовыя шчыты з валовай скуры і скураныя курткі паданняў Іліяды саступаюць круглым шчытам і панцырам з металу — пачатак жалезнага веку. Ройкас і Тэадорас з Самасу[4] вынаходзяць адліванне жалеза ў формы, чалавек з Хіасу[5] навучаецца яго закаляць, адпускаць і сплаўляць. Растуць караблі, ужо магчыма пераплываць праз усё Міжземнамнае мора, замест чаўноў на пяцьдзясят вёслаў старажытных паэмаў будуюцца галеры на дзвесці грабцоў. Храмы ўсё яшчэ будуюцца з вапняку, але каля 650 г. да н. э. Мелас з Хіасу[6] робіць першыя мармуровыя статуі. Пачынаюцца Алімпіяды, з'яўляюцца аркестры, гімназіі становяцца грамадскімі, урэгуляванымі ўстановамі. У музыцы побач з лідзійскім і гіпадарыйскім ладамі з'яўляецца пяць новых; кіфара на чатыры струны атрымлівае сем; струны з ільну або канопляў замяняюцца жгутом з кішкаў ды жылаў буйных жывёлаў. Усё гэта адбываецца ў маленькіх дзяржавах. Даўжыня Аргаліды — ад васьмі да дзесяці міляў, а шырыня — ад чатырох да пяці. Лаконіка прыблізна такога ж памеру. Ахая — гэта танюткая палоска ля самага скраю гор, што сыходзяць да мора. Уся Атыка складае менш за палову самай невялікай нашай правінцыі[7]. Вобласць Карынфа, Сікіёна і Мегараў[8] абмяжоўваецца гадзінай шляху. Такім чынам, дзяржава, найперш на выспах і ў калоніях, не большая за проста горад, узбярэжжа і ваколіцы ў колькі двароў. У найбольш росквітны перыяд Афінаў горад можна было абысці за тры гадзіны, і хто пакідаў плошчу паходневых шэсцяў у Акадэміі а дзевятай раніцы, апоўдні ўжо вяртаўся, абышоўшы тэатр Дыяніса, бажніцы, Арэапаг[9], абедзьве гавані і прывідна белы лес Прапілеяў[10].

Светлы свет, якім ён часта апісваецца. Раніца, уздымаецца паўночны вецер, ён даносіць афінскія баркі да Кікладаў[11], і мора, як у Гамера, прымае колер віна і фіялак, мякка б'ючыся аб заіржэлыя скалы. Усё празрыста, ва ўсялякім выпадку у Атыцы, усё поўніцца фарбамі, у тым ліку Алімпійскімі, Палада, белае, і Пасейдонавы блакіт. Так, празрыстае, менавіта гэтае слова, якое выходзіць з-пад рук грэка — прасторнае, моцна асветленае, гэта — Пластыка, чысты Прадмет. Гэта стагоддзямі ўзбагачала Пелапанэс[12], напаўняла багаццем пагоркі і выспы, складвала майно паверх пашы, уздымала іх геаграфічна над люстэркам мора з дапамогай усяго таго, што знайшло выяўленне. Гэта Пражытае, пакрытае шнарамі волі і адзначанае перажываннямі і досведам расы. Парфір, апрацаваны мроямі, крытыкай і вышэйшым розумам. Гліна, і на ёй — лініі чалавечага руху, яго чын дзеяння, яго жэстаў, ладу ягонае прасторы.

Грамадскі, фізіялагічны свет. Чытаюць услых — гэта карысна ўплывае на функцыі вушэй і гартані. Сказ быў фізічнай адзінкай: тое, што можна вымавіць на адным дыханні. Чытанне задзейнічала ўвесь арганізм: правая трымае згорнуты світак, левая адцягвае тэкст на сябе. Павольна, адзін за адным, каб Харта (папера) не распаўзлася і каб валокны не разышліся. Плечы і рукі заўжды ў напружанні, бо і пішуць таксама трымаючы на руцэ. Але гэта адпавядае будове гаворкі! Гаворка прывязаная да бягучага моманту, яна не скіраваная ў далячынь. Вось ён стаіць, хоча ўздзеяння, і гэта сучаснасць. Прамоўца абірае ўсё, што пасуе, абірае любыя сродкі, каб узвысіць сябе і загубіць суперніка, яму было дазволена рытарычна рызыкаваць усім, калі слухач сумняваўся ў ягонай рацыі. Найперш гэта былі прамовы з канкрэтных нагодаў: судовыя прамовы, выпадкі крадзяжу збожжа альбо скуры. Трэба было нешта данесці да публікі (а гэта «добрыя вушы»), у нечым пераканаць, зрабіць нешта верагодным. Потым ужо былі раскошныя хваласпевы, рэкламныя

[2] Пеласгі (ст.-грэц. *Πελασγοί*) — імя, якім старагрэцкія аўтары называлі народ, які жыў да ўзнікнення мікенскай цывілізацыі, у гэтым кантэксце ўжываецца ў якасці азначэння аўтахтоннага даіндаеўрапейскага насельніцтва.

[3] Паўсаній (ст.-грэц. *Παυσανίας*) — старагрэцкі пісьменнік і географ II ст., аўтар «Апісання Элады».

[4] Паводле Паўсанія майстры Роікас і Теадорас з вострава Самас, якія жылі ў VI ст. да н. э. былі першымі грэцкімі скульптарамі, «*хто плавіў бронзу і ствараў статуі*».

[5] Глаўк з Хіасу — майстра родам с вострава Хіас, які жыў паміж 600 або 680 г. да н. э., праславіўся як вынаходнік пайкі металаў (да яго часткі бронзавых і скульптурных вырабаў злучаліся між сабою толькі з дапамогай цвікоў і заклёпак).

[6] Мелас з Хіасу — легендарны старагрэцкі скульптар (VIII ст. да н. э.).

[7] Аргаліда, Лаконіка, Ахая, Атыка — рэгіёны старадаўняй Грэцыі з галоўнымі гарадамі Аргосам, Спартай, Патрай і Афінамі адпаведна.

[8] Карынф, Сікіон, Мегары — старагрэцкія полісы.

[9] Арэапаг (ст.-грэц. *Ἄρειος πάγος*, літаральна 'пагорак Арэса') — орган улады ў Афінах. Складаўся з пажыццёвых чальцоў-архонтаў. Асноўнымі функцыямі арэапага было назіранне за выкананнем законаў і суд па справах, звязаных з забойствамі.

[10] Прапілеі (ст.-грэц. *προπύλαιον*, ад ст. — грэц. *προ* 'перад' і *πύλαι* 'вход') — парадны праход, праезд, утвораны портыкамі і калонамі, размешчанымі сіметрычна восі руху на які-небудзь (збольшага — святы) участак (пазней — у архітэктурны ансамбль або ў палацава-паркавы комплекс). Адным з найвыбітнейшых помнікаў старагрэцкай архітэктуры ёсць знакамітыя прапілеі, якія аздабляюць уваход на Акрополь у Афінах (437—432 да н. э.).

[11] Кіклады (грэц. *Κυκλάδες* 'якія знаходзяцца па коле') — архіпелаг у паўднёвай частцы Эгейскага мора.

[12] Пелапанэс (грэц. *Πελοπόννησος*) — паўднёвая паўвыспа Балканскай паўвыспы, якая злучаецца з ёй Карынфскім пярэсмыкам. У старажытнасці ўлучала вобласці: Аркадыю, Ахаю, Месенію, Лаконію, Аргаліду, Карынф, Фліунт, Эпідаўрыю і Сікіён.

прамовы. Прамовы насупраць уваходу. Потым з’явілася «ачараванне», сіметрычная будова сказаў, сугучныя, рыфмаваныя словы. Утвараліся аб’яднанні і грамадскія школы, каб практыкавацца ў стылі і фігурным упрыгожванні гаворкі. Вытанчаныя сімуляваныя спрэчкі: «Пахвала мухі», або «Геракл на ростанях», або «Чума», «Клапы»[13] — на працягу трох стагоддзяў гэта развіла талент, скіраваны на дзеянне, перамогу, кпіну, смех.

Фізіялагічны свет. Члены чалавечага цела — гэта аснова ягонае меры: стапа — гэта чатыры далоні ў шырыню, локаць — шэсць далоняў, палец — чвэрць далоні, пятка — трацiна далоні, і гэтак далей да сажані і стадыя. Адзін стадый — шэсцьсот стопаў, даўжыня бегавой сцежкі. «Атычная стапа», унармаваная заканадаўча ў часы Перыкла[14] ў Афінах, улічаная ў шматлікіх будынках, трыста восем міліметраў, прайшла з Філіпам і Аляксандрам[15] праз усю Азію. Іхная мера аб’ёму — гэта жбан, які змяшчае ў сябе віно або алей, падзелены на дванаццаць частак.

Раніца, святло пранікае ў выбеленую вапнай хатку. Сцены стракатa размаляваныя і тонкія, вор мог бы іх выламаць. Ложак, на ім некалькі коўдраў, куфар, некалькі прыгожа размаляваных вазаў, вісіць зброя, простая лямпа — гэтага хапала арыстакратычнаму афінянiну. Ён устае рана, накідвае на сябе дарычны хітон без рукавоў, замацоўвае пярэдні і задні кавалак фібулай справа. Ён не ходзіць з голымі плячыма, як працоўны раб, але апранае белую абхінанку на плечы. Накідка з тонкай поўсці, бо лета. На чацвёрты палец левай рукі — пярсцёнак з пячаткай. Зямля тут з большага без лясоў, але багатая на пчолаў: мёд у віне, мёд у хлебе і запячатаны воск для закрывання дакументаў. Ён ідзе без капелюша, без посаху і ў дзвярах абарочваецца. Хатні раб мусіць зрабіць новы фіціль з поўсцістых лістоў адмысловай расліны і ўцiснуць востраканечную амфару глыбей у зямлю, бо ўначы яна перакулілася.

Цяпер ён глядзіць долу і на поўдзень, на беразе стаяць трыеры[16], яны выцягнутыя наверх, нават найбольшыя з іх — да двухсот шасцідзесяці тонаў велічынёй, каб пераплыць мора, плаваюць без компасаў, мапаў або маякоў, уздоўж узбярэжжа і сярод піратаў. Гэта вялікі гандлёвы флот Міжземнага мора, які выціснуў фінікійцаў, ён перавозіць хлеб і граміць ворагаў пры Саламіне ды Хімеры[17]. Вось ён на кірмашы. На лавах ляжаць атачаныя пераважна мужчынамі прадметы адзення, залатыя ланцугі і бранзалеты, брошкі, віно ў гарлачах, яблыкі, грушы, слівы і вянкі. З гэтых матэрыялаў лепшы лён робяць у Элідзе[18], лепшую апрацоўку тканіны робяць у Патры[19], стракаты шоўк прывозяць з астравоў. Ён хоча прайсці далей, але мусіць пачакаць, бо валы цягнуць Лаўрыёна[20] вазы з данінай і зліткамі срэбра. Нарэшце вуліца вызваляецца. Гэта тая самая вуліца, якой вяртаюцца з Элеўсіна[21], ён так часта бачыў яе падчас начных фэстаў у святле паходняў. Тут жывуць ганчары старых сялянскіх школаў і апрацоўваюць свае вазы. Карычневы і чорны на жаўтаватым фоне, ніжнія часткі застаюцца чыстымі, упрыгожваюцца зусім проста, але на горле і схілах вазы з’яўляюцца зігзагавыя лініі, трохкутнікі, крыжы і свастыкі, простыя і мастацкія меандры. Некаторыя дадаюць нязначныя мясцовыя варыяцыі, і між ліній выступаюць шэрагі жывёлаў. Ніякіх ільвоў альбо міфічных істотаў, як у эгейскім мастацтве, толькі хатнія жывёлы, садовыя птушкі. Усё ўпарадкаванае і пастаўленае ў палоскі: строга і ясна, дакладна — дарыйскія актавы[22]. На Пірэйскай вуліцы ў Дыпілонскіх брамаў, жывуць яны і на святой вуліцы, тут знаходзіцца горад керамікі.

Там жа жылі і здабытчыкі пурпуру, што заўжды выклікаюць гэткі вялікі інтарэс. Адмысловыя ракавіны давалі вельмі шмат фарбавага соку, калі іх забіць хуткім ударам — белага соку, зялёнага, чырвонага, фіялетавага. Тыя, што раслі на скалах, былі лепшымі за тых, што ляжалі на дне. Тады яшчэ можна было займацца пурпурам, пазней гэта было забаронена, бо гэта быў колер толькі цароў і Багоў.

За горадам узводзіцца тэатр, туды ідзе наш афінянін. Тэатр — гэта скрай пагорку з паўкруглымі шэрагамі прыступкаў для сядзення; паміж прыступкамі сходы з каменных дыскаў. Унізе па цэнтры стаіць алтар, ужо гатовая і вялікая, роўна абцясаная сцяна для рэха галасоў выступоўцаў. Асвятленне — сонца, кулісы — мора, або аддаленыя горы ў густым марыве. Ён акідае ўсё гэта позіркам, гэта не пачуццё, не проста слыхавы альбо зрокавы прысмак. Ён думае аб тым месцы ў Алфея[23], дзе была гэткая моцная смага, пяць доўгіх святых дзён у намёце на сонцы і пад поўняй уначы. Рака перасохла, у яе рэ-

[13] Сатырычныя творы, створаныя рознымі старагрэцкімі аўтарамі ў V—II стст. да н. э

[14] Перыкл (грэц. *Περικλῆς*, 495 да н. э. — 429 да н. э.) — дзяржаўны дзеяч, стратэг, аратар і ваявода ў Старажытных Афінах. Перыяд яго кіравання лічыцца найвышэйшай кропкай развіцця дарыйскай цывілізацыі.

[15] Філіп II (грэц. *Φίλιππος* Β', 382—336 гг. да н. э.) — македонскі цар, які кіраваў з 359 г. да н. э., бацька Аляксандра Македонскага. Аляксандр Македонскі (ст.-грэц. *Ἀλέξανδρος Μέγας*, 356—323 гг. да н. э.) — македонскі цар з 336 г. да н. э. з дынастыі Аргеадаў, ваявода, стваральнік сусветнай дзяржавы, якая распалася пасля яго смерці. У гістарыяграфіі вядомы як Аляксандр Вялікі

[16] Трыера (ст.-грэц. *Τριήρεις*) — клас баявых караблёў, якія былі пашыраны ў антычнасці ў Міжземнамор’і. Трыеры атрымалі свой назоў праз тры шэрагі вёслаў, якія, як можна меркаваць, размяшчаліся адзін над адным у шахматным парадку.

[17] Саламін (грэц. *Σαλαμίνα*) — найбуйнейшая з Саранічных выспаў у Грэцыі блізу Афінаў. Пры Саламіне адбылася адна з самых вядомых бітваў старажытнага свету, у якой грэкі на чале з Феміcтоклам разбілі персідскі флот у 480 г. да н. э. Хімера (грэц. *Ἱμέρα*)— важная грэцкая калонія ў Сіцылія, каля якой у 480 г. да н. э. адбылся бітва паміж грэкамі і карфагенцамі, якая замацавала панаванне грэкаў у Сіцыліі.

[18] Эліда (грэц. *Ἤλις* або *Ἠλεία*) — старажытны рэгіён па паўночным захадзе Пелапанесу, а таксама яго галоўны горад. На тэрыторыі Эліды знаходзілася агульнагрэцкае свяцілішча ў горадзе Алімпія, дзе адбываліся Алімпійскія гульні.

[19] Патра (грэч. *Πάτρα*) — горад у Грэцыі, у паўночна-заходняй часткі Пелапанэса. Горад Патра заснаваны ў VI ст. да н. э. ахейцамі Спарты, пасля таго як дарыйцы выціснулі іх са значнай часткі Пелапанэса.

[20] Лаўрыён (ст.-грэц. *Λαύριον*) — горад у паўднёва-усходняй часткі Атыкі, вядомы сваімі шахтамі, дзе здабывалася срэбра.

Мармуровая выява бітвы лапіфаў і кентаўраў з метопы заходняга боку Парфенона ў Афінах. Меркаваны аўтар — скульптар Каламіс. Суровы стыль, створана ў 446—440 гг. да н. э.

чышчы адно каламуць. Але перад тым эланодзікі[24] чакалі і рыхтаваліся ў Элідзе дзесяць месяцаў, і цяпер усе змагаліся, змагаліся далёкія адно ад аднаго гарады, аграмадная напруга, страшэнная сур'ёзнасць была ў гэтым свеце мужчын, і не было эліна, які падчас барацьбы і песняў не шукаў бы вачыма стол з золата і слановае косці, на якім ляжалі вянкі Перамогі, і аліўкавае дрэва між храмамі, з якога адломлівалі галіны.

II. ЛЯЖАЎ НА КАСЦЯХ РАБОЎ

Антычнае грамадства ляжала на адпаліраваных касцях рабоў, а наверсе квітнеў горад. Наверсе белыя квадрыгі[25] і высокія, добра збітыя людзі з імёнамі паўбагоў: Перамога, Магута, Гвалт, імёны вялікіх мораў; а ўнізе грымелі ланцугі. Рабы — нашчадкі мясцовага насельніцтва, палонныя, скрадзеныя і купленыя жылі ў бараках ў агульных памяшканнях, шмат хто быў скаваны. Ніхто не думаў аб іх, Платон і Арыстотэль бачылі ў іх істотаў ніжэйшага ўзроўню, голы факт. Вялікі імпарт ішоў з Азіі, у кожны апошні дзень месяцу быў кірмаш, нявольнікі стаялі ў коле на агляд. Цана была ад двух да дзесяці мінаў, прыблізна ад ста да шасцісот марак. Найтаннейшымі былі рабы для млыноў і шахтаў. Бацька Дэмасфена меў сталёвую фабрыку, на якой працавалі рабы, і з улікам вышэй прыведзеных коштаў, яна працавала з прыбыткам ў дваццаць тры працэнты, а ягонае прадпрыемства па вырабе ложкаў — з прыбыткам у трыццаць працэнтаў. У Афінах суадносіны вольнага насельніцтва і рабоў былі адзін да чатырох, на сто тысячаў афінянаў прыходзілася чатырыста тысячаў рабоў. У Карынфе было чатырыста шэсцьдзясят тысячаў рабоў, у Агіне чатырыста семдзясят тысячаў. Рабам нельга было

[21] Элеўсін (ст.-грэц. *Ἐλευσίς*) — горад у заходняй Атыцы, у 22 км ад Афінаў. Элеўсін быў культавым цэнтрам Дэметры і Персефоны, у І-м тысячагоддзі да н. э. у ім праводзіліся Элеўсінскія містэрыі.

[22] Актава — страфа, якая мае восем радкоў.

[23] Алфей (ст.-грэц. *Αλφειός*) — найдаўжэйшая рака на Пелапанэсе.

[24] Эланодыкі (ст.-грэц. *Ἑλλανοδίκαι* 'суддзі грэкаў' — чальцы камісіі з 10 грамадзянаў Эліды, якія ў часе Алімпійскіх гульняў выконвалі функцыі суддзяў: правяралі атлетаў, сачылі за іх трэніроўкамі, прымалі ў іх прысягу і размяркоўвалі ўзнагароды.

[25] Квадрыга — антычная двухколавая калясніца з чатырма запражанымі коньмі.

Фрагмент мармуровай скульптуры багіні Афіны з заходняга франтону храма Афіны-Афаі на выспе Эгіна. Суровы стыль, створана каля 490—480 гг. да н. э.

[26] Пелапанеская вайна (431—404 да н. э.) — вайсковы канфлікт ў Старажытнай Грэцыі паміж Дэласкім саюзам на чале з Афінамі і Пелапанэскім саюзам на чале са Спартай.

[27] Ілоты (адз. л. ст.-грэц. *εἱλώτης*) — у старажытнай Спарце земляробы, што знаходзіліся ў прамежкавым становішчы паміж прыгоннымі і рабамі.

[28] Фемістокл (ст.-грэц. *Θεμιστοκλῆς*, каля 524 г. да н. э. — 459 г. да н. э.) — афінскі дзяржаўны дзеяч, адзін з «бацькоў-заснавальнікаў» афінскай дэмакратыі, ваявода перыяду грэка-персідскіх войнаў.

насіць даўгія валасы, у іх не было імёнаў, іх можна было дарыць, закладваць, прадаваць, караць палкамі, рамнямі, калодкамі, ашыйнікамі, ставіць агнянае таўро. Забойства раба не было злачынствам, магчыма, выкупалася лёгкім рэлігійным пакаяннем. Іх рэгулярна штогод збівалі без дай прычыны, паілі, каб смяяцца з іх, і было абсалютна непрыстойна, калі нейкі раб выглядаў не як раб, тады яго забівалі, а ягоны ўладар абкладаўся штрафам за тое, што не здолеў трымаць раба пад прыгнётам. Калі рабоў было зашмат, распачыналіся начныя бойні, бо гэта лічылася мэтазгодным. У крытычны момант Пелапанэскай вайны[26] па спісе выманілі дзве тысячы самых здольных і самых свабодалюбных рабоў ды забілі іх у якасці вельмі каштоўнай ахвяры. Там гэта было часткай выхавання — пасылаць падлеткаў у засады ўздоўж дарог, дзе яны мусілі чакаць рабоў і ілотаў[27], што вярталіся з працы, нападаць на іх ды забіваць. Гэта змушала звыкнуцца да крыві і практыкавацца забіваць уласнымі рукамі. Праз гэткі падзел працы паўставаў час для практыкаванняў са зброяй, гульняў, бітваў і статуй, для грэцкай прасторы.

Калі разглядаць гэтую прастору сучаснымі вачыма, шмат што здаецца двухсэнсоўным. Фемістокл[28], герой персідскай вайны, дазволіў жыхарам вострава Эўбея падкупіць сябе трыццацю талантамі[29], каб элінскія войскі біліся з персамі на подступах да Эўбеі, не даючы персам захапіць востраў. Пяць з гэтых трыццаці талентаў ён скарыстаў, каб падкупіць аднаго з малодшых кіраўнікоў войска. Пасля бітвы пры Саламіне[30] ён шантажуе гарады і астравы ўжо ўпотайкі ад іншых вайскоўцаў. Перад Саламінскай бітвай ён кантактуе з персідскім царом Ксерксам, і пасля бітвы таксама. Ягоны слуга Сікінас увесь год курсіраваў між імі. Герадот пісаў, што ва ўсіх сваіх учынках і словах ён нібы пакідаў для сябе магчымасць адступлення да персаў у выпадку таго, калі ў Афінах нешта не заладзіцца. Паўсаній[31], кіраўнік флота, звязаны клятвай, спартанскі рэгент, пераможца бітвы пры Платэях[32], падчас вайны таемна кантактаваў з персідскім царом, з вядомай мэтай здаць яму Спарту і ўсю Эладу. Леаціхід[33], спартанскі цар, даў сябе падкупіць падчас паходу супраць фесалійскіх Алевадаў[34] у 476 г. да н. э. і скончыў паспяховую вайсковую кампанію. Усе яны — героі пятага стагоддзя, што жылі за два пакаленні да прыгожага і падступнага Алківіяда[35], які сістэматычна пераходзіў на розныя бакі.

Там подкуп, тут жорсткасць і помслівасць. Паніоній з Хіаса абрабаваў Гермоціма, вылягчыў яго і прадаў як раба. Пазней Гермоцім узняўся, стаў заможным і запрасіў Паніонія з сынамі да сябе. Ён нападае на іх і вымушае Паніонія вылягчыць сваіх сыноў, а потым змушае іх вылягчыць бацьку; пасля прадае ўсіх чатырох як рабоў. Герадот распавядае аб гэтым дакладна і аб'ектыўна. Шасцёра сыноў цара бізальтаў[36] увязаліся ў вайну без дазволу бацькі. Калі яны вярнуліся дахаты жывыя і здаровыя, бацька вырваў ім вочы каб пакараць за правіннасць, піша Герадот. У таго ж слыннага пачынальніка гістарыяграфіі мы чытаем далей аб рэгенце, які займаўся здзекам з трупаў. Мы даведваемся пра гэта між іншым, як пра частку іншай гісторыі: паслы вярнуліся з Дэльфаў, і рэгент гэтак трактуе словы аракула пра тое, што трэба саджаць хлеб у халодную печ. Раса, поўная хітрыкаў і падману, як у вайсковай сферы, гэтак і ў рытуальнай. Факейцы[37] фарбуюць шэсцьсот самых мужных сваіх ваяроў у белы колер і адпраўляюць іх з белымі шчытамі ўначы ў варожы лагер з загадам знішчаць усіх, хто не афарбаваны ў белы. Поспех: у апанаваным страхам лагеры ўдаецца выразаць чатыры тысячы чалавек. Аднак потым сіметрычны адказ: у горным праходзе ворагі выкопваюць вялізную яму, у якой пакідаюць пустыя гаршчкі ды прысыпаюць смеццем і друзам, гэтак што паверхня падобная да цвёрдае зямлі. Цяпер факейцы атакуюць і падаюць у збаны, коні ломяць сабе ногі, і ўсіх, хто катаецца па зямлі, адразу забіваюць.

Хітрыкі падчас захопу Троі, хітрыкі пры крадзяжы лука Філактэта[38], хітрыкі ў вобразе Трыумфу на ўсходнім франтоне храма Зеўса ў Алімпіі — міфалагічны правобраз спаборніцтва на калясніцах Энамая і Пелопса. Кароль Энамай абяцаў руку сваёй дачкі пераможцу, а прайграўшага жаніха забіваў. Герой Пелопс здолеў перамагчы, падкупіўшы вазніцу Энамая Міртыла. Міртыл не замацаваў кола на калясніцы Энамая, і цар разбіўся. А калі Міртыл запатрабаваў у Пелопса ўзнагароду, той утапіў яго ў моры. Здрада ці не, але ў любым выпадку Перамога, яна змывала ўсё і была Боскай, найвышэйшай святыняй грэкаў.

[29] Талант (ст.-грэц. *τάλαντον*) — адзінка масы і грашовая адзінка ў Старажытнай Грэцыі, якая прыкладна адпавядае масе вады, паводле аб'ёму роўнай адной стандартнай амфары (каля 26 літраў).

[30] Бітва пра Саламіне — марская бітва паміж грэцкім і персідскім флотамі, якая адбылася ў 480 г. да н. э. ля вострава Саламін у Саранічнай затоцы Эгейскага мора блізу Афін. Бітва скончылася разгромам персаў.

[31] Паўсаній, сын Клеамброта (ст.-грэц. *Παυσανίας*; ? — 467 до н. э.) — спартанскі ваявода эпохі грэка-персідскіх войнаў. Пасля гібелі цара Леаніда ў бітве пры Фермапілах стаў рэгентам яго сына Плістарха. На чале агульнагрэцкага войска здабыў перамогу ў бітве пры Платэях.

[32] Бітва пры Платэях — адна з найбуйнейшых сухапутных бітваў грэка-персідскіх войнаў, якая адбылася ў 479 г. да н. э. на схілах гары Кітэрон побач з невялікім мястэчкам Платэі ў Беотыі. У бітве пры Платэях персідскае войска атрымала паразу ад грэкаў.

[33] Леаціхід (ст.-грэц. *Λεωτυχίδης*) — спартанскі цар з роду Эўрыпантыдаў.

[34] Алевады (ст.-грэц. *Ἀλευάδαι*) — арыстакратычная сям'я з Фесаліі, якая кіравала горадам Ларысай і навакольнымі землямі.

[35] Алківіяд (ст.-грэц. *Ἀλκιβιάδης*, 450 г. да н. э. — 404 г. да н. э.) — старагрэцкі афінскі дзяржаўны дзеяч, аратар і ваявода часоў Пелапанэскай вайны (431—404 гг. да н. э.).

[36] Бізальты — адно з фракійскіх плямёнаў, якое жыло на поўначы Грэцыі.

[37] Факіда (ст.-грэц. *Φωκίδα*) — вобласць Цэнтральнай Грэцыі. Жыхары Факіды, факейцы, належылі паводле дыялекту да паўночнай-заходняй групы грэцкіх плямёнаў і былі роднасныя пелапанэскім дарыйцам.

[38] Паводле Гамера, на дзясятым годзе Траянскай вайны святар Калхант абвясціў, што Троя не можа быць узятая без луку і стрэл Геракла, якіх той пакінуў свайму паплечніку Філактэту. Філактэт, паранены ў часе Траянскай вайны, знаходзіўся на выспе Лемнас, куды выправіліся Адысей і Дыямед. Яны ўвайшлі ў давер да Філактэта ды авалодалі яго зброяй.

Была толькі адна мараль, скіраваная ўнутр, — яна звалася Дзяржавай, ды скіраваная на вонкі, — яна звалася Перамогай. Дзяржава — гэта горад, і яна застаецца горадам, ніколі не сягаючы далей. Разгледзім адзін пэўны год у Афінах. Накірунак унутр: усіх, хто не меў афінскага паходжання, пазбаўлялі грамадзянскіх правоў і маёмасці, дзесяць працэнтаў выкрасленыя са спісаў. Зямля і маёмасць павінны канцэнтравацца, гэткі гарадскі расізм. Кірунак на вонкі: заключаны дэласка-атычны звяз[39], вядома, з элінскімі дзяржавамі, але саюз — гэта звязка! Уладу маюць Афіны! Зараз усе гарады са звязу мусілі ісці судзіцца ў Афіны, плаціць даніну, якую Афіны ўсталююць, у ненадзейныя гарады або гарады пад персідскай пагрозай адпраўляюцца афінскія гарнізоны і каменданты. Трыеры кантралююць мора, элінскія парты блакуюць, сцены зносяць, забіраюць зброю, палонных кляймяць, як рабоў, суседнія гарады і выспы знішчаюцца. Падчас Дыянісій[40] прадстаўнікі іншых гарадоў мусілі праносіць перад афінянамі ды іх гасцямі дошкі з іх данінай, дэманстраваць золата і срэбра. І ўсё гэта — у цывілізаваную эпоху грэцкай гісторыі. У той жа час на гэтых шэсцях збіраліся сродкі для асірацелых дзяцей загінулых у вайне афінскіх грамадзян.

Наступны выпадак вельмі цікавы для разумення псіхалогіі гэтых вышэйшых слаёў: пасля перамогі пры Саламіне і пасля падзелу здабычы эліны хацелі вызначыць і ўзнагародзіць таго, хто паказаў сябе лепшым за ўсіх падчас вайны. І калі прыбывалі кіраўнікі атрадаў, кожны з іх атрымліваў адзін голас у алтары Пасейдона, каб вызначыць першага і другога сярод іх. І кожны аддаваў голас сабе, бо верыў што ёсць лепшым за ўсіх, нават лепшым за Фемістокла, лепшым за Эўрыбіяда[41], за Леаніда[42]! Таксама трэба памятаць, што, калі ў часе бітвы грэцкія караблі параўноваліся адзін з адным, людзі на іх крычалі, зневажалі адваротны бок і ўсяляк прыніжалі. З гэтага ўсяго паўставалі вялікія перамогі грэкаў.

Дэмакрыт[43] пісаў, што гэтаксама як стваралі законы супраць шкодных драпежнікаў і змей, трэба рабіць тое ж і з людзьмі, шкоднымі для дзяржавы. І Пратагор[44] змусіў пана Бога прамовіць наступныя словы*: «Выдай ай ад майго імя закон, паводле якога належыць знішчаць чалавека, які не мае ўяўлення аб прыстойнасці і без пачуцця справядлівасці, бо гэта як ракавая язва грамадства»*. І з гэтага паўстала «пятае стагоддзе», наймацнейшае ззянне белае расы, Міжземнамор'я. У наступныя пяцьдзясят гадоў пасля бітвы пры Саламіне ўсё гуртавалася вакол яе: Эсхіл[45] б'ецца побач, Еўрыпід[46] нараджаецца падчас вайны на выспе, Сафокл[47] таньчыць з юнакамі ўрачысты гімн Перамогі. Тут завяршаецца Перамога эліна: Улада і Мастацтва, тут завяршаецца Перыкл[48], пакуль не прыйшла чума і тыраны, тут дасягаюць дасканаласці абодва пакаленні, над якімі заўсёды ўздымаюцца дзве рэчы для нашэння ды ўзлёту — Паходні і Вянкі.

III. ШЭРАЯ КАЛОНА БЕЗ БАЗЫ

За стракатым панэлінскім сілуэтам Грэцыі, шэрай калонай, прастакутнай бажніцай, лагерам мужчын на правым беразе Эўрота[49] стаіць дарыйскі свет. Дарыйцы любяць горы, іх нацыянальны Бог — Апалон, Геракл — першы Цар, Дэльфы[50] — Святыня. Яны адмаўляюць пялюшкі і купаюць дзяцей у віне. Яны — носьбіты сівое даўніны, старое мовы. Дарыйскі дыялект быў адзіным, што ўжываўся яшчэ і ў часы рымскага валадарання, пры імператарах. Дарыйская мара — Строгае выхаванне і Вечная Маладосць, Богападобнасць, Моцная Воля, велізарная арыстакратычная вера ў Расу, Клопат пра ўвесь Род, большы, чым пра сябе. Яны носьбіты старое Музыкі і старых інструментаў: у кіфарэда Цімафея з Мілета забралі інструмент і адрэзалі на ім чатыры лішнія струны, бо ён павялічыў іх лік з сямі да адзінаццаці, а самога павесілі. Іншаму музыку дзве струны дзевяціструннага інструменту выцягнулі праз ніз з дапамогай сякеры — можна мець толькі сем старажытных струнаў. *«У агонь слінявую трубку»*, — крычыць услед флейце Працін[51], бо яна паводле новай моды захацела кіраваць хорам, замест таго, каб, як раней, падпарадкоўвацца яму.

У храмах яны вешалі кайданы і ланцугі для ворагаў, а Багоў прасілі пра землі суседзяў. Іх валадарства было перадусім уладай па-за ўсялякай мерай, вайну яны вядуць супраць

[39] Дэласкі звяз — палітычнае аб'яднанне на чале з Афінамі, якое вылучылася з агульнага звязу дзяржаваў Элады супраць персаў пасля таго, як спартанцы страцілі марскую гегемонію. В 454 г. да н. э. звяз аб'ядноўваў 208 дабраахвотных і змушаных чальцоў.

[40] Свята, прысвечанае богу Дыянісу. Вясковыя дыянісіі адзначаліся ў лістападзе—снежні. Гарадскія дыянісіі (Вялікія дыянісіі) святкаваліся пяць дзён у сакавіку—красавіку. У часе вялікіх дыянісій ставіліся прадстаўленні ў тэатры, драматургі выстаўлялі на суд гледачоў свае творы і ўдзельнічалі ў конкурсе.

[41] Эўрыбіяд (грэц. *Εὐρυβιάδης*) — спартанскі ваявода, кіраўнік аб'яднанага грэцкага флоту ў другой грэка-персідскай вайне 480 г. да н. э.

[42] Леанід (грэц. *Λεωνίδας*) — цар Спарты з роду Агідаў, які кіраваў у 491—480 гг. да н. э. Стаў знакамітым пасля бітвы пры Фермапілах, дзе гераічна абараняўся ад персаў ды загінуў разам з асабістай гвардыяй у трыста спартанцаў.

[43] Дэмакрыт (ст.-грэц. *Δημόκριτος*, 460 г. да н. э. — каля 370 г. да н. э.) — старагрэцкі філосаф, адзін з пачынальнікаў атамістыкі і матэрыялістычнай філасофіі.

[44] Пратагор (ст.-грэц. *Πρωταγόρας*, каля 490 г. да н. э. — каля 420 г. да н. э.) — старагрэцкі філосаф, адзін з першых сафістаў.

[45] Эсхіл (ст.-грэц. *Αἰσχύλος*, 525 г. да н. э. — 456 г. до н. э.) — старагрэцкі драматург, бацька еўрапейскай трагедыі.

[46] Еўрыпід (ст.-грэц. *Εὐριπίδης*) — старагрэцкі драматург, прадстаўнік новай атычнай трагедыі, у якой псіхалогія пераважае над ідэяй боскага наканавання.

[47] Сафокл (ст.-грэц. *Σοφοκλῆς*, 496/5—406 гг. да н. э.) — афінскі драматург, трагік.

[48] Перыкл (ст.-грэц. *Περικλῆς*, каля 494[1]—429 гг. да н. э.) — афінскі дзяржаўны дзеяч, адзін з «бацькоў-заснавальнікаў» афінскай дэмакратыі, знакаміты аратар і ваявода.

«Храм Канкордыі» — адзін з найлепей захаваных дарычных храмаў у свеце. Знаходзіцца ля горада Агрыджэнта, Сіцылія, збудаваны ў 450—440 гг. да н. э.

[49] Эўрот (ст.-грэц. *Ευρώτας*) — рака ў Грэцыі, на якой стаіць горад Спарта.

[50] Дэльфы (ст.-грэц. *Δελφοί*) — старагрэцкі горад у паўднёва-заходняй Факідзе, агульнагрэцкі рэлігійны цэнтр з храмам і аракулам Апалона. У Дэльфах адбываліся Піфійскія гульні.

[51] Працін — грэцкі трагік з Фліунта, які адрадзіў сатырычную драму і каля 515 г. да н. э. наноў увёў яе ў Афінах. У адзіным фрагменце з яго 50 страчаных драмаў ён адводзіць галоўную ролю слову ў параўнанні з музычным суправаджэннем на флейце.

Фрагмент
мармуровай статуі Апалона
з заходняга франтону
храма Зеўса ў Алімпіі.
Суровы стыль,
460—450 гг. да н. э.

любой краіны, якую захочуць. Сто адабраных мужчынаў удзень і ўночы нясуць варту і з усяго быдла, якое рэжуць, яны атрымліваюць скуру і філей, падчас трапезы ім даюць ежу першым і яны могуць атрымаць яшчэ раз столькі ж, колькі і астатнія. Каралеўская ўлада спадчынная, дзевяцьсот гадоў валадарылі Гераклíты, і ворагі не адважваліся ўздымаць на іх руку ў бойцы, каб не прагнявіць Багоў, падчас іх смерці вершнікі разносілі навіну па ўсіх кутках лаконскай краіны, а жанчыны ў гарадах білі ў катлы.

Дарыйскі свет — гэта супольныя трапезы, каб заўжды быць гатовымі. Пятнаццаць мужчынаў, і кожны прыносіць свой кавалак: сыр, інжыр, ячменны хлеб, здабыча палявання, ніякага віна. Выхаванне мае толькі адну мэту: змаганне і падпарадкаванне. Юнакі спяць голымі на чароце, які мусяць нарваць у Эўроце без нажа, ядуць мала і хутка, а калі хочуць дадаць нешта да беднага рацыёну, мусяць красці з дамоў і сядзібаў, бо

салдат жыве рабункам. Зямля падзеленая на дзевяць тысячаў частак, што перадаюцца ў спадчыну, але прыватнай уласнасці няма, усе ўчасткі аднаго памеру і неад'емныя. Ніякіх грошай, апрача жалезных, няма. Жалезныя ж маюць вельмі значную вагу ды аб'ём, і сума ў дзесяць мінаў (каля шасцісот марак) ужо вымагала асобнага пакою ў доме і возу з двума коньмі для перасоўвання. Усе астатнія дзяржавы навокал мелі сярэбраныя і залатыя грошы. Але і гэтае жалеза непрыдатнае для іншага ўжывання — раскаленае, яно было апушчанае ў воцат, і таму стала размякчэлым. Як дзевяцьсот гадоў існаваў каралеўскі род, гэтак заставаліся аднолькавымі рэцэпты для кухараў і пекараў. Забарона на замежныя паездкі, забарона ўезду для іншаземцаў. Пяхота ў тыя часы таксама складалася з наймацнейшых ваяроў — гаплітаў, цяжкаўзброеных жаўнераў з дзідамі. Дзевяць тысячаў спартанцаў панавалі над пераўзыходнымі іх паводле колькасці ў дзесяць разоў карэннымі жыхарамі. Падчас пакарання смерцю адзін забіты спартанец быў роўны дзесяці ілотам. Гэта ўсё быў лагер, хутка перасоўнае войска, і калі шчыты ды шаломы сутыкаліся ды грымелі аб камяні, гэта быў іхны марш. Ніколі не паведамлялася колькасць загінулых, нават пасля пераможных баёў. Гора было тым, хто «здрыжэў». Арыстадэм, які «дрыжэў», адзіны, хто выжыў пасля бітвы пад Фермапіламі[52], паказваў пазней у бойцы пры Платэях вышэйшую мужнасць, але застаўся «баязліўцам», бо ў вачах усіх проста апантана шукаў смерці з прычыны ранейшага сораму.

Дарыйскі — любы кшталт антыфемінізму. Дарыйскі мужчына замыкае хатнія запасы на ключ і забараняе жанчынамназіраць за спаборніцтвамі: тую, хто наважыцца перайсці праз Алфей, скідваюць са скалы. Дарыйцам была знаёмая любоў да юнакоў, каб герой быў заўжды побач хлопцам. Гэта любоў вайсковых паходаў, і гэткія пары стаялі, як сцяна, і паміралі разам. Гэта была эратычная містыка — рыцар абдымаў хлапца, як жонку, і вучыў адмысловасці, далучаў яго да сваёй дабрачыннасці[53]. Дарыйцы таксама выкрадалі юнакоў: рыцар забіраў хлопца з сям'і, а калі яна была супраць — гэта быў вялікі сорам, і ён помсціў крывёю. Для хлопца, аднак, таксама сорам не мець апекуна. Гэта азначае не быць пакліканым да Героя. Яны сустракаліся ў святых месцах, прыносілася ахвяра, рыцар адорваў хлопца рыштункам і келіхам, і да трыццаці год апякаў яго ды выконваў за яго праўныя справы, а калі юнак рабіў нешта нягоднае, то пакаранне накладалася на рыцара, а не на юнака.

Калі дарыйцы працуюць над каменем, ён застаецца нефарбаваным. Постаці аголеныя. Дарыйскае — гэта скура, але вельмі рухомая, на цяглiцах, на мужчынскім целе. Цела, пацямнелае ад сонца, алею і пылу, скрабкоў і халоднае вады, звыклае да паветра, у выдатнай форме.

Кожны мускул, кожны падвяночак, сустаў адпрацаваны, адладжаны, узгоднены — усё цэльнае, ваяўнічае, але вытанчанае. Гімназіі былі школамі, дзе гэта ўсё паўстала і якія пашырыліся па ўсёй Грэцыі. Платон, Хрысіп, паэт Цімакрэон былі спачатку барацьбітамі, пра Піфагора ішла слава, што ён атрымаў першы прыз у кулачным баі, Еўрыпід таксама уганараваны вянком у Элеўсіне як барацьбіт. Цела сведчыла: нявольніцтва альбо валадаранне. Аднойчы Агесілай, вялікі спартанец, загадаў распрануць палонных персаў, каб вярнуць дух свайму войску. Грэкі, гледзячы на іх бляклыя, слабыя целы, смяяліся і потым ішлі на сваіх ворагаў поўныя пагарды. Паўз усю Грэцыю ішоў дарыйскі ўплыў: прыгожыя целы. Усе святы Багоў, усе вялікія фестывалі ператвараліся ў конкурсы прыгажосці. Абіралі найпрыгажэйшых старых, каб яны неслі галіны ў храмы, у Элідзе — найпрыгажэйшых мужчын, каб яны прыносілі святыя дары Багіне. Вялікія целы — у Спарце, падчас гімнапедый[54], калі знакамітыя грамадзяне і вайскоўцы былі недастаткова высокага росту, яны павінны былі ісці ў харавой працэсіі ў асобнай, бакавой калоне. Лакедэманійцы прысудзілі, паводле Тэафраста, пакаранне іхнаму цару Архідаму, бо ён ажаніўся з невысокай жанчынай, што нарадзіла б яму лялечных царкоў, а не цароў. Аднаго перса, сваяка Ксеркса, што памёр у Грэцыі, які быў найвялікшы ў персідскім войску, грэкі ўшаноўвалі як паўбога. Сярод барацьбітоў, якіх апяваў Піндар, былі волаты: адзін нёс на плячах быка, іншы спыняў вазы, яшчэ адзін кідаў цяжкі дыск вельмі далёка — і родныя грамады іх ушаноўвалі. Цела для натуральнай селекцыі — закон вызначаў узрост для ўзяцця шлюбу і лепшую дату для зачацця. Як на конных заводах, няўдалы

[52] Бітва ў Фермапілах (ст.-грэц. *Μάχη τῶν Θερμοπυλῶν*) — бітва ў верасні 480 г. да н. э. у часе грэка-персідскай вайны 480—479 гг. да н. э. у цясніне Фермапілы.

[53] Плутарх, Эліян і шэраг іншых аўтараў сцвярджаюць, што гэтая любоў мела ў Спарце чыста платанічны характар; уступаць з юнакамі ў фізічную сувязь лічылася ганьбаю і вінаватыя асуджаліся на выгнанне.

[54] Гімпапедыі (ст.-грэц. *Γυμνοπαιδίαι*, ад ст. — грэц. *γυμνός* 'аголены', 'няўзброены' і *παίς* 'моладзь, юнацтва'. У старажытнай Спарце штогадовае святкаванне ў гонар суайчыннікаў, загінулых на вайне, у часе якога аголеныя юнакі ў танцы спаборнічалі ў атлетычных і вайсковых здольнасцях.

прыплод знішчалі. Цела для Вайны, цела для Свята, цела для Заганаў, і, ўрэшце, цела для Мастацтва — гэта было дарыйскае семя і элінская гісторыя.

Элінскае разуменне Лёсу было дарыйскім: жыццё трагічнае, але яно суцішваецца Мерай і Ўстрыманнем. Дарыйскае ў Сафокла: *«добра, калі смяротны не хоча пераўзысці тое, што дадзена чалавеку»*. Дарыйскае ў Эсхіла: Праметэй тытанічны, з праклёнамі і клятвамі развітваецца ён з Сусветам і Эфірам, рабуе Багоў і ўсё адно паўсюль застаецца здабычай Мойры[55], Кону, Меры, моцна трымае яго і куе Раўнавага, нідзе не адпускае суворая Парка[56]. З Еўрыпідам пачынаецца чалавек, элінізм, гуманізм. З Еўрыпідам пачынаецца крызіс, гэта час заняпаду. Міф вычарпаны, Жыццё і Гісторыя робяцца тэмай. Дарычны свет быў мужчынскі, а цяпер ён эратызуецца, пачынаюцца любоўныя пытанні, жаночыя п’есы і назвы: Медэя, Алена, Алкеста, Іфігена, Электра, і сканчваюць гэтую серыю Нора і Геда Габлер[57]. Пачынаецца псіхалогія. Прыходзіць час, калі Багі становяцца малымі і вялікія людзі слабымі, усё становіцца штодзённым, пасрэднасцю Бернарда Шоў. *«Ты навучыў людзей балбатні і красамоўству*, — кажа ў «Жабах» Арыстафана Эсхіл супраць Еўрыпіда, — *праз цябе спусцелі палестры, паралійцы не слухаюць начальнікаў, а калі я быў жывы, яны толькі і рабілі што прасілі хлеба ды крычалі: за работу! І ўсё дзякуючы табе, Еўрыпід! І нават паходню панесці бегучы няма каму, бо ніхто ўжо не можа»*.

Знікла гімнастычнае выхаванне — і разам з ім знік дарыйскі свет, Алімпія, шэрыя калоны і добрыя прароцтвы аракулаў. Еўрыпід скептычны, адасоблены і атэістычны, агульныя паняткі ў яго з’яўляцца ўжо ізаляванымі: «Дабро», «Маёмасць», «Адукацыя», «Рацыя». Ён пацыфіст і антыгерой, выступае за мір і супраць сіцылійскай экспедыцыі. Ён разарваны і геніяльны, спрэс песімістычны і безумоўна дэманічны. Ён ідэнтычны з велічынёй і духам элінскага нігілізму, што пачаўся напрыканцы часу Перыкла, цяжкага крызісу перад канцом грэцкай эпохі: з мармуры на вяршыні замкавай гары, пад ударамі Фідыева разца, у бялізне ды ззянні квітнеючай прыгажосці ўзводзіцца ў вобразе Афіны Палады[58] яшчэ ніколі недасяжны, дасканалы, высокі класічны Стыль, але ў сваіх дамах грамадзяне-касмапаліты ўжо трымаюць малпаў, бавяцца каласальнымі фазанамі, а персідскія паўліны вабяць лакадэманянаў да гандляроў птушкамі, і на птушыныя баі ды замест містэрый вабяць вольных і метэкаў[59] у тэатр.

Дарыйскі свет быў найвялікшай грэцкай мараллю, ваяўнічым Парадкам і Ўладай, што сыходзіла ад Багоў. Легенды гэтага свету не ведаюць нічога пра запасы, скарбы, глыбокія пячоры, іхныя пачуцці скіраваныя не да золата, а да святых рэчаў — магічнай зброі з рук Гефеста, Залатога Руна, пацерак Гармоніі ды скіпетра Зеўса. Спарце: для чалавека яна была непазбежным Конам. Гэта людзі, што вельмі вылучаліся з астатніх грэкаў, былі вельмі аддаленыя духоўна і ледзь маглі з імі камунікаваць. Паўсюль бляклым святлом гарэла гэтая суворасць: іхны Бог вайны быў выяўлены ў кайданах, каб заставаўся заўсёды ім верным. У Афінах было падобнае з Нікай, якую пакінулі бяскрылай. Ваяводамі амаль усіх грэцкіх войскаў былі збольшага спартанцы, але спартанец пачуваўся дрэнна паўсюль, дзе не выступаў як пераможны змагар. Ён быў «сярэднявечным чалавекам», «выхаванцам Лікурга»[60], яму было забаронена правяраць законы, гэта быў чалавек з вартавой будкі і гімнаст, адсюль і выраз: *Spartam nactus es, hanc orna*[61]. *Спарта — гэта твая радзіма, таму ўслаўляй яе, клапаціся аб ёй, ты і Спарта — вы ўдвох разам, адныя ў грэцкім свеце.*

Яшчэ адна гісторыя з Герадота пра дарыйскую якасць, гэткую чужую Усходу ды ўсяму астатняму свету. Пасля Фермапілаў да персаў прыйшло некалькі перабежчыкаў, некалькі мужчын з Аркадыі. Персы прывялі іх да цара і спыталі, што робяць эліны зараз. Тыя адказалі, што грэкі святкуюць алімпійскае свята і ладзяць спаборніцтвы ў барацьбе. Персы спыталі пра прыз у спаборніцтвах, і грэкі адказалі, што пераможца атрымлівае аліўкавую галінку. Пачуўшы гэта, адзін з персідскіх начальнікаў сказаў, не здолеўшы трываць: «Гора табе, Мардоній, супраць якіх жа людзей ты вядзеш нас у бойку, што ў іх спаборніцтвы праходзяць не дзеля грошай, а дзеля адмысловасці». Гэтая адмысловасць, гэты вянок, гэтыя спаборніцтвы ў барацьбе паміж вялікімі бітвамі — гэтак за панэлінскім сілуэтам выступаў дарыйскі свет.

[55] Мойры (ст.-грэц. *Μοῖραι* ад *μοῖρα* ‘доля’) — грэцкія багіні лёсу.

[56] Паркі (лац. *Parcae*) — тры багіні лёсу ў рымлянаў, адпавядалі мойрам старажытных грэкаў.

[57] Нора і Геда Габлер — гераіні п’ес нарвежскага драматурга Генрыка Ібсена.

[58] Палада (ср. — грэц. *Παλλάς*) — у старагрэцкай міфалогіі — малочная сястра Афіны, дачка Трытона, выпадкова забітая Афінай яшчэ ў дзяцінстве. Паводле адной з версій гэтае імя стала часта ўжываным эпітэтам Афіны Палады.

[59] Метэкі, метойкі (ст. — грэц. *Μέτοικοι* ‘прыхадні’) — ў Старажытнай Грэцыі — клас непаўнапраўных жыхароў Атыкі. Метэкамі былі іншаземцы, якія сяліліся ў Афінах на працяглы час, а таксама адпушчаныя рабы.

[60] Лікург (ст. — грэц. *Λυκοῦργος*) — спартанскі заканадўца, якому прыпісвалася запачаткаванне палітычнага ладу ў Спарце, што існаваў цягам некалькіх стагоддзяў.

[61] У Спарце нарадзіўся — упрыгожвай яе справай (лац.).

Паміраючы ваяр.
Фрагмент скульптуры
з усходняга франтону храма
Афіны-Афаі на выспе Эгіна.
Суровы стыль, створана
каля 490—480 гг. да н. э.

Афіна кіруе бітвай
паміж грэкамі і траянцамі.
Фрагмент скульптурнай
кампазіцыі з усходняга
франтону храма Афіны-Афаі
на выспе Эгіна

Мы жывем ужо стагоддзе у час філасофіі Гісторыі, і калі падвесці яе вынік — яна не што іншае, як жаноцкае тлумачэнне нявыкарыстаных запасаў Улады. Пэўны час мы жывем ужо ў эпоху марфалогіі культураў, высокага росквіту капіталізму і рамантыкі, дастатковай для фінансавання экспедыцый да дзікіх народаў. Ліберальны век не мог трымаць народы і людзей у полі зроку (слова «трымаць», пэўна, было б надта жорсткім для яго), не мог бачыць сілу. Адносна Грэцыі гэта гучала так: Спарта была сумнай ардой ваяроў, кастай салдатаў, без культурнага пасылу, грэцкай перашкодай, *«усё паўставала супраць яе ўлады»*. Але сучаснае антрапалагічнае вучэнне прынцыпаў, што паўстае як новая навука, заўважае акурат у сіле і ў мастацтве дзве вялікія роднасныя стыхіі антычнага грамадства.

Грэцкая цывілізацыя ў любым выпадку вучыць наступнаму: скульптура расквітанела ў той самы момант, калі і грамадскія ўстановы, ў якіх можна ўдасканальваць цела, а яны ўзнікаюць у Спарце. Гэта момант, калі галава яшчэ не мела большага значэння за корпус альбо члены, твар не скрыўлены грымасамі, не апрацаваны дасканала, яго лініі толькі дапаўняюць іншыя лініі ды плашчыні. Выраз не задуменны, а, хутчэй, непарушны, амаль згаслы. Агульная постаць і сукупны рух, то бок Прырода, — гэткі сэнс фігураў, гэта статуі целаў, у іх яшчэ няма душэўных элементаў. Гэта выявы членаў гімназістаў, ваяроў, барацьбітоў. Гэткая статуя цвёрдая, шмат важыць, вакол яе можна абысці, і глядач будзе усведамляць яе масу, статуя голая; а вось ідзе атрад з купання і з бегу, таксама аголены, і можна параўнаць — гэта развівае ды выхоўвае гледача.

Гэта час, калі аркестр, дагэтуль не вельмі ясна вызначаная дзея для пахаванняў, маршаў юнакоў, імправізацыйных песенек альбо песень хвалебных ці помслівых яднаецца разам з лірычна-музычнай паэзіяй, з гімнастыкай, пачатковай клеткай спаборніцтваў. Гэта ўсё адбываецца ў дарыйцаў у Спарце. Тут яно ўсё зрастаецца, салдацкі дух адшліхтоўвае ўсё разам, звязвае ўсё адно з адным. Адсюль культура пераносіцца ваяводамі ва ўсю астатнюю Грэцыю. Хор, статуі, але таксама музыка. Дарыйцы былі з натуры вельмі музычнымі, мелі выдатны слых, вольна спявалі і пры гэтым умелі рухацца. У народзе былі пашыраныя нязменныя тыпы мелодый, гэтак званыя «намоі», старажытныя песні, напевы для піроў, песні ткачоў, песні кудзелі, песні жняярак, песні карміліц, песні пастухоў. Сюды ж адносяцца старажытныя танцы, адзін назваўся «Высыпанне збожжа», другі — «Уздыманне шчытоў», трэці — «Совы». Сёння мы не можам ужо ахапіць большасць старой музыкі, у якой словы і таны ўвайшлі ў метрычна-меладычную звязку, не можам перажыць яе цалкам, гэта было адмысловае спалучэнне музыкі і гімнастыкі, танца і мімічнай дзеі, якія называлі гімнапедыямі і якія былі ўзнятыя на панэлінскі ўзровень Такетам з Спарты ў часе 28-й Алімпіяды. Гэта былі паэмы для хораў, яны суправаджаліся рухамі, якія сталі вытокам для больш высокіх форм лірыкі і трагедый, і каб разумець гэта напоўніцу, мы мусім зважаць, што гэта з'явілася ў Спарце. Спарта называлася *«найбагацейшай на спевы сярод усіх грэцкіх дзяржаваў»*, гэта быў музычны цэнтр, тут у 676 г. да н. э. музыка была ўлучана ў Спаборніцтва як Мусічны Агон[62], тут былі сабраныя разам розныя народныя манеры спеву з розных дарычных мясцовасцяў ды арганізаваныя паводле мастацкіх правілаў, тут быў пакладзены пачатак усеагульнай сістэмы ладоў. З 645 г. да н. э. тут існаваў Заканадаўца музыкі, яна стала юрыдычна замацаваным навучальным прадметам і павінна была практыкавацца ўсімі жыхарамі Спарты да трыццацігадовага ўзросту. Усе мусілі граць на флейце, праз паэзію і спевы законы перадаваліся нашчадкам, і ў бітву рушылі пад гукі флейты, ліры[63] ды кіфары[64]. *«Трапная ігра на кіфары папярэднічае мячу»*, — спяваў Алкман[65].

Усё гэта вялікі Горад салдат нёс разам са сваімі ваярамі праз усю Грэцыю: дарыйскую Гармонію, высокую харавую Паэзію, чын Танцу, будаўнічы Стыль, суворы салдацкі парадак, поўную Аголенасць барацьбітоў ды ўзведзеную да сістэмы Гімнастыку. У дзевятым стагоддзі рух пашырыўся, пачалі аднаўляцца перарваныя Гульні, і ад 776 г. Алімпіяда стала эрай і цвёрдай кропкай, што звязвала ланцугом гарады і часы. Спартанскім пакліканнем было непадзельнае адзінства спорту, музыкі, паэзіі, гімнастыкі, спаборніцтваў ды статуй пераможцаў. Норавы і звычай Лакедэмона[66] выціснулі гамераўскія. Хутка ўжо не

[62] Агон (ст.-грэц. *ἀγών*) — змаганне або спаборніцтва ў старажытных грэкаў, агонамі пераважна называліся гульні, якія адбываліся з нагоды рэлігійных або палітычных святаў. Мусічны агон — музычнае спаборніцтва.

[63] Ліра (ст.-грэц. *λύρα*) — струнны шчыпковы інструмент.

[64] Кіфара (ст.-грэц. *κιθάρα*) — старагрэцкі струнны шчыпковы музычны інструмент, найбольш важная ў антычнасці адмена ліры.

[65] Алкман (ст.-грэц. *Ἀλκμάν*, 2-я пал. VII ст. да н. э.) — старагрэцкі паэт, прадстаўнік харавой лірыкі і адзін са стваральнікаў канонаў грэцкай паэзіі.

[66] Лакедэмон (ст.-грэц. *Λακεδαίμων*) — персанаж старагрэцкай міфалогіі, сын Зеўса і плеяды Тайгеты, паводле падання заснаваў Спарту, і таму яго імя стала сінонімам гэтай краіны. Лакедэманяне — спартанцы.

застаецца гарадоў без гімназій, наяўнасць гімназіі становіцца адной з абавязковых рысаў грэцкіх гарадоў. З гэткіх чатырохкутнікаў з порцікамі і алеямі платанаў, побач з крыніцамі альбо ручаямі, паўставала Акадэмія і высокая Філасофія ў ёй. Пазней у Грэцыі нават казалі, што спартанцы тройчы ратавалі гібеючую грэцкую музыку, і Спарта выяўлялася ў выглядзе жанчыны з лірай. Менавіта гэткая Спарта, дзе быў створаны першы будынак для музычных і драматычных прадстаўленняў, круглы будынак з намётавым дахам, які з'явіўся на Карнейскіх гульнях з 26-й Алімпіяды. Пазней гэты прыклад пераняли і ў іншых гарадах, але спартанскі будынак стаў узорам і для Афінаў для будынкаў Адэёна і Тэатрона.

Але найбольш значным здаецца выяўленне апаланічна-спартанскага духу ў пластыцы. Скульптура, спачатку драўляная, затым у метале, сланoвай косці і мармуры, павольна, крок за крокам і троху адасобена суправаджае культываванне прыгожага цела ў Грэцыі — гэта развіццё дарыйска-элінскага свету. Спачатку цалкам натуралістычнае, ўзніклае па загадзе і заданні. Потым усё больш пераймаліся законы з самога матэрыялу, вечнага матэрыялу — каменю. Анатомія аголенага цела, што вывучалася ў гімназіях і на пляцоўках для барацьбы, дала адмысловае валоданне вачыма, у выніку ўнутраны вобраз пазбаўляецца ад усяго выпадковага і абрыс Багоў ды Пераможцаў паўстае больш вольным. Мацней і мацней становіцца грэцкая цывілізацыя, усё больш гераічнай і небяспечнай яе гісторыя («трагічны век»), ўсё больш глыбокай, неабходнай становіцца ўнутраная сувязь ды знешняе падпарадкаванне скульптурнай фігуры. Больш не працуе вока — працуе закон, дух. Тут развіваюцца суадносіны, што доўжыліся чатырыста гадоў: суадносіны грамадскага гвалту і мастацтва, суадносіны гераічнага настрою, паводзінаў ды ўчынкаў, ад бітваў пры Марафоне і Саламіне да формаў апошняга стылю Парфенона[67]. Тут можна насамрэч казаць пра нараджэнне мастацтва з улады, у працэсе гісторыі статуі, і ў гэтым месцы ў любым разе.

[67] Парфенон (ст.-грэц. *Παρθενών* 'дзева; чысты') — помнік антычнай архітэктуры, храм, размешчаны на афінскім Акропалі галоўны храм Афінаў, прысвечаны апякунцы гэтага горада і ўсёй Атыкі, багіне Афіне-Цнатлівай (*Ἀθηνᾶ Παρθένος*). Збудаваны ў 447—438 гг. да н. э. архітэктарам Калікратам паводле праекта Ікціна ды аздоблены ў 438—431 гг. да н. э. пад кіраўніцтвам Фідыя.

Гэткай была Спарта, гэта была першая кропка, першая клетка грэцкага духу. Вышэйзгаданы факт не супярэчыць, аднак, таму, што спартанец як чалавек быў досыць чужы ў астатнім грэцкім свеце. Спарта назаўсёды засталася тым, у якой якасці была заснаваная, — горад ваяроў, тады як усе іншыя гарады зрабіліся панэлінскімі, сіцылійскімі або азіяцкімі. Зноў і зноў акрэсліваць ды пільна ахоўваць межы — гэта адна з містэрый улады, паводле якой існавала Спарта, і ёй удалося здабыць апошнюю перамогу, даўшы памерці Грэцыі ў тым горадзе, дзе яна пачыналася. Адчуванне велічыні Дарыйскага свету насамрэч цягнецца праз стагоддзі і праз усе палітычныя супольнасці, своеасаблівы смутак па Спарце заўжды заставаўся ў Грэцыі! «Лаканізонты», альбо прыхільнікі Спарты, і тыя, хто захапляўся спартанскім стылям, заўжды былі ў Афінах. У цяжкія часы яе зноў і зноў называлі «выхавацелькай», і вельмі цікава, што Платон, духоўна апошні дарыец, і ў часе разладу яшчэ раз узнавіў змаганне супраць індывідуалізму, спакуслівай меланхоліі ў мастацтве, «салодкай Музы», «мастацтва святлацені», каб выступіць за «грамаду» і «разумныя думкі», «умеркаванае жыццё», «горад з бездакорнымі законамі». Ён выказвае гэты смутак па Спарце ў дыялозе «Феаг» ад імя дабрачыннага мужчыны: *«У цудоўнай гармоніі яго словаў і ўчынкаў зноў пазнаецца дарыйская манера, адзіная сапраўды грэцкая»*. Гэта было праз пяцьсот гадоў пасля Лікурга. Адсюль таксама можна зразумець ягоныя сапраўды спартанскія словы супраць мастацтва, амаль незразумелыя ў вуснах стваральніка экстрэмальна ідэалістычнай карціны свету: *«Калі ты, Глаўкон, сустрэнеш панегірыстаў Гамера, якія сцвярджаюць, што гэты паэт стварыў Эладу, то ведай, што ён быў, вядома, самы красамоўны і першы сярод трагічных паэтаў, але ў дзяржаве трэба прымаць толькі тую частку паэтычнага мастацтва, якая стварае хваласпевы Багам ды найлепшым мужчынам»*. Так кажа гэты высокі інтэлектуал, вялікі мастак і першы носьбіт цяжкага псіхафізічнага падзелу, прорву якога не змаглі закрыць цэлыя дзве тысячы гадоў. Значыць, гэтак вуснамі гэтага глыбокага, трансцэндэнтнага, запозненага чалавека, праз усю крытыку пазнання і дыялагічна-артыстычную вытанчанасць, яшчэ раз прамаўляе мужчынскі лагер на правым беразе Эўрота, прамаўляе Спарта, прамаўляе Улада.

Бітва паміж грэкамі
і траянцамі. Фрагмент
скульптурнай кампазіцыі
з заходняга франтону
храма Афіны-Афаі
на выспе Эгіна



Мармуровая скульптура багіні, імаверна Персефоны, з горада Тарас, паўднёвая Італія. Суровы стыль, 480—460 гг. да н. э.

Такім чынам, мы выводзім Грэцыю са Спарты, а грэцкі свет з дарыйска-апаланійскага элементу. Дыяніс тут зноў стаіць у межах, у якіх ён быў да 1871 году («Нараджэнне трагедыі з духа музыкі»). Грэкі былі прымітыўным, то бок схільным да ап'янення народам, іх ушанаванне Зеўса мела аргаістычныя рысы. Вялікія хмяльныя хвалі ўзрушэння ўздымаліся ў іх перыядычна, таксама і ў Спарце, шмат катарсічнага[68] перанялі яны з культаў Крыту. Але ж разам з тым мы ведаем з фільмаў і турыстычных дзённікаў шмат прымітыўных народаў, прыкладам, негрыцянскае расы, існаванне якіх здаецца неперарыўным шэрагам приступаў ап'янення, але з гэтага не паўстае вялікага мастацтва. Між ап'яненнем і мастацтвам павінна ўвайсці Спарта, Апалон, магутная выхаваўчая сіла. Але як мы сёння ўжо не натхняемся па-вагнерыянску, маючы патрэбу ў доказах існавання Трыстана ўжо ў Фракіі, то мы глядзім у кірунку Дарыйскай краіны, а не Дыянісійскай, мы выразна пытаемся ў сябе саміх пра грэцкі свет.

[68] Ка́та́рсіс (ад ст.-грэц. *κάθαρσις* 'узвышэнне, аздараўленне, ачышчэнне'). Паняцце ў антычнай філасофіі, тэрмін, які азначаў ачышчальны працэс спрыяльнага ўздзеяння на чалавека розных фактараў. Слова ўжывалася ў розных значэннях: рэлігійным (ачышчэнне духа праз душэўныя перажыванні), этычным (узвышэнне чалавечага розуму, пачуццяў), фізіялагічным (палёгка пасля моцнага напружання).

Падвядзем вынікі і паспрабуем стварыць перспектыву. Мы бачым разнастайнае валадарства элінаў, пабудаванае з асобных гарадоў і дзяржаў, і ў кожным з іх мы бачым нешта невымоўнае, з гледзішча прагі да ўлады, жорсткасці, карупцыі, гнюснасці, здзічэння, забойства, змоваў, эксплуатацыі, шантажа і вымагальніцтва. Сярод найвялікшых мы бачым гэткія злачынныя тыпы, як Алківіад, Лісандр, Паўсаній, наймярзотных, як Клеахас, бачым хлусаў як ратаўнікоў дзяржавы, якіх у святочнай калясніцы вязуць у Прытаней[69], дзе яны піруюць, як Дыяклеід, віж па справе аб апаганьванні гермаў[70], які тут жа прызнаўся, што схлусіў. Мы бачым падман, які просіць даравання, прыўкрашаны — не заўважылі кляймо на мяхах з дзяржаўнымі грашыма, і трыста талантаў зніклі; непрыўкрашаны, нахабны, як крадзёж проста з касы; публічна легалізаваны, капіталістычны: *«трыбуна аратара — гэта залаты ўраджай»* — гэткая была прымаўка, яна мела на ўвазе «таемны подкуп дзяржаўных аратараў». Мы бачым прадажных суддзяў: апраўданне забяспечана, нават калі вонкі тырчаць ручкі крывавых нажоў, водкуп ад нежаданых працэсаў, сікафанты (прафесійныя і афіцыйныя даносчыкі) і контрсікафанты, якія *«носяцца тудысюды па агоры*[71]*, бы скарпіёны з узнятымі джаламі»*. Цэлыя пакаленні, цэлыя сістэмы. *«Я — сведка ў працэсах на выспах, сікафант і віж. Корпацца ў зямлі я не люблю, ужо мой дзед жыў з даносаў»,* — кажа адзін з герояў Арыстафана. Мы бачым прыкметы сучаснага грамадства, сучаснай дзяржавы, сучаснай улады.

Нельга казаць, што антычнасць далёкая ад нас — ні ў якім разе. Антычнасць вельмі блізкая, яна поўная ў нас, культурнае кола яшчэ не замкнёнае. Ідэалістычная сістэма якога-небудзь сучаснага філосафа бліжэй да Платона, чым карціны свету сучаснага эмпірыка; сучасны, рэлятыўны нігілізм у якасці афектыўнай позы цалкам ідэнтычны гэтак званаму піранейскаму скептыцызму[72] III ст. да н. э. Песімізм Анаксімандра[73], вядомае і гэтак часта ўзгаданае яго выслоўе: *«Адкуль рэчы маюць пачатак, туды мусяць яны і вяртацца пасля, разбураючыся, паводле патрэбы, бо яны мусяць кампенсаваць за тое, каб іхныя несправядлівасці былі выпраўленыя адпаведна парадку і часу»* — гэта проста спалучае Ніцшэ з Шапэнгаўэрам. Праблема рэчы ў сабе ўздымаецца і да сёння не развязаная. Праблема развіцця бярэ свой пачатак і ў нас робіцца толькі больш заблытанай. *Ignorabimus*[74] *Дзюбуа-Рэймона праходзіць праз quod nihil scitur*[75] *французскага XVI-га стагоддзя да самога лейтматыву усёй элінска-раманскай эпохі. Альбо возьмем палітычны абсяг, увесь палітычны дыскурс існуе ўжо ў пятым стагоддзі да нашае эры: «грамадская карысць», «грамадзянская роўнасць», «партыйнае жыццё». Аб'ектыўнае супрацьстаянне бедных і багатых, простага люду і арыстакратыі, алігархічнага і дэмакратычнага кіравання, царскага і народнага. Былі ўжо вядомыя «народныя святы», «нацыянальныя ўрачыстасці», святкаванні «замежнага» элінства. Вяліся размовы пра «знешнія франты»: на поўначы былі мужныя і вольныя, але барбарскія дзяржавы, на ўсходзе, у Азіі — культурныя, але баязлівыя і скораныя, а мы тут у эпіцэнтры сваіх уласных палітычных прынцыпаў.*

Калі разглядаць гэта ўсё не з маральнага, сентыментальнага альбо гістарычнафіласофскага гледзішча, а паводле прынцыпаў антрапалогіі, то з аднаго боку мы бачым Уладу, а побач з ёй — іншы пачатак элінскага народнага духу: Мастацтва. Як паводзяць сябе гэтыя два пачаткі, якія ў іх адносіны? Не будзем прымаць ва ўлік тое, што некаторыя мастакі пакідалі сваю радзіму з горыччу, расчараваныя і варожа настроеныя — гэта індывідуальныя рысы. Забудзьма таксама пра тое, што Фідый нібыта памёр у астрозе, бо скраў слановую костку. Таксама не будзем разглядаць унутраныя крызісы і катастрофы, спаборніцтвы асобных школаў і канструкцый. Але ж будзьма глядзець на пакрысе паўсталы, цягам шматлікіх вякоў, апошні, класічны Стыль, яго з'яўленне падчас заняпаду дзяржавы і хуткі канец. Калі мы будзем разглядаць гэта, то ўбачым, як пад абаронай сваіх салдат дарыйцы ўбудоўваюць грэцкую мастацкую практыку ў дзяржаву і праносяць свае прынцыпы праз усю Эладу. І гэты ўнёсак улады аграмадны, але тое, што практыкаванне ў мастацтве ўвогуле мела месца і змагло пачаць гэткае развіццё, вядома, было фактам расы, пароды, вольных генаў. Як цэлае, гэта было нагэтулькі аграмадным вывяржэннем новага чалавечага элементу, што можна разглядаць яго толькі як абсалют, падпарадкаваны ўласным законам, з'яву, якая сама сябе сілкавала, нічым наўпрост не

[69] Прытаней (ст.-грэц. *πρυτανεῖον*) — у старажытнай Грэцыі — дарадчы орган, дзяржаўная рада, у якім засядалі прытаны-дарадцы, а таксама будынак, дзе адбываліся паседжанні.

[70] Герма (ст.-грэц. *ἕρμα*) — чатырохгранны слуп, завершаны галавой, пачаткова бога Гермеса (адсюль паходзіць і назва), затым іншых багоў, а з V ст. да н. э. і партрэтнымі выявамі дзяржаўных дзеячаў, філосафаў і г. д.

[71] Агора (ст.-грэц. *ἀγορά*) — рынкавая плошча ў старагрэцкіх полісах, якая быца месцам агульнаграмадзянскіх сходаў.

[72] Піранейскі скептыцызм, піранізм — вучэнне старагрэцкага філосафа Пірона з Эліды, заснавальніка антычнага скептыцызму.

[73] Анаксімандр Мілецкі (ст.-грэц. *Ἀναξίμανδρος*, 610—547/540 гг. да н. э.) — старагрэцкі філосаф, прадстаўнік мілецкай школы натурфіласофіі. Увёў тэрмін «закон», ужыўшы панятак грамадскага жыцця да прыроды і навукі. Анаксімандру прыпісваюць таксама адну з першых фармулёвак закона захавання матэрыі.

[74] І не даведаемся (лац.). Скарочаны выраз *ignoramus et ignorabimus* (лац. 'не ведаем і не даведаемся') — словы з дакладу філосафа Эміля Дзюбуа Рэймона «Пра межы пазнання прыроды». Сэнс выразу заключаецца ў тым, што паводле меркавання Дзюбуа-Рэймона, мы ніколі не пяройдзем вызначанай чалавечаму духу мяжы ў пазнанні прыроды.

[75] Нічога не вядома (лац.). Назоў кнігі партугальскага філосафа Францыска Санчаса (1550—1623 гг.), дзе скептычна ацэньваў ролб навукі ў пазнані прыроды.

абумоўленую, ніякімі Багамі і ніякай Уладай. Можна ўбачыць іх побач — Мастацтва і Ўладу. Мабыць, гэта пойдзе на карысць абодвум: Улада — як сталёвыя абцугі, якія сілай забяспечваюць грамадскі працэс, тады як без дзяржавы ў стане натуральнае *bellum omnium contra omnes*[76] *грамадства не можа ўкараніцца ні ў чым шырэйшым за сям'ю (Ніцшэ). Альбо, паводле Буркхардта*[77]*, «толькі на ўладзе, на забяспечанай ёй глебе, могуць вырастаць культуры найвышэйшага рангу»*. У яго мы знаходзім яшчэ адзін выдатны выраз пра Спарту: *«Яшчэ ніколі ўзнікненне новае сілы не адбывалася мякка, і Спарта сапраўды стала гэткай прынамсі адносна ўсяго, што існавала вакол яе. Увесь культурны свет трэба забавязаць прымаць яе ў разлік да сканчэння свайго веку — вялікая чароўнасць магутнай волі, нават для наступных тысячагоддзяў, нават калі гэтаму не спрыяе ніякая сімпатыя»*.

Можна, пэўна, сфармуляваць гэта і наступным чынам: Дзяржава, Улада ачышчае індывіда, фільтруе яго ўзрушанне, робіць яго кубічным, стварае яму плашчыню, робіць яго здатным да мастацтва. Так, гэта мусіць вельмі трапна: Дзяржава робіць індывіда здатным да мастацтва, але перайсці ў Мастацтва — гэтага Улада ніколі не можа. Мастацтва і ўлада могуць мець агульныя вопыты перажывання міфічнага, палітычнага і народнага зместу, але мастацтва само па сабе застаецца Самотным Узвышаным Светам. Яно застаецца законам самога сябе і не выяўляе нічога апрача сябе. Таму калі мы зноў зараз звернемся да істоты грэцкага мастацтва, то ўбачым, што дарыйскі храм, вядома, нічога не выяўляе, ён не паддаецца разуменню, і калона не ёсць натуральнай. Яны не змяшчаюць у сабе аніякай канкрэтнай палітычнай альбо культавай волі. Яны ўвогуле ні з чым не паралельныя. Але Цэлае ёсць Стыль, гэта значыць, з гледзішча знутры — пэўнае адчуванне прасторы, пэўны жах прасторы, з вонкавага гледзішча — гэта выглядае, як пэўныя збудаванні і прынцыпы, каб іх выявіць, праявіць, начараваць. Гэты выяўленчы прынцып вырастае не беспасярэдне з прыроды, як палітычнае Жыццё і Ўлада, але з антрапалагічнага прынцыпу, што з'явіўся пазней, не раней, чым з'явілася прыродная аснова творчасці. Можна таксама сказаць, што ў новым творчым акце ён дасягнуў самасвядомасці як прынцып, стаў чалавечай энтэлехіяй[78], пасля таго як дагэтуль у якасці патэнцыі і актыўнасці ён рушыў працэс утварэння і перакройвання прыроды.

Антычнасць — гэта і ёсць новы паварот, зыходнай кропкай ператварэння гэтага прынцыпу ў процілеглым руху ў «ненатуральнае»; рух супраць чыстай геалогіі і раслінніcці, дзеля таго, каб стаць Стылям, Мастацтвам, Змаганнем, Уцягваннем ідэальнага быцця ў апрацаваны матэрыял; глыбокае Выпраменьванне, а затым і Распусканне матэрыялу, Адчужанне формы ў самоце, накшталт узвышэння ды ўзвядзення на новую прыступку Зямлі і Свету.

Гэта становіцца Выяўленнем, менавіта так Антычнасць успрымалі ўсе, хто стварыў і вызначыў заходнееўрапейскае культурнае кола, трапляючы пад яе вызначальны ўплыў: Ніцшэ, узяты ў цэлым, ператварэнне тытанічнага нагрувашчання цяжкіх, прыроднаарганічных блокаў Навукі, Маралі, Светагляду, Інстынкту, Сацыялогіі, усіх гэтых «нямецкіх хваробаў густу» — у валадарства лёгкага свету, вясёлай Геі, у школу духоўнага і мысленчага аздараўлення, у нацыянальную інтраверсію; палітычнае «светагляднае» — у прасторнае і імперскае, можна сказаць, у прастору, поўную Ўлады, у Дарыйскую прастору. Пад'ём рэлігійнага з пурытанскай пасіўнай ідэалогіі — ва ўпарадкаванае і эстэтычнае. Пра гэта можна было б сказаць і геаграфічна: з назарэйскага ў абсяг улюбёных вобразаў Ніцшэ, правансальскага і лігурыйскага. Перанос чыста расава-біялагічнай ўтопіі, гэтага нашчадка гібеючага свету маралі, — ва ўсвядомленую паводле формы, духоўна ашліхтаваную, дысцыплінаваную практыку. І пры гэтым форма ніколі не пакутуе на стому, на распусканне і пустэчу ў сэнсе нямецка-буржуазным, але паўстае як выключна чалавечая улада, Улада як гэткая, Перамога над голай рэальнасцю і абставінамі цывілізаванасці, менавіта ў якасці заходняга духу, як пераўзыходжанне, рэальна існуючы Дух ва ўласнай катэгорыі, як ураўнаважванне ды збіранне фрагментаў. Ніцшэ як цэлае адным адзіным радком — гэта магла быць толькі найглыбейшая яго думка: *«Існаванне і свет вечна апраўданыя толькі як эстэтычны феномен»*. І гэты выраз — элінскі.

Але тут мы таксама бачым і Гётэ. Ягоная Іфігенія фактычна і палітычна абсалютна ненатуральная. Нехта сядзіць у Веймары сярод прыдворных і бюргераў у стылі бідэрмаер[79], але піша пранізлівыя вершы на шлях смерці або стварае вусцішны за-

[76] Вайна ўсіх супраць усіх (лац.)

[77] Якаб Буркхардт (ням. *Jacob Christoph Burckhardt*, 1818—1897 гг.) — швайцарскі гісторык культуры, якія быў адным з пачынальнікаў культуралогіі як самастойнай дысцыпліны, аўтар канцэпцыі «Дзяржава як твор мастацтва» (*Der Staat als Kunstwerk*).

[78] Энтэлехія (ст.-грэц. *ἐντελέχεια* 'здзейсненасць') — у філасофіі Арыстотэля — унутраная сіла, якая патэнцыйна змяшчае ў сабе мэту і канцавы вынік, прыкладам, сіла, дзякуючы якой з грэцкага арэху вырастае дрэва.

[79] Бідэрмаер (ням. *Biedermeier*) — мастацкі стыль, пашыраны ў нямецкім і аўстрыйскім мастацтве ў 1815—1848 гг. У бідэрмаеры адлюстраваліся мастацкія густы «бюргерскага» асяроддзя, характарызаваныя прастадушнасцю і мяшчанскасцю.

клён для Танталідаў[80] — для такой ступені ненатуральнасці няма слова. Нічога прыземленага не кранае іх, ніякая праблема не запаўняе, за імі не стаяць аніякія наіўныя прычыны і следствы. Тут дзейнічаюць аддаленыя, узвышаныя эстэтычныя законы, уласцівыя самой пародзе мастацтва, родам з Антычнасці. Тое, што менавіта яны перамагаюць ды свецяць і праходзяць праз вякі, мае прычынай тое, што яны ляжаць у асяродку антрапалагічнага прынцыпу, яго восі, верацяна Неабходнасці: чалавека — гэта раса, адзначаная Стылям. Стыль вышэйшы за праўду, ён сам у сабе нясе доказы існавання. Праўда мусіць заўсёды правярацца, яна інструментарый прагрэсу. *«Думка — гэта заўсёды нашчадак патрэбы»*, — кажа Шылер, у якога мы сапраўды адчуваем свядомае змяшчэнне восі светаўспрымання з маралі ў эстэтыку. Думка ў яго заўжды стаіць побач з мэтазгоднасцю і задавальненнем інстынктаў, побач з сякерамі і моргенштэрнамі[81], яна ёсць Прырода, але ў гэтай сваёй форме ёсць Далечынёю і Працягласцю. Дзе знаходзіцца дрэва спазнання, там заўсёды грэхападзенне (гэткая гэтая карціна свету), там раздрай, скасаванне, выгнанне. Мастацтва ж — гэта чын захавання пароды таго ці іншага народу, яго вызначальная здольнасць працягвацца і пакідаць спадчыну. Сціранне ўсіх ідэалагічных напружанняў апрача Мастацтва і Гісторыі. Гэта бачылі ўжо рамантыкі, ад Наваліса[82] ідзе надзвычайная фармулёўка: *«мастацтва як прагрэсіўная антрапалогія»*.

Эпохі сканчваюцца разам з іх мастацтвам, і чалавечы род скончыцца разам з мастацтвам. Спачатку былі яшчары, а потым — парода і мастацтва. Голад і любоў — гэта палеанталогія, і ў інсектаў ёсць усе кшталты панавання ды падзелу працы; тут жа гэтае апошняе бралі на сябе Багі і мастацтва, пазней — толькі мастацтва. Позні свет, створаны на папярэдніх прыступках, на ранніх формах быцця, — у ім усё выспявае. Усе рэчы ператвараюцца ў паняткі і катэгорыі, змяняюць свой характар у той момант, калі пачынаюць разглядацца ўнутры мастацтва, аддаючы яму сябе. Чалавек, сумесь, мінатаўр, як прырода — вечна ў лабірынце, а ў вытанчаным варыянце — канібал, тут чысты, як акорд, узвышаны, як маналіт, і ён вырывае стварэнне з рук пачвары.

Мы глядзім услед Дарыйскаму свету, услед народам Стылю, мы прыслухоўваемся да іх, нават калі іх ужо няма, іхні час асвячае іншыя землі, бы сонца асвячае калоны, тады як на старых землях растуць адно асфадэлі[83]. І яны звяртаюцца яшчэ раз з глыбіні, з аскепкаў, з бронзы, пакрытай ракавінамі, што адымаюць у мора і патанулых пірацкіх караблёў лаўцы прыдонных рыбаў, — яны крычаць нашчадкам пра закон, Закон Абрысаў, нейкі закон, які, звяртаючыся да нас, нідзе не кажа з большай сілай, чым са стэлы бягуна, які памірае (канец VI ст. да н. э., Атыка, Тэсэён, Афіны), знутры яго біялагічна немагчымых рухаў, даступных толькі для стылізацыі ў пароскім мармуры. Гэта Закон супраць Жыцця, закон толькі для герояў, толькі для тых, хто працуе над мармурам і адлівае галовы са шлемамі. *«Мастацтва — гэта больш, чым Прырода, а бягун — менш, чым жыццё»*, і гэта значыць, што Жыццё прагне большага за Жыццё, прагне Абрысаў, Стылю, Абстракцыі, паглыбленага жыцця — Духу.

«*Усё Жаданне прагне Вечнасці*», — сказана ў папярэднім стагоддзі, а новае працягвае: «*Уся Вечнасць прагне Мастацтва*». Абсалютнага мастацтва, Формы. Аднак, *«усё прыгожае цяжкое, і хто набліжаецца да яго, павінен голы змагацца са сваімі постацямі ў поўнай самоце»* — гэта першы; *«і ён павінен загінуць»* — а гэта другі радок дарыйскага верша. Застаюцца адно Законы, яны перажывуць усе эпохі. І мы ўзгадваем аднаго вялікага Паэта з народу пасля грэкаў, што верыў у нормы Прыгажосці, падобныя да запаветаў нейкага Бога, якія захоўваюць вечнае ў створаным. Ён казаў, што выгляд некалькіх калонаў Акропаля перадае прадчуванне таго, якой несмяротнай прыгажосці можна было дасягнуць пэўным размяшчэннем сказаў, слоў і гукаў. Сапраўды, ён не верыў, што ў мастацтве ёсць толькі знешняе.

[80] Танталіды — у старагрэцкай міфалогіі — нашчадкі Тантала (ст.-грэц. Τάνταλος), цара Сіпіла з Фрыгіі. Правініўшыся перад багамі, увесь ягоны род быў пракляты, а ўнукі ды ўнічкі былі растраляныя Апалонам і Артэмідай з лукаў.

[81] Маргенштэрн (ням. *Morgenstern* 'ранішняя зорка') — бронзавы літы шар з укручанымі ў яго сталёвымі шыпамі. Выкарыстоўваўся ў сярэднявечнай Еўропе ў якасці наверша паліцаў і кісцянёў.

[82] Наваліс (ням. *Novalis*, псеўданім, сапраўдн. — Фрыдрых фон Гардэнберг (*Friedrich Philipp Freiherr von Hardenberg*), 1772—1801 гг.) — нямецкі пісьменнік, паэт, містык. Адзін з прадстаўнікоў нямецкага рамантызму.

[83] Паводле ўяўленняў старажытных грэкаў у Аідзе (падземным свеце) існавалі палі з раслінай асфадэль (*ἀσφόδελος λειμών*) па якім блукалі душы памерлых, што не зрабілі злачынстваў, за якія скіроўвалі па палі пакаранняў, і не настолькі гераічных і праведных, каб трапіць у Элізіюм. На палях асфадэляў цені толькі забывалі мінулыя жыцці, таму асфадэль стаў сімвалам забыцця.

ЗАГАДКИ РОМАНА СУСТОВА

Ольга Борщёва

Ольга Борщёва — магистр социологии, аспирант Института философии НАН Беларуси. Закончила отделение философии Белорусского государственного университета и магистратуру Европейского гуманитарного университета по специальности «Визуальные и культурные исследования». Сфера интересов — философия искусства и эстетика, современная французская социология искусства, художественный рынок.

СIВЕРА

Власть, 2010 г.

Мгновения вчерашнего дня и минувших веков: удар меча, подкрашивание ресниц перед зеркалом из шлифованного металла, смертельный выстрел из мушкета, столкновение каравеллы с рифом пребывают в нас, ожидая воплощения.

Чеслав Милош

В экслибрисах белорусского художника Романа Сустова причудливо сочетаются художественные традиции эпохи Средневековья, Ренессанса и Реформации. Рассматривая его работы, мы словно погружаемся в фантастический мир грёз и сновидений, где в ином измерении метафорически переплетаются между собой осколки минувших веков, создавая новое художественное единство. Удлинённые изломанные силуэты и обнажённые каркасные конструкции действуют на зрителя завораживающе.

Чёткие, мужественные линии Сустова дают старым, хорошо испытанным сюжетам новую жизнь. Очередная встреча с хорошо знакомыми персонажами переживается как событие. Например, свидание с героиней средневековой легенды леди Годивой, которая у Романа Сустова предстаёт в образе девственницы, ведь только она и способна оседлать единорога. (Пусть здесь есть только чёрный и белый, всё равно, благодаря Джону Кольеру и Осипу Мандельштаму, мы всегда будем помнить, что «грива» у леди Годивы «рыжая»).



Основание, 2006 г.

Создавая красоту целого, свои партии в экслибрисах Сустова исполняют многочисленные образы-символы, такие как птица, рыцарь, готический собор, ангел, корабль, лев, яблоко, рыба. Комбинируя их, Сустов, подобно художникам эпохи Возрождения, конструирует в своих работах сложные аллегорические системы. Ведь аллегории, как ещё в Средние века писал Беда Достопочтенный, *«обостряют ум, придают живость выразительным средствам, служат украшению стиля»*.

Пожалуй, одно из самых значительных мест в работах Сустова занимают вариации на тему Вавилонской башни Брейгеля. Например, в Вавилонскую башню встроен тонкий женский профиль с закрытыми глазами в экслибрисе «Одиночество»; в «Пробуждении природы» причудливые фантастические твари копошатся у её подножия, а птица Феникс сидит на вершине; башня приобретает форму груши в «Вавилонской груше», а в экслибрисе «Теорема» на неё нанизаны геометрические треугольники; оттолкнувшись от башни, вверх взмывают крылатые существа («Выше и выше»).

Вспомним библейское предание о строительстве Вавилонской башни, которое закончилось полным крахом: *«На всей земле был один язык и одно наречие. Двинувшись с востока, они нашли в земле Сеннаар равнину и поселились там. И сказали друг другу:*

наделаем кирпичей и обожжём огнём. И стали у них кирпичи вместо камней, а земляная смола вместо извести. И сказали они: построим себе город и башню, высотою до небес, и сделаем себе имя, прежде нежели рассеемся по лицу всей земли. И сошёл Господь посмотреть город и башню, которые строили сыны человеческие. И сказал Господь: вот, один народ, и один у всех язык; и вот что начали они делать, и не отстанут они от того, что задумали делать; сойдём же и смешаем там язык их, так чтобы один не понимал речи другого. И рассеял их Господь оттуда по всей земле; и они перестали строить город [и башню]».

В христианской традиции Вавилонскую башню принято интерпретировать как символ гордыни, своеволия и тщеславия. Разрушив башню и лишив людей возможности понимать друг друга, Бог указал человечеству его рамки. Развиваться и достигать высоких результатов могут только те культуры и цивилизации, которые отвечают Божественному замыслу. Но, как пишет Франц Кафка, мысль построить Вавилонскую башню, *«во всём своём величии явившись однажды, уже не может исчезнуть; пока будут на свете люди, будет и сильное желание достроить башню»*. В притче Кафки строительство всё ещё продолжается, хотя все уже давно поняли его бессмысленность.

Сам Брейгель возвращался к этому сюжету неоднократно — не менее трёх раз. До наших дней сохранились две картины. ««Большая» башня» нагружена большим количеством реалистических деталей и напоминает масштабную стройку своего времени. На зловещую и менее привязанную к конкретным реалиям ««Малую» башню» медленно поднимается церковная процессия. Традиционно отмечают сходство между Вавилонской башней и Колизеем в Риме, который Брейгель имел возможность увидеть, когда путешествовал по Италии. Можно предположить, что художник изобразил таким образом в том числе обрушение величественного здания античной культуры, которой Бог отказал в своей поддержке. В то же время, очевидна и близость Вавилонской башни Брейгеля к так любимой Романом Сустовым готической архитектуре. Как пишут об этом исследователи Роз-Мари и Райнер Хаген: *«Художник, очевидно, был знаком и с конструкцией готических храмов: Вавилонская башня опоясана контрфорсами — поперечными, утончающимися кверху выступами, укрепляющими стены и противодействующими боковому распору»*. Можно сказать, что, вводя мотив Вавилонской башни в свои работы, Роман Сустов вольно или невольно намекает на крушение здания европейской христианской культуры, которое в своё время предрекал Брейгель. Остаётся лишь конструировать из её обломков постмодернистские композиции.

Рассматривая экслибрисы Сустова, ощущаешь себя вовлечённым в своего рода герменевтическое приключение и не можешь отказать себе в удовольствии разрешить загадку: попытаться реконструировать на основе значений отдельных символов смысл произведения в целом. Рискнём предложить интерпретации нескольких его работ. Немного осложняет эту задачу невозможность лично познакомиться с их заказчиками. Ведь зачастую, создавая экслибрис, художник пытается выразить при помощи средств, которыми располагает, индивидуальность заказчика, создать его метафорический портрет. Так, например, в экслибрисах «Вавилонская груша» и «Король Груша» Сустов обыгрывает фамилию *van Peer*. Мельчайшие детали костюма Короля Груши проработаны самым тщательным образом, но вместо головы у него — груша, вдобавок украшенная усами в стиле Сальвадора Дали.

Приглядимся внимательнее к «Основанию» — без сомнения, это одно из самых известных произведений Сустова. Несложно заметить сходство между этим экслибрисом и одним из рисунков Леонардо да Винчи, название которого варьируется: «Профиль воина в шлеме», «Античный воин», «Профиль воина в доспехах и каске». Рисунок сделан Леонардо во время обучения в мастерской Андреа дель Верроккьо. Исследователи отмечают его сходство с портретом римского полководца Сципиона, выполненным в технике барельефа Верроккьо и его учениками. Таким образом, мы находимся в русле определённой традиции изображения людей, покрывших себя военной славой.



Одиночество, 2006 г.



Вавилонская груша, 2007 г.

Воин Верроккьо словно пытается спрятать улыбку. Он молод и прекрасен, как идеальный человек эпохи Возрождения. В рисунке Леонардо, напротив, проявился его неутолимый интерес к лицам, далёким от идеалов красоты того времени. Его воин средних лет, он выглядит несколько обрюзгшим, но пытающимся удержать отблеск былых сражений.

Горбоносый воитель Романа Сустова суров и монументален, пугающе целеустремлён. Его туго обтянутое кожей рельефное лицо сформировано сильной волей и страстной убеждённостью. (Можно предположить, что заострённые очертания этой колючей фигуры показались бы Леонардо, поклоннику мягких линий, слишком резкими и жёсткими). Этого персонажа можно даже принять за женщину, в том случае, если связать образ с именем заказчика – это Теа Винтер (*Thea Winter*). Тем более что подобный образ женщины-воинтельницы обнаруживается в ещё одной работе Сустова — в экслибрисе «Охотники», изображающем союз и одновременно столкновение и противоборство мужчины и женщины как равноценных противников, обладающих «львиным» характером.

Шлем воина, вплетённый в причёску из туго закрученных локонов, представляет собой сложную конструкцию, состоящую из таких элементов, как остов или каркас корабля с античной крылатой фигурой на носу; Вавилонская башня и римский акведук; колёса часового механизма.

Из всех многочисленных символических значений, которыми нагружен образ корабля, нам, пожалуй, наиболее подходит его интерпретация как пространства неопределённости, перехода между жизнью и смертью, между старой и новой жизнью. Корабль плывёт в неизвестность, за пределы Ойкумены. Похоже, что воин Сустова устремлён в неведомое будущее и готов встретить все его превратности лицом к лицу.

Но что это — корабль, плывущий в Новый свет с обломками Вавилонской башни на борту, или Ноев ковчег, который уже пристал к берегу, и строительство Вавилонской башни только началось? (В Библии рассказ о Вавилонском столпотворении следует за родословной народов, расселившихся по земле после Великого Потопа). В любом случае, воину предстоит закладывать *основания* новой эпохи.

Лев, который вслед за Леонардо украшает доспехи воина, имеет множество значений и коннотаций: это и символ Евангелиста Марка, и знак зодиака, и атрибут Африки как части света, и прочее. В нашем случае, лев — это, скорее всего, персонифицированная храбрость, символ царственной власти, мужества и отваги. В «Словаре сюжетов и символов в искусстве» Джеймса Холла можно найти и ещё одно значение, неожиданно перекликающееся с образом Вавилонской башни: *«Лев является атрибутом ... Гордыни, Гнева и холеричного темперамента»*. Может быть, покоряя и обустраивая новые земли, не стоит забывать о том, что гордыня делает человека холодным и жестоким и может помешать строительству?

Пространственное сооружение, представленное в другом, не менее известном экслибрисе Сустова «Одиночество», напоминает одновременно офорт Пиранези «Разводной мост» из серии «Темницы» и недостроенные многоэтажные дома, серые каркасы которых пока ещё обнажены. Создаётся атмосфера отчуждённого пространства, организованного так, чтобы наполнить жизнь человека одиночеством и пустотой. В этом холодном пространстве по своим собственным траекториям движутся планеты, равнодушные ко всему.

Конструкция из Вавилонских башен и «разводных мостов» — это лабиринт, который затрудняет движение и в то же время даёт возможность преобразиться, чтобы войти туда, где хранится сакральное знание, тайна. Рыцарю предстоит преодолеть множество препятствий в его стремлении к смыслу, любви и красоте. Может быть, он не сможет пройти этот путь до конца и никогда не выйдет из лабиринта.

Извечной теме противоборства полов посвящён экслибрис «Власть». Могучий воин обнимает полуобнаженную женщину. Роскошную раму для главных персонажей создают башенки, в окнах которых можно заметить даму, прячущую лицо за веером, и даже индейского вождя.

Охотники, 2008 г.

Экслибрис композиционно связан с картиной Густава Климта «Адам и Ева». Только место беспомощного Адама занимает вооружённый рыцарь из «Бетховенского фриза». Рыцарь, как можно предположить, уже победил Враждебные силы, но до «Оды к радости» всё ещё далеко — сражение всё ещё не окончено. Если объятие в финале «Бетховенского фриза» символизирует спасение мужчины женщиной, то в экслибрисе Сустова скорее речь идёт о противостоянии, в ходе которого усиливают друг друга удовольствие и власть.

Мощная мужская фигура кажется доминирующей, её объём увеличивают сложно сконструированные доспехи. Но именно женщина находится в центре этого произведения и является его подлинной героиней, а рыцарь всего лишь обрамляет женскую фигуру и служит для неё украшением, словно он — это скала, к которой прикована Андромеда. Мужчина выглядит поглощёным своей нежной страстью, кажется, что он полностью захвачен своими чувствами. Покорна ли женщина в этих могучих объятиях? Она явно не пребывает в упоении и сохраняет дистанцию, её лукавый и в чём-то ироничный взгляд устремлён не к мужчине и не к зрителю, она думает о чём-то своём, напоминая роковую женщину эпохи декаданса. Кажется, что у неё всё-таки есть ответ на цветаевский вопрос: *«Так и не знаю: победила ль? Побеждена ль?»*. Экслибрис Сустова



Сила, 2008 г.



Старая сказка, 2009 г.

Ожидание, 2007 г.

Лабиринт, 2010 г.



Падение, 2008 г.

словно иллюстрирует тезис Мишеля Фуко: *«В самом средостении власти ей непрестанно бросают вызов строптивость воли и непреходящий характер свободы»*.

Композицию экслибриса «Падение» образуют такие элементы, как многоэтажное строение и его обитатели; крылатая фигура; персонаж с дудочкой. Сатана здесь низринут с неба — он летит вниз, разбрасывая повсюду свои перья. Но верёвки, закреплённые на строении, оберегают и поддерживают его, не дают окончательно пасть. С другой стороны, верёвки сковывают сатану, не дают ему действовать свободно.

Строение и его обитатели сразу вызывают в памяти картину Брейгеля «Нидерландские пословицы», где художник приводит образцы глупого, безнравственного поведения, бессмысленных человеческих действий. Персонажи, которых мы видим в открытых окнах, занимаются своими делами: на втором этаже лысый мужчина в плаще вроде бы пытается соблазнить прекрасную девицу; на первом этаже в одном из окон двое мужчин листают книгу, в другом окне женственная фигура считает монеты. Персонажи на первом этаже в своей совокупности очень напоминают менял и сборщиков податей, таких, какими они предстают на картинах Маринуса ван Реймерсвале (*«Руки — чтоб гривну взымать с гроша, / Ноги – должок не додан»*).

Справа у подножия башни юноша играет на дудочке – может быть, это Крысолов, герой средневековой легенды, жестоко наказавший немецких бюргеров за скупость

и неспособность держать обещания? В поддержку этой версии говорит и то, что этот экслибрис напоминает картину испанской художницы Ремедиос Варо «Крысолов» (творчество Романа Сустова, как и творчество Варо, можно охарактеризовать как «постсовременную аллегорию»).

Итак, что мы видим здесь — жилище помощников сатаны, которых в скором времени ожидает наказание? Или мирный дом людей, связавших дьявола, чтобы он не мешал им спокойно работать, и флейтиста, услаждающего их слух своей игрой?

В любом случае, какие бы интерпретации экслибрисов Романа Сустова мы не предлагали, очевидно, что их автор остаётся верен завету Леонардо: *«Заботиться о том, чтобы произведение твоё не отталкивало зрителя, как человека, только что вставшего с постели, холодный зимний воздух, а привлекало бы и пленяло душу его, подобно тому как спящего из постели выманивает приятная свежесть летнего утра»*.

VALHALLA RISING КАК МИФ О НОВОМ НАЧАЛЕ

Елена Семеняка

Елена Семеняка — магистр философии,
аспирантка кафедры философии и религиоведения
Национального университета «Києво-Могилянська академія».
Координатор Междисциплинарного исследовательского проекта
«Politosophia» и Украинского традиционалистического клуба.

СІВЕРІЯ

«*Свихнутая и безумная медитация о войне, религии и национальном строительстве»* — эта характеристика, данная в одном из трейлеров к фильму, как нельзя лучше подходит для описания того, что на самом деле происходит в этом воистину медитативном и философском вопреки обещанной «саге о викинге» кинематографическом полотне. Безусловно, это произведение современной киноиндустрии, снятое небезызвестным Николасом Виндингом Рефном (*Nicolas Winding Refn*), который, в придачу к своим режиссёрским заслугам, открыл миру гордость нынешнего датского кинематографа Мэдса Миккельсена (*Mads Mikkelsen*), превосходно сыгравшего главную роль в этом фильме, можно смело рекомендовать к просмотру каждому. В особенности всем интересующимся вопросами традиционализма, мифологии, истории и философии религии, однако не в «исследовательских» целях, а чуть ли не для выяснения сакраментального вопроса личного выбора религиозной веры, так как фильм явно преуспел в демонстрации того, насколько прямо эти вневременные и имперсональные материи касаются жизни современного западного человека, по своей силе и экспрессивной мощи ничем не уступая, скажем, лучшим образцам экзистенциальной прозы.

Однако ещё раз и по порядку о жанре и предполагаемой целевой аудитории киноленты. Бесспорно, все, кто ожидал увидеть типичный и не очень «Viking movie», будут разочарованы, поскольку фильму не хватает свойственных этому жанру элементов «экшна».

